Кобрынская раённая цэнтралізаваная
бібліятэчная сістэма
Цэнтральная раённая бібліятэка
Аддзел абслугоўвання і інфармацыі

# Свой родны край у вершах славім

*Зборнік вершаў і песень*

Кобрын 2019

ББК 84 (4 Беі)6
С 25

***Складальнік:***
*С. Д. Курачук* - галоўны бібліёграф аддзела абслугоўвання і інфармацыі цэнтральнай раённай бібліятэкі ДУК «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

***Камп'ютарны дызайн вокладкі:***
*П. С. Грыневіч* – інжынер-праграміст цэнтральнай раённай бібліятэкі ДУК «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

**Свой родны край у вершах славім** : зборнік вершаў і песень / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. гал. бібліёграф С. Д. Курачук. – Кобрын, 2019. – 224 с. - (Году малой радзімы прысвячаецца).

# ПРАДМОВА

Літаратурна-мастацкае выданне «***Свой родны край у вершах славім»*** падрыхтавана ў рамках Года малой радзімы да Сусветнага дня паэзіі (World Poetry Day).

Словы «родны край», «малая радзіма» вымаўляюцца з асаблівай цеплынёй. Гэта месца, дзе чалавек нарадзіўся, жыў і рос, прайшоў сваё станаўленне. Любоў да родных мясцін жыве ў душы кожнага чалавека. Тэма малой радзімы блізкая ўсім, тым больш паэтам, так ці інакш, у творчасці якіх закранаюцца вытокі, асэнсоўваецца іх лёсавызначальнае значэнне.

Пад адной вокладкай зборніка сабраны думкі і пачуцці людзей, зачараваных Кобрыншчынай. Сярод аўтараў і майстры паэтычнага слова, і маладыя пачынаючыя таленты. Дарэчы, многія з іх з’яўляюцца членамі народнага аматарскага аб`яднання «Белы бусел». Адны - выхадцы з Кобрыншчыны, іншыя ў розныя гады жылі і працавалі на карысць развіцця горада і раёна. Шмат тых, хто прыехаў у наш край, палюбіў яго і для каго ён стаў родным домам. Агульнае, што аб’ядноўвае ўсіх гэтых людзей, - любоў да кобрынскай зямлі.

У вершах - сапраўдныя адрасы малой радзімы, літаратурная геаграфія кобрынскага краю: горад Кобрын, вёскі Балоты, Глінянка, Дзівін, Лепясы, Ляхчыцы, Павіцце, Руховічы, Хабовічы, Хідры і інш. Аўтары разважаюць аб важнасці малой радзімы ў лёсе кожнага чалавека, прызнаюцца ў любові да яе. Яны так шчыра і пяшчотна выказваюць свае пачуцці, гаворачы пра любімы край, што абавязкова захочацца пабываць у ім.

Асобны раздзел зборніка змяшчае творы аўтараў, якія непасрэдна не звязаны з нашым краем, але прысвяцілі яму радкі сваіх вершаў, паэм. Сярод іх прафесійныя літаратары. Як прыклад, Уладзімір Дубоўка (1900-1976), беларускі паэт, празаік, мовазнавец, літаратурны крытык, з захапленнем апісаў непаўторную прывабнасць г. Кобрына ў вершы «На аўтобусным вакзале ў Кобрыне» – *«… прыгожы незвычайна Кобрын»*. Рускі савецкі паэт Анатолій Чапураў (1922-1990) напісаў верш «Кобрин», які прысвяціў беларускаму гораду – захавальніку

часцінкі рускай славы. Для Валянціна Таўлая (1914-1947), беларускага паэта, літаратуразнаўцы, дзеяча нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі, хваляванні сялян на Кобрыншчыне ў 1933 годзе паслужылі матэрыялам для паэмы «Кобрыншчына», якая стала значным словам у беларускай літаратуры. Беларуская паэтэса, празаік, драматург Зінаіда Дудзюк прысвяціла сваю драматычную паэму «Падданыя кахання» трагічнаму каханню князёўны Ганны Кобрынскай і князя Хведара Бельскага, расказала пра палітычную сітуацыю таго часу ў краіне і пра лёсы асобных прадстаўнікоў шляхты.

Зборнік уключае вершы на беларускай, рускай, украінскай мовах, а таксама на мясцовым дыялекце. Вершы адных аўтараў былі апублікаваны толькі на старонках мясцовых газет, іншыя прыйшлі да чытача праз аўтарскія і калектыўныя зборнікі паэзіі.

Тэматычны зборнік мае пяць раздзелаў, матэрыял у якіх размешчаны ў алфавіце прозвішчаў аўтараў. Шмат вершаў здабыла музычнае суправаджэнне, стаўшы песнямі. Некаторыя з іх таксама ўвайшлі ў зборнік – раздзел *«Кобрыншчыне роднай песні прысвячаем»*. Раздзел *«Коратка аб аўтарах»* знаёміць з біяграфіямі паэтаў-землякоў. Пачынаецца зборнік з гімна Кобрынскага раёна.

Выданне мае імянны паказальнік, у які вынесены прозвішчы аўтараў твораў (больш за 60 персаналій). Паказальнік складзены паводле алфавітнага прынцыпу і значна аблягчае пошук неабходнага матэрыялу.

Зборнік вершаў і песень «***Свой родны край у вершах славім»*** адрасаваны ўсім тым, хто жадае пазнаёміцца з творчасцю людзей, якія шчыра і аддана любяць кобрынскі край і жадаюць падзяліцца сваёй любоўю з усімі намі. Спадзяемся на з’яўленне новых твораў, якія абуджаюць удзячнасць і любоў да роднай зямлі.

Выказваем шчырую падзяку за дапамогу ў падрыхтоўцы зборніка кіраўніку народнага аматарскага аб’яднання «Белы бусел» Людміле Лазюк, а таксама супрацоўнікам школы мастацтваў г. Кобрына.



# I. ГІМН КОБРЫНСКАГА РАЁНА

*Словы Ю. Давідзюка, Л. Кірылюк*
*Музыка Ю. Давідзюка*



Край наш радзімы - лугі і палі,
Ціхі куток беларускай зямлі.
Кобрыншчына - ты наш дом,
Светлы, утульны наш дом.

*Прыпеў*:

Кобрыншчына! Радзіма мая!
Беларуская наша зямля!
Слаўся, квітней на радасць людзей,
Дарагая Айчына, мацней!

Буслы ў небе, вёсак агні.
Песня, над родным прасторам ляці.
Шчасця табе на вякі,
Бацькаўскі край дарагі.

*Прыпеў:*

Кобрыншчына! Радзіма мая!
Беларуская наша зямля!
Слаўся, квітней на радасць людзей,
Дарагая Айчына, мацней!

Мірнае сонца над намі свяці.
Пад чыстым небам ты вечна жыві.
Сцягам і гербам тваім
Моцна мы ўсе даражым.

*Прыпеў:*

Кобрыншчына! Радзіма мая!
Беларуская наша зямля!
Слаўся, квітней на радасць людзей,
Дарагая Айчына, мацней!




# II. МАЛАЯ РАДЗІМА – ВЯЛІКАЯ ЛЮБОЎ

## *Вершы землякоў, прысвечаныя Кобрыншчыне*

### Багдановіч Ала

### РОДИНА

У Родины своя особая краса,
И дышится легко среди родных лугов,
В душе там вечный май, там веришь в чудеса,
Чтоб Родину любить, не нужно лишних слов.

Для Родины есть в сердце особый уголок,
Особенную нежность рождает дом родной,
Когда в краю чужом ты, и путь еще далек
К родным полям и рощам стремишься всей душой.

Когда с печалью встретиться придется в трудный час,
Когда осудят люди тебя и не поймут,
К местам своим родным вернёшься ты не раз –
Как верные друзья, они не предадут.

Тропой, знакомой с детства, пройдёшься босиком,
Умчится в край волшебный ожившая душа,
Заметишь, сколько счастья и радости кругом,
И сердце вновь прошепчет, что жизнь так хороша!

## МОЙ КРАЙ

Там мой край, дзе дзве бярозкі
Пад акном шумяць улетку,
Дзе буйныя ў полі росы
Раніцой блішчаць на кветках.

Дзе ласкавы і пяшчотны
У твар цалуе цёплы вецер,
І прыемнаю дрымотай
Сустракае летні вечар.

Там, дзе сонца за ўзгорак
Да світання спаць кладзецца,
І мільёнам ясных зорак
Чараўніца ноч смяецца.

У паветры песні птушак
І мядовы водар ліпы,
Наліўныя спеюць грушы,
І глядзяць рамонкі сціпла.

Гэты край, дзе легкі ветрык
Гоніць хвалі ў моры збожжа,
Будзе вечна жыць, я веру,
А інакш і быць ня можа.

## Балановіч Таццяна

# ЛЕПШЫ НА ЗЯМЛІ

Люблю цябе, мой родны Кобрын!
Заўжды настрой я маю добры.
Ты родны горад, родны кут,
Бо нарадзілася я тут.

Прыгожы, чысты і шчаслівы
І кожным жыхаром любімы.
У табе дабра і шчасця многа,
На ўсёй зямлі няма такога!

## Балахоўская Галіна

# ВЕЧАРЫ Ў ЯРОМІЧАХ

Бываюць вось такія вечары,
Нібыта ўсё звычайнае такое:
Бярозак кроны ўгары
Ды неба з зоркавым настроем.
Глядзіш - не можаш наглядзецца.
Усё зямное - незямное.
І здаравее ў момант сэрца,
Нібы глынуў таго настою,
Што радасць простую прынёс
І шчасце прыабняў за плечы...
І вочы свецяцца ад слёз,
Калі страчаеш такі вечар.
Бываюць вось такія вечары...

## Барысюк Антон

### МАЯ ВЁСКА

Ёсць на зямлі куточак родны,
Маленькі, сэрцу дарагі:
То - мая вёска, дзе прыгожа
Шапочуць бор, лясы, лугі.

Жывуць тут людзі, растуць дзеці,
Усё тут міла для душы.
Няма кутка мілей на свеце,
Як мая веска Ляхчыцы!

У другія краіны не імкнуся
Ад сваіх ніў, лясоў, далін,
Бо я без роднай сваёй вёскі,
Як без матулі роднай сын.

## Барысюк Васілій

***

Паветра маленькай радзімы
напоўніла добрым душу.
Я стомлены покліч гусіны
на смутак сабе церушу.

Бялюткая ўтульная хата
мне ўслед пазірае з тугой,
Бо восень вядзьмаркай мурзатай
нікому не дорыць спакой...

Прыезды. Ад'езды. Самота.
А час не шкадуе бацькоў.
Няхутка надыдзе субота,
калі зноў вярнуся дамоў.

Вярнуся - і неба ўсміхнецца,
калі я прайду пад акном.
Пяшчотным матуліным сэрцам
асветліцца родны мой дом...

## МАЁ ПАЛЕССЕ

Міма стройных, пахучых сасонак
З думкай чыстаю добра ісці,
Бо іду я адной са старонак,
Дзе нашчадкам расці і расці.

Не аднойчы ўспомню міжволі
У цяжкія для сэрца часы
Прыгажосць маладую ў полі,
Святасць новай і чыстай красы.

Дакрануся азёрнае хвалі
І адчую - вада халадзіць…
А зірну я ў вясновыя далі -
Сэрца радасным сумам трымціць!

Не патрэбен тут водар міндалю,
Лепей пахне таполяў галлё.
Узнімае ў душы маёй хвалю
Дух палескіх лясоў і палёў.

## Беразюк Нікіфар

# МОЙ КОБРИН

О, славный Кобрин - древний, молодой,
Ищу слова, чтоб описать тебя.
Величественный и неповторимый,
Я говорю, волнуясь и любя.

По улицам твоим иду и удивляюсь,
Любуюсь на красивые дома.
И чувствую: любовь к тебе большая
В душе моей рождается сама.

У городов есть памятные даты,
Но, Кобрин мой, я о тебе пою.
Приметный год две тысячи девятый
Уже вошёл в историю твою.

Ты стал большой строительной площадкой,
Потребовавшей много средств и сил.
И вижу я открыто, не украдкой,
Как труд людей тебя преобразил.

В наш обиход теперь войдут слова
(Их лишь осмыслишь - кругом голова):
Бассейна гладь, ледовая арена,
Гребной канал, амфитеатра сцена,

И аквапарк, и набережная тоже …
Весь город стал уютнее, моложе.
У кобринчан приветливые лица.
Теперь их город - ярмарки столица.

Праздник «Дожинки» скоро настаёт,
Чтобы отметить урожайный год
И труд крестьянский оценить по праву
Встречает Кобрин с радостью друзей,

А силу чувств, гостеприимства славу
Пусть сохранит Суворовский музей.

## Блахіна Зоя

# МОЙ ГОРОД ВЧЕРА И СЕГОДНЯ

Наш старый парк с аллеями из лип;
Высокими и стройными дубами!
Он столько тайн из прошлого хранит,
Хранит надежно - за семью замками.

Стою у озера, и чудится вдруг мне,
Что где-то рядом шепчутся деревья
О том, что было в давнем далеке,
О прошлом вот таком же вот, весеннем.

Текут беззвучно воды, как тогда,
Когда пришла весна в мой город.
И самая красивая Звезда
Взошла для тех, кто был так молод.

Идут года, наш город не стареет.
Уходят поколенья - жизнь течёт,
И красота его не потускнеет,
И лишь с годами ярче расцветёт.

И я сегодня счастлива безмерно,
Что город мой и молод, и в годах,
И можно позавидовать, наверно,
Что он живет и будет жить в веках!

## Валасюк Лявон

# КОБРИН

Улочка, старое кресло.
Пыльный штакетник,
Трава.
Дом цвета желтого ситца,
Неба висит синева.
Вот заглянул я
В край детства.
Сохнут святые слова.
Память росою на сердце,
Чуть - чуть болит голова.

# МАЛАЯ РОДИНА

Дали
Далёкого детства,
Жёлтые звёзды
И сны.
Как же могла
Мне присниться ты
В тот мой
Веснушчатый век?!
Тронуть рукою,
Как памятью.
Взглядом тепла
Поманить
В миг,
Где запахи мятные,
Радуги, ветры, дожди.
Ты и сейчас
В моей памяти
Весны листаешь теплом.
Голос твой тонкий
Пролиственный

Стелешь мне тонким ковром.
Ты, как звезда путеводная,
Светишь далёким огнём.
В небе глубокой мне памяти,
В небе высоком моём.

## ПАМЯЦЬ

На парозе лядашчым
Хаты роднай маёй
Мне так хочацца лашчыць
Сцены цёплай рукой.
Гладзіць жоўтыя жылы
Дошак тонкіх, сухіх,
Бы далонь не аджылай,
Дарагой мне рукі.
Па далоні чытаю:
То мазоль, то асцё...
Памяць не памірае
З прамінулым жыццём.

## МАЕ СНЫ

Мне сняцца росы лугавыя
У промнях чыстае расы,
Нібы абрусы залатыя
Гарачай летняе пары.
Мне маці сніцца. Яе голас.
Блакітны позірк, ціхі крок.
Мне сніцца
Цяжкі жніўні колас
І сіні цёплы васілёк.
Мне сніцца кут мой
Родны, блізкі…
Малітвы бабкі з родных слоў…
Плывуць аблокі, як калыскі,
Маіх з маленства
Светлых сноў…

## РАДЗІМА

Дзве побач вёскі:
Песцянікі, Глінянкі,
З боку Ластаўкі,
Стаўпы і Мацясы…
…Сваволіць бэз,
Цвіце. Як калыханкі,
Гучаць, не моўкнуць
Родных галасы…

## ГЛІНЯНКА

Вёска Глінянка,
Як бусла буслянка,
Штогод чакае
Дагэтуль мяне...
Ды крылаў не маю.

## КОБРЫНСКАЕ ЛЕТА

Лета бабіна ў Кобрын.
Прыляцела зранку...
Не паспеў вады напіцца
Я на родным ганку.

Пырснула ў вочы
З сонечнай крыніцы,
Збегла з цёмнай ночы
Да маёй сталіцы.

Белым павуціннем
Заплялося ў косы,
Залацістым сэрцам
Заблішчэла ў росах.

Ад цяпла такога
Птушкі шчабяталі.
Яблыні за плотам
Кветам трапяталі.

Успамін пра лета...
Мілы ўспамін
З сонечных праменняў
На радках хвілін.

## МАЯ РАДЗІМА

Сіні лес
На даляглядзе
За палямі...
Балоты ў пыле,
Густы бэз...
З агароду
Апошні дзед
Нясе вядро
З камянямі...

***

Пад небам верасня
Мой Кобрын
Шпурляе лісце
Насустрач мне,
Бабулі, дзеду,
Братам і сёстрам...
І анёлам -
Вартаўнікам
Дамоў, дарог
І нашых думак...

***

Радзімаю
Ніколі не стамлюся...
Вадой крынічнай
Прагна наталюся.
У родны край
Не раз яшчэ вярнуся
Самотным надвячоркам
Беларусі...

***

Увечары прыехаў я
У родны двор...
Травой высокай, вішняком
Пазарасталі цені пабудоў,
Паваленага плота...
І крыкі ластавак
Напаміналі хор
Дзіцячых галасоў...
А на дзвярах
Вісеў засоў
З іржавымі цвікамі.
Павевы ветрыку
Здаваліся
Халоднымі рукамі
Бабулі, дзеда
І бацькоў...

***

Малая радзіма -
Бусел у гняздзе.
Калодзеж ля дома,
Ліхтар на слупе...

***

Пах радзімы -
Сарамлівай
Ссохлай кветкай пад нагой...

***

Гукі любай радзімы.
Водар ціхага саду.
Раптам у сне каляровым
Я ля дзеда прысяду…

***

Над роднай зямлёю,
Над маёю радзімай
Час спыніўся…
Стаяць туманы…

***

Старыя шыбіны
Пад пылам.
Аббіты абцасам
Бацькоўскі парог...
Да болю любімы
Кут родны,
Кут мілы.
Забінтаваны
Палоскай дарог..

***

Плывуць аблокі,
Ляцяць думкі
Да вясны,
Да радзімы…
Твае чую крокі…

***

Жыўлюся роднаю зямлёй,
Блакітам вышыні гаюся.
Малюся мове матчынай
Святой
І гонару людскому
Не дзіўлюся.

***

Родился я
В краю берёз и сосен.
Весёлый май
Плеснул мне зеленью
В глаза.

## Галаванава Наталля

# ЛЮБОВЬ К РОДИНЕ

Люблю тебя, мой край родимый, люблю тебя, как никогда!
Люблю я реки голубые и золотые берега!
Люблю широкие просторы, люблю цветочные поля,
Люблю я солнечный восход и песню родника.

Люблю я пенье петухов на утренней заре,
Люблю полёты облаков в манящей синеве.
Люблю березовые рощи и птичий гомон в них,
Люблю я слушать шелест листьев, дыханье затаив.

Люблю я белые туманы и на лугах стога,
Люблю мигающие звезды. А вот встает луна,
Таинственно сияет и ласково глядит,
Серебряной дорожкой к себе зовет, манит.

А аромат стоит - не сыщешь нигде в другом краю,
Не поменяю ни за что я Родину свою!

# КОБРИН

Чем больше Кобрин узнаю, все больше удивляет!
Он биографию свою достойно продолжает.
Начал жизненный он путь в средние века,
Молодой же до сих пор, лишь поседел слегка!

Город много пережил, войны повидал,
Свое имя сохранил! Мир глубоко познал.
На посту он семь веков, семь веков на страже!
Друзей всегда встречать готов, непрошеных накажет!

Так стоит он на чеку, всегда во всеоружии!
Не сломить его врагу, границы кто нарушили.
Кобрин - лакомый кусок! Привлекал их взгляд,
Думали, что марш-бросок - и будет город взят!

Много было, кто хотел его к рукам прибрать,
Но городок не оробел, пришлось назад бежать!
Приехали в седле, с осанкой героической,
Но оказались на земле, притом, на исторической!

С миром кто сюда идет, хлебом-солью встретит,
Недруг меч если несёт, мечом ему ответит!
Им досталось всем сполна, будут долго знать,
Что чужая сторона разобьет их рать!

Кобрин хоть и небольшой, по духу богатырь!
С каждым годом он растет: и ввысь растет, и вширь!
Он красивый городок! Мудрый, очень скромный!
Как настоящие герои, и он немногословный!

Для разгвора темы есть! На свете долго жил,
Сохранил не только честь, но и рубежи!
Кобрин всем открыл объятья, никаких преград!
Кто с добром к нему, как братья, тем он очень рад!

# ПОСВЯЩАЕТСЯ КОБРИНУ

Кобрин - город дорогой!
Я очарована тобой,
Тебя всем сердцем обожаю,
Чем дальше, больше уважаю,

Страданий много пережил,
Но честь свою не уронил!
Ты показал себя в веках,
Захватчикам пришел здесь крах.

Наполеону дал отпор,
Бежал назад, как подлый вор.
Кутузов наш серьезный малый
Урок им дал не ради славы.

Враги пусть знают наперёд:
Не хлебом-солью город ждет!
Пусть чванливые французы
Поберегут свои рейтузы!

Сказали им: «Месье, пардон!»
Погнали армию их вон.
Проходит век и 30 лет –
Другой не сделал вывод, нет!

На танках фриц сюда попёр,
Сверкал на бляхах их орел.
Тяжелые врагов ботинки
Топтали Кобрина тропинки.

Много горя причинили,
Но его волю не сломили!
Город сильно пострадал.
Что устоит, он точно знал!

Под фашистом сотни дней,
Нет их в истории черней!
Жгли, стреляли - всё пылало,
А, казалось, всё им мало!

Десятки тысяч человек
Не закончили свой век!
На жизнь чужую наплевать,
Пришли весь Мир завоевать!

Но настает всему конец
И получил пинок подлец.
Кобрин - милый городок,
Спокойный светлый уголок!

Он весь в цветах благоухает
И о будущем мечтает.

## ЗДРАВСТВУЙ, КОБРИН!

Здравствуй, милый город Кобрин! Здравствуй, дорогой!
Наконец к тебе вернулась и снова я с тобой!
Я по тебе скучала очень! Меня ты покорил!
В золотую эту осень ты сердце мне разбил!

Пока гостила две недели, ты мне стал родной,
И вот на крыльях прилетела, прими меня, друг мой!
До отъезда дни считала, как медленно ползли!
Но что приеду, точно знала, и вот всё позади!

Добрый Кобрин, ты красив! Каштаны, тополя,
Рукотворные пруды, цветочные поля...
Домики уютные лозою обвиты,
Дворики ухожены - глаз не отвести.

Широкие здесь улицы, у домов сады,
Хозяева то умницы! Кругом цветы, цветы!
Дороги очень гладкие, в срок ремонт ведётся,
Если что-то вдруг не так, плохой не остается.

Церкви белоснежные - громада куполов,
Сердце замирает под звон колоколов!
Старый парк очаровал осенней тишиной,
Листья жёлтые срывал ветерок шальной...

Есть сказочное озеро, красивое оно!
А лебеди плывущие - пиши хоть полотно!
Вода прозрачна, как хрусталь, а глубина большая!
По дну стелется трава, пейзаж сей завершая!

Таинственные ивы у берега стоят,
Грустно и загадочно листвою шелестят,
Отражаются в воде ветки изумрудные...
В этой строгой тишине становимся мы мудрыми!

А город облик свой меняет, с каждым днем растёт!
Хорошеет, расцветает и будущим живет!
Но главное здесь - люди! Чудеснейший народ!
Добры и внимательны, на зов любой придет!

Простые очень люди! Кассиры, продавцы,
Служащие, медики, все-все вы молодцы!

## ВЕСНА В КОБРИНЕ

Весна пришла в наш добрый Кобрин,
Кругом белым-бело!
Воздух ароматом сдобрен,
Всё мигом расцвело.

Изумрудная листва с ветерком играет,
С нежным, теплым, а то вдруг резко затихает.
Поглядишь, его здесь нет, по травке шелестит,
Не оставит даже след, скорей вперёд летит.

Запах чудный от дымка приятно-горьковатый,
Струится, видимый слегка, чуть голубоватый.
Наводят люди чистоту, сжигают листья старые,
А во дворах цветут ковром тюльпаны ярко алые!

Весна пришла в наш добрый Кобрин,
Кругом белым-бело!
Воздух ароматом сдобрен,
Все мигом расцвело.

## Галаванаў Пётр

### ПРИЗНАНИЕ...

Побывав на Брестчине тем летом,
Почувствовал я вдруг, что этот край родной.
Всё вокруг меня сияло дивным светом,
И душа кричала: я нашла его, он мой.

Ивы у пруда, как будто в сказке, листьями шептались
О суете житья и вечности души,
Два белоснежных лебедя у берега плескались,
Творя извечный гимн любви в тиши.

И, как в детстве, мне хотелось плакать и смеяться,
Полежать в траве, испить колодезной воды,
На красавцев аистов, шагающих в полях, полюбоваться,
Собирать в садах созревшие плоды.

Сидя у воды под сенью ив плакучих,
Глядя в небеса, где звезд не счесть,
Радовался я, что, кроме родины Сибирской и могучей,
Вторая родина прекраснейшая есть.

## Ганько Генадзій

# СЕГОДНЯ В ГРАФСКОМ ПАРКЕ СТАРОМ

*Кобринскому парку им. А. В. Суворова*
*посвящается*

Наш парк - тенистый круг аллей,
Поляна сказок для детей,
Фонтан, и музыкальный клуб,
И острова цветочных клумб,

Качелей ряд, плодовый сад,
Лебяжий пруд...
Когда-то тут Великий русский генерал
Граф Александр Суворов

В своей усадьбе отдыхал
От светских разговоров.
Сейчас заполнен круг аллей
Большим количеством гостей.

Сегодня в графском парке старом
Соединяются сердца.
Сюда спешит любая пара,
Надев на пальцы два кольца.

Сюда заходит посетитель,
Чтоб снять уныние с души.
Сюда приходит и учитель,
И недотёпы-малыши.

Сегодня в графском парке старом
Звучат без устали гитары.
Тут место встречи для друзей,
Тут всюду звонкий смех детей.

## Глушко Леанід

# КВІТНЕЙ ТЫ, КОБРЫНШЧЫНА НАША!

Над Кобрынам неба высокае
І сонечны ўвесь далягляд.
І сёння мы бачым далёкае –
Больш сямісот гадоў назад.

Квітней ты, Кобрыншчына наша
І горад Кобрын наш, квітней!
Хай сонца свеціць у вокны вашы
І душы стануць шчэ дабрэй.

Бяды нямала зведаў, гора
Ты, Кобрын родны, дарагі.
Цяпер ідзеш удаль прасторам,
Сцяжынкай, выйшаўшай з смугі.

Глядзішся ў Мухавец, і бачыш,
Бы ў люстры часу, новы дзень,
Тут кожны раз ты адзначаеш
Усмешкі шчырыя людзей.

Пашана й слава людзям працы
І змагарам за светлы дзень!
Хай Беларусь, як наша маці,
З вясною кожнаю цвіце.

Вякі жывіце ў міры, людзі.
Буслы хай вьюць сваё гняздо.
Хай напаўняе радасць грудзі,
Прыходзіць шчасце ў кожны дом.

Квітней ты, Кобрыншчына наша
І горад Кобрын наш, квітней!
Хай сонца свеціць у вокны вашы
І душы стануць шчэ дабрэй!

# НАШ ГОРАД

Мяне паклікаў Кобрын да сябе,
Мне назаўжды стаў родным горад гэты.
І вось цяпер я думаю сабе:
У чым ён мае еднасці сакрэты?

Як быццам бы наш Кобрын, як усе -
Такі прыгожы, звеку працавіты.
Натхнёнасці ён прыклад падае,
І сонцам узыходзячым заліты.

Будуецца, расце, шчэ прыгажэе,
Каштаны, ліпы, кветкі, знай, цвітуць.
Як бачна, на вачах ён маладзее,
А як над рэчкай Мухаўцам пяюць!

Хоць за семсот гадоў яму жывецца,
А ні адной маршчынкі не відаць.
Хоць і нялёгка ўсё жыццё даецца,
Ды мэта ў яго - перамагаць!

У скверах, парку люд адпачывае,
Музейны Дом Суворава жыве.
Далёкіх й блізкіх ён гасцей страчае,
Усім руку дружбы Кобрын падае.

Дзятва малая ўсюды весяліцца,
Малечы лёс шчаслівым стаў даўно...
І цішынёй хачу я прычасціцца,
Адкрыўшы ў лета раніцай акно.

Бяжыць шаша да Брэста і да Мінска,
А хочаш, ты чыгункаю паедзь.
І падыходзіць лес духмяны блізка,
Так што ў хаце сёння не ўсядзець.

І, выйшаўшы на вуліцу, з парога
Паклон свой нізкі Кобрыну даю.
У яго шчаслівая дарога,
Сваю я песню Кобрыну пяю.

Над абсягам сонечным ад Бога
Робіць бусел лёгкія кругі…
Няхай у новы век твая дарога
Вядзе па шчасці, Кобрын дарагі!

## МОЙ ГОРАД

Стаў горад родным, дарагім -
Мясцін я іншых не ўяўляю!
Я прыгажэць яму жадаю
І быць вякамі маладым.

Дні працы тут прайшлі мае.
Прыносяць дзеду ўнукі радасць.
І не страшыць мяне тут старасць,
Мне горад мужнасці дае.

І крочу я такі шчаслівы
З паклонам гораду і людзям!
Хай толькі мір на свеце будзе,
Хай кожны будзе з нас зычлівым.

## РАДЗІМА

Няма радзімы без сяброў,
Без светлага кахання,
Як немаўлятаў - без буслоў,
Як сонца - без світання.

Няма радзімы без вясны,
Як без пасаджанай рабінкі.
Мая любоў - мой край лясны!
Як гэта неба без хмурынкі.

І твой блакіт, валошкі сінь,
Бо вочы матчыны струменяць!..
Радзіма, я твой крэўны сын,
Цябе замежжы не заменяць.

## МАЛІТВА

Душа малітвай спачывае,
Малюся Богу за людзей:
Хай кожны моц і шчасце мае
І каб жылося весялей.

За край малюся родны, людзі,
Каб ён бяды не ведаў век!
Хай кожны дзень заранка будзіць
І наш дзіцячы звонкі смех.

Каб мова родная гучала
На нашай сонечнай зямлі
І каб зямля заўжды спявала,
І каб на ёй сады цвілі.

Душа малітвай спачывае,
Кладуся спаць, ці ўстаю –
Малітва душу напаўняе
Гаючым водарам маю.

Жыву. Пяю. Складаю вершы
І справу хатнюю вяду.
Бяду нялёгкую сцярпеўшы,
Далей наперад я іду.

Малітву Божую чытаю…

# СВЯТАЯ ЗЯМЛЯ

Я хачу да роднай зямлі прытуліцца
І слухаць дыханне яе, сэрца стук.
Напіцца гаючай вадзіцы з крыніцы
І роднае мовы пачуць кожны гук.

І зліцца з напевам калосся ў полі,
З песняй дубровы і белых бяроз,
Паслухаць гамонку вярбы і таполі,
Правесці на лузе духмяны пакос.

Паслухаць апоўдні жаўранкаў песню,
Калі лён блакітам у полі цвіце.
Як песні гучаць над любімым Палессем,
Як радасць сыходзіць працоўных людзей.

І хочацца мне заспяваць на прыволлі
Матчыну песню аб роднай зямлі.
Жадаю не знацца з бядою ніколі,
Каб людзі ў шчасці і згодзе жылі.

Хачу я да роднай зямлі прытуліцца,
Нібы да маці ласкавай сваёй,
І слухаць, як дыхае наша зямліца...
Заўжды называем яе мы святой.

# ГОРАД РОДНЫ КОБРЫН

Будзе мір. Будзе сонца. І песні
Разляцяцца над роднай зямлёй.
Ты квітней, горад Кобрын любімы,
З кожным годам і з кожнай вясной!

Хай твае працавітыя людзі
У поўным шчасці і дружбе жывуць,
Не старэй, горад родны, красуйся!
Маладым вечна, Кобрын наш, будзь!

## ВЕЧАРОВАЯ КАЗКА

Россып зорак над Кобрынам яркі,
Сярод іх месяц-човен плыве.
Выплыў ён нечакана з-за хмаркі,
Кінуў золатам тут на мяне.

І па Мухаўцы золатам сее,
Уплятае ў хвалі ракі
Пазалоту, й на кветкі лілеі,
І на Кобрын наш родны такі!

І так казачна стала навокал!
Я цябе ў казку гэту вяду.
Паплывем у чаўне мы далёка,
І я песню яшчэ падвяду.

Я рукою вады дакрануўся,
Хацеў зорачку з рэчкі падняць.
Цёпла, светла табе я ўсміхнуся,
Але ж зоркі з ракі не дастаць.

Замест зоркі ўзялася лілея,
Я табе падарыў ад душы,
Дарагая мая ты - німфея!
Пацалункам свой жэст завяршыў.

## РОДНЫЯ КАРАНІ

Буслы над Кобрынам кружылі
Віталі новы дзень вясны...
Там родны кут ім сніўся часта,
Дзе зімаваліся яны.

За сінім морам тым далёкім,
Дзе маецца свая краса.
Але ж у краі беларускім
Шчэ й прыгажэйшая зямля!

Тут першы крок яны зрабілі
Над сінім Мухаўцам у дзень.
І краю любага за гэты
Няма ім болей анідзе.

## КОБРЫНУ

Які над Кобрынам блакіт!
І сонца ў Мухавец глядзіцца.
І хочацца тут, ля бяроз і ракіт
Гаючай вадою з ракі прычасціцца.

І Кобрыну нізкі паклон наш аддаць
Гораду роднаму, любаму з веку.
І вызваліцелю дзякуй сказаць,
Герою вайны, чалавеку.

Зведаў нямала наш горад бяды.
Нам помнік у скверы раскажа,
Як вораг ірваўся зграяй сюды,
Мы ведалі - Бог ліхадзеяў накажа.

Горад свабодным наш стаў на вякі,
Расце ён ушыр і яшчэ маладзее.
Плывуць па рацэ ў свята кветкі-вянкі,
Жывем мы шчасліва, у сэрцы з надзеяй.

Табе, горад Кобрын, жыць, не старэць!
Заўсёды квітней, багацей, весяліся.
Каб зорцы тваёй яшчэ больш палымнець,
Каб песні над горадам вечна ліліся.

# КОБРЫНСКІ ВАЛЬС

Золатам ззяюць Мухаўца хвалі,
Месяц у танец усе зоркі сабраў.
Пойдзем і мы ў гэты танец цудоўны,
Кобрынскі вальс наш аркестр заіграў.

Музыка льецца над Кобрынам родным,
Песня ляціць і ляціць удалячынь.
Танцуе ў парку суворaўскім горад
Кобрынскі вальс уначы.

Слаўна жывуць тут працоўныя людзі,
Шчасцем спавіты ўсе.
Людзі танцуюць танец любімы –
Кобрынскі вальс у красе.

І кружыліся мы, дарагая, з табою.
Даўно маладосць адцвіла.
Музыка вальса сёння нас зноўку
У маладосць прывяла.

Кобрынскі вальс, родны вальс, дарагая,
Ніколі не згасне ў душы.
Кобрынскі вальс гэтай дзіўнаю ноччу
Да зорак шчаслівых кружыў.

# НАД КОБРЫНАМ НЕБА ВЫСОКАЕ

Над Кобрынам неба высокае,
Сонцам квітнее даляглад.
І бачыць у задуме далёкае
У скверы савецкі салдат.

Прайшоў ён з баямі на фронце,
Да логава фрыцаў дайшоў.
Быў Кобрын заўсёды ў сэрцы,
Зямля беларускіх дубоў.

Зямля, дзе прайшоў сам Сувораў,
І шведаў разбіў ў той час…
У лепшае воін наш верыў,
Агонь у душы не пагас.

З вайны з перамогай вярнуўся,
І Кобрын у шчасці зажыў,
Сонцам дзень новы ўсміхнуўся,
І бусел у небе кружыў.

Жыве горад Кобрын у сонцы,
І людзі да воіна ідуць,
Кветкі цвятуць тут бясконца,
Ідуць, каб сыноў памянуць.

Каб пакланіцца героям,
Што ў баях паляглі,
За нашае шчасце і волю,
Каб у міры мы сёння жылі.

## НАШ КОБРИН

На свеце есть миллионы городов,
Но ты наш Кобрин, ближе нам, роднее.
Ты с каждым днём становишься ещё
Моложе, богаче, красивее.

Славься, наш Кобрин родной и любимый!
Ты краше с весною веками цвети.
Восьмое столетье идёшь неустанно
К высоким вершинам по славному пути.

Преград немало было, бед и горя,
Всё превозмог, и победил врагов.
И Мухавец плещется синей волною
Под сенью зелёных цветных берегов.

Ты славен людьми и Суворовским парком,
Имя Суворова знает весь мир.
Дорогу для дружбы с народами света
Музей полководца навеки открыл.

Гордо вперёд ты идёшь в своё завтра,
Подняв с Божьей матерью герб высоко.
И гимн твой звучит широко над простором,
И дышится нам глубоко и легко.

Славься, наш Кобрин родной и любимый!
Ты краше с весною веками цвети.
Восьмое столетье идёшь неустанно
К высоким вершинам по славному пути.

## ПЕСНЯ «ДАЖЫНАК»

На крылах песня з Кобрына ляціць:
Пяюць «Дажынкі» - хлебаробаў свята.
А з песняй нам прыгожа, людзі, жыць.
І з ёю, праўда, багацее хата.

Як з хлебам божым багацеем мы.
Яму вялікасць назаўжды прыносім,
Працуючы з любоўю на зямлі
Вясною, летам, на палях увосень.

«Дажынкі» сёння ў Кобрыне пяюць.
Гасцей прымае горад наш любімы.
Героі ніў па вуліцах ідуць -
Хвала і гонар нашае Радзімы.

Узнёсласць свята бачыцца ва ўсім,
Зямной любоўю напаўняе сэрца.
І свята хлеба, быццам поля гімн,
Яшчэ не раз нам песняй адзавецца.

# ПАСЛЯ «ДАЖЫНАК»

Заспяваем песню звонка
І паднімем каравай.
Ты спявай-спявай, старонка,
Песні радасці спявай!

Хай народ наш весяліцца,
Родны Кобрын дарагі!
Люба глянуць, падзівіцца
На жытнёвыя палі.

Урадзіла жыта ў полі.
Будзем з хлебам цэлы год!
Дачакаўся светлай долі
Беларускі наш народ.

І «Дажынкі» мы святкуем.
Свята шырыцца, пяе.
Хлебароба мы віншуем,
У дружбе з працай ён жыве.

Звонкай песняй і з сябрамі,
Што наш Кобрын запрасіў.
І над Кобрынам, над намі
Белы бусел закружыў.

Заспяваем песню звонка
І падымем каравай.
Ты спявай-спявай, старонка,
Беларускі родны край!

# АЛЕЯ ПАМЯЦІ

Алея Славы белая бяроз,
Сцішае крок тут кожны кабрынчанін.
Зіхцяць тут вочы нашыя да слёз,
Як лісцікі бяроз ад рос уранні.

Алея стала памяццю жывых
Для ўсіх, хто йшоў ваеннаю дарогай.
І для сыноў - герояў дарагіх,
Якія ўпалі з словам «Перамога!»

І тым, хто горад Кобрын вызваляў,
Біў ворага адважна, пераможна,
Хто пад рэйхстагам раніцай упаў.
А жыць было шчэ б доўга-доўга можна...

Бярозак чуем ціхі шэпт заўжды.
Свае галовы нізка мы скланяем...
Ідуць, як памяць вечная, гады.
І горад наш цвіце квяцістым маем.

***

Край задуменнай бярозы, каліны,
Край срэбразвонных крыніц і азёр.
Край, дзе такая сустрэне дзяўчына,
Што загарышся, бы летні касцёр.

Тут мова матулі гучыць дзіўнай песняй,
І студня тут дорыць гаючы глыток.
У сэрцах любоў нараджае Палессе,
У ім - майго шчасця працяг і выток.

## Дзехцярук Уладзімір

# КРЫНІЦЫ

- Адкуль выцякаюць крыніцы?
- Яны выцякаюць з зямлі,
Сабраўшы пасля навальніцы
Той дождж, што ўпаў на палі,

Той снег, што растаў напрадвесні,
І летнюю тую расу,
Што чула дзявочыя песні
І вострую знала касу!

- Адкуль выцякаюць крыніцы?
- Магчыма, з тых кніжак тваіх,
Што некалі браў ты з паліцы,
Штораз штось знаходзячы ў іх.

Ад літары першай - да слова,
Ад сказа - да думак пра лёс.
Вяла цябе родная мова,
Якую з сабою ты нёс!

А лёс быў даволі складаны
- Узносіў і кідаў зноў ніц,
Гаіліся розныя раны
Струменямі родных крыніц.

Хапала і шчасця, і гора
У тых днях, што кудысьці плылі,
На беразе Балцкага мора
Я марыў аб роднай зямлі.

Было непазбежным вяртанне
У аднойчы пакінуты двор,
У той край, дзе заўсёды каханне
Узнімаецца сэрцам да зор,

Дзе ў вёсках жывуць чараўніцы,
Як вуллі гудуць кірмашы...
- Адкуль выцякаюць крыніцы?
- Яны выцякаюць з душы!

***

Дэ жывецца ліпш на світэ?
Як пітатэ доўга, дэ?
То, дасыць біг і до Повітэ
Вас дорога доведэ.
Тут усі, старэ і дітэ
Скажуць так вам про село:
«Ныма ліпш, як у Повітэ,
Ныма ліпш і ны було».

## ВЯРТАНЬНЕ

Развітаньне...- звычайная справа!
Шмат разоў я ўжо зьведваў яе,
Але...смачная матчына страва
Штосьці комам у горле стае.

За дзьвярыма бацькоўскае хаты
Зноў кажу сваёй шчырай радні:
- Не крыўдуйце, мо ў чым вінаваты?..
Трэба ехаць...Канчаюцца дні...

Пацалункі, апошнія словы,
Гул аўтобусны, Кобрын ды Брэст,
Цягніка перастук адмысловы,
Пецярбургскага вершніка жэст...

Я жыцьцё сваё зноў пражываю,
(Хто памылак у ім не рабіў!),
Кожным крокам сябе адрываю
Ад таго, што пакінуў, згубіў...

І ахвота спыніць тыя крокі,
Каб душа не танула ў журбе,
Бо вяртаньне маё, як уцёкі
Ад сяброў, ад самога сябе.

Не спыніцца.Мне ўжо не спыніцца!
Зноў закруціцца дзён карагод,
Будзе зноў мая вёска мне сьніцца
Кожнай ноччу бязьлітасны год...

Напаўняецца сэрца пустэчай...
Шлях праз мост і кантроль на мяжы...
Пасьля летняй з радзімай сустрэчы,
Я вяртаюся ў горад чужы.

## Дрык Ніна

### РОДНАМУ ГОРАДУ

*Кобрыну*

Ля ціхай плыні Мухаўца,
Сярод лугоў імшыстых,
Дзе князь – валынскі ўладар –
Драўляны замак збудаваў,
Мой светлы горад заснаваны,
І лёс яму наканаваны
Быць сведкам даўніх тых падзей.
Гандлёвы шлях на Пінск і Кракаў
Тут шмат стагоддзяў існаваў.
Не раз Хмяльніцкі з грознай сілай
Лясы і пушчы абуджаў.
І шведы Густафа Адольфа
Разграбілі, спалілі жорстка.
Ды Кобрын жыў і ваяваў.
Сувораў славаю сваёй
Ключ Кобрынскі авеяў.
Паклаў шляхецкім вольнасцям канец

І шабельным завеям.

***

Плошча Леніна, парк Суворава –
Светласць дня і ў мінулае шлях.
Колькі раз ралля суровая
Бударажыла горад наш.
Зямля сівела ад людскога гора,
Крывею ўмывалася трава –
Да гэтых дзён хавае тайну мужнасці,
Майго горада, майго сяла.
Дымілі нівы, сцятыя пажарам.
Увесь белы свет набатам абляцелі
Званы Хатыні. Сэрца ў жалобе стыне.
А вораг задушыць цябе хацеў.
Не тою меркай вораг нас памераў,
Карэннямі ў полі прарасталі
І гінулі за веру, мір, спакой.

***

Узмах, яшчэ ўзмах.
Крылы мацнеюць толькі ў палёце.
Неўтаймавана радасць на вачах,
Выпрабаванне будзе пры адлёце.
Пад родным небам і ляцець лягчэй,
Яно само ў вышыні трымае,
Цяжэй тады, калі чужы пясок:
Што крок, то болей сілы аднімае.
У родным краі не вада - жывіца,
З глытком смачней, баішся не абпіцца,
А там, куды кіруе журавоў важак,
Ім ноччу сніцца сонейка пагляд.

***

Колькі дарог -
Столькі трывог
Ад світальнай зары

Да змяркання...
Сэрца, скажы мне,
Дзе твой парог,
Бераг твайго вяртання?
Бацькава хата.
Сонечны плёс.
Добрыя словы вітання.
Аднавяскоўцы -
Суд твой і лес,
Вечная песня вяртання.

***

Вёска, вяснянка. Красачка,
Любая старана.
Я ў думках сюды вяртаюся
Раніцай кожнага дня.

Вядуць варажбіткі-вуліцы
У мроі кляновых завей,
Цешыцца сэрца, лагодзіцца
Ад мудрых тваіх вачэй.

Бачу прысады школьныя,
Збочу, не абміну.
Змаглася ад горада шумнага,
Мне хочацца тут адпачыць.

Маладосць... маладзік шчарбаты,
Зацугляныя зоркі вядзе.
А работы - край непачаты,
Ногі тонуць у бухматай расе.

Прыпынюся ля кожнай хаты.
Нізкі ў пояс паклон аддам.
Чым багаты - тым і рады,
На паркане малочны збан.

Ставер ціха рыпіць, ушчувае:
Падаліся ў горад усе,
Толькі знайце: жыццё вяртае
Усё на кругі свае.

Я вярнулася і прыпала
Да гаючай тваёй вады.
Многа ў лёсе сваім паспытала,
Не пазбавілася і бяды.

Доўга трызніла, сумавала
Па лясах тваіх і барах.
Камянёў за душой не схавала:
Як на споведзі, у нагах.

Прычасці мяне чабарамі,
Пахам верасу і смалы.
Ахіні маю душу шатрамі
Ад пачварнасці, зла і маны.

Уратуй усіх людзей ад блуду,
Дай прытулак усім вятрам.
Не баюся твайго прысуду,
Раскрыжована сэрца любоўю папалам.

***

Добра спіцца ў бацькоўскай хаце,
Смокча ранак цёплую расу.
І гарласты певень «кукарэкам»
Будзіць вёску родную маю.
Паданкі пад яблыняй збіраю,
Сок салодкі па губах цячэ.
Бацька ў кашулі вышыванай
Коніка на вадапой вядзе...

***

З зоркай рана ў двары завіхаешся,
Ногі босыя тонуць у расе.
Балацяначка, Балацяначка,
Косы звіты на галаве.

Закалыханы цяжкай працаю.
Гумны спяць і маўчаць двары.
У дзень нядзелькавы, ясны, сонечны,
Сняцца вёсцы чароўныя сны.

Еду я сюды і спяшаюся,
Каб напіцца са студні вады,
Той гаючае і халоднае,
Што ўсіх беражэ ад бяды.

За прысадамі ў ціхай засені,
Дзе самотна маўчаць крыжы,
Пачынаецца шлях завоблачны,
Шлях яднання зямлі і душы.

Расцвітаюць сады ў квецені,
Працай рупнай жыве чалавек.
Балацяначкі, Балацяначкі
Славяць песняй шчаслівыя дні.

***

Сніцца вёска мая сцішэлая
Пры дарозе ў сутонні ліп.
Сняцца часта сады пенна-белыя.
Чую ветру самотнага ўсхліп.

На балоце там жоўтыя лотаці...
Там аблокі бягуць, бягуць...
Гнуткіх лоз хударлявыя постаці
Луг рамонкавы сцерагуць.

Зоры ткуць ручнікі над хатамі,
Туманы над зямлёй плывуць.
Вербы-шаферкі з грушай-свахаю
Вішню з клёнам да шлюбу вядуць.

## Жарын Вера

### ДЕРЕВНЯ МОЯ

Деревня моя, ты родная земля,
Это хлебные нивы, леса и поля -
Все то, с чем мы с детства срослися душой,
Все то, что живет и с тобой и со мной.

Весною и летом ни свет ни заря
С петухами встает вся деревня моя.
С рассветом в поле и старший, и мал,
Работают дружно, чтоб хлеб слаще стал.

А хлебная нива звенит и поёт,
Как в песне душевной, где нежность живет.
Поёт она песню о вечной любви
Человеческих рук и бесценной земли.

«С душой вы работайте, - шепчет земля, -
Вам будет богатой отдача моя,
Урожаем обильным тогда отплачу
За богатым столом я вас всех навещу».

Мы скажем всем миром: спасибо, земля,
Ведь хлебную ниву ты нам родила.
Крестьянские руки, вам низкий поклон
За хлеб ваш душистый. Нам жизнь дает он.

# ЛЯХЧЫЦЫ

Ляхчыцы - веска малая зусім,
Я нарадзілася там і расла.
Двароў, можа, 70 было ўсіх -
Далёка ад цэнтра жыла.

Вакол сенажаці былі і лугі,
Палеткі, і рос стройны гай,
І ціхія воды Боны цяклі
У Мухавец, кобрынскі край!

Мы любім цябе, ганарымся табой,
Родная наша зямля,
Дзе б ні жыла, ты заўсёды са мной,
Дзе дзед мой і бацька, там і я.

# ВОЗВРАЩАЙСЯ, СЫНОЧЕК, ДОМОЙ

Ты увез моего сердца кусочек
И частичку брестской души.
Всегда помни об этом, сыночек,
На совсем уходить не спеши.

Та земля, что оставили предки,
Знай - родная, священна, как мать,
И ее ни за что человеку
Здесь рожденному не поменять.

Ты живешь далеко за границей,
Только мыслями рядом со мной.
Здесь березки, тропинки в поле
Ждут, сынок, тебя летом и зимой.

Здесь знакомо всё с детства до боли:
Речка, поле и лес за селом.
Ты с мальчишками бегал купаться,
На рыбалку бежал босиком.

Нелегко тебе там на чужбине,
И душа потеряла покой.
Беларусь тебя ждет с нетерпеньем,
Возвращайся, сыночек, домой.

Ведь забыть это все невозможно,
Оно в сердце до гроба в душе.
Только Родина-мать осторожно
Заживит твои раны в душе.

## Жук Лідзія

# ГИМН КОБРИНЩИНЫ

Веками путь нелёгкий твой измерен
В труде, сраженьях, горечи утрат.
Суворов знак судьбы своей доверил
Тебе, наш Кобрин, Бреста младший брат.

Вечно цвети, милый кобринский край,
Славься согласьем и счастьем людей,
Славу крепи и трудом умножай,
В мире живи и душой молодей!

Стонал народ под сапогом фашистов,
Боролся, воевал и победил.
За счастье жить под синим небом чистым
Мы память о героях сохраним.

Вечно цвети, милый кобринский край,
Славься согласьем и счастьем людей,
Славу крепи и трудом умножай,
В мире живи и душой молодей!

Народной песней Кобринщина знатна,
Семьёю дружной трудится народ.
И нивы дарят урожай богатый,
И хорошеет край из года в год

Вечно цвети, милый кобринский край,
Славься согласьем и счастьем людей,
Славу крепи и трудом умножай,
В мире живи и душой молодей!

## РАДЗІМА

Дарагія сэрцу краявіды:
Срэбра рэчкі, аксаміт палёў,
Лясных абшараў таямніцы-віды
І ціхі шэпт старых, сівых камлёў.

Люблю сцяжынку, што ляжыць між жыта,
Паветра подых у важкіх каласах,
Жыццём і працай, золатам налітых,
І вочкі васількоў у іх жоўтых валасах.

Палеткі бульбы роўнымі радамі
Сваім цвіценнем упрыгожваюць зямлю,
Далей і лён, і ячмяні з аўсамі -
Усё, што так з дзяцінства я люблю!

Прыемна басаногж прайсці па лузе,
Дзе стужкай рэчка ўецца, як зямля,
Дзе, як ахопіш вокам, на акрузе
Знаходзіць прыгажосць душа мая.

А лес, які з дзяцінства стаў мне блізкі,
Па-свойму сустракае кожны год.
Лясным багаццям кланяюся нізка,
Люблю яго паветра кісларод.

Чым больш жыву, тым лепш я разумею,
Што найраднейшым стаў мне той куток,
Які абражваць, крыўдзіць я не смею,
Адкуль цячэ жыцця майго выток.

## КРЫНІЦА НАТХНЕННЯ

Зелянюткі мурог на двары каля ганку,
Шчэбет птушак, гамонкі і спеў салаўя,
Васільковая сінь і бадзёрасць світанкаў -
Гэта ўсё, чым жыву, узбагачаюся я.

Родных сцежачак стужкі па лесе і ў полі -
Спадарожнікі самых шчаслівейшых дзён.
З вамі ў думках страчаюся часта даволі,
А ўлетку хоць раз вам даюся ў палон.

Сямейкі рамонкаў так цешацца сонцу,
Далей васількоў узвышаецца гурт,
Мятліцы мяцёлачкі шэпчуць бясконца:
Прысядзь, адпачні хоць хвіліначку тут!

Я любуюся вамі, палеткаў абшары,
Каларыт разнатраўя ўзбуджае настрой.
І так хочацца жыць і аб будучым марыць,
Сярод кветак і жыта ўдыхаць хлебны напой.

# Ігнацюк Марыя

## МАЛАЯ РАДЗІМА

Мне ўсё тут роднае з дзяцінства:
Там мой лясок за полем гаманіць,
А поле з каласочкам залацістым
І квецень нівы, што ў расе блішчыць.

Я роднае люблю любой парою:
Ці гэта лета, з полымем маланка,
Ці восеньская сенажаць, што за гарою,
Вясновы водар зранку.

Мне ўсе тут роднае, як маці:
Спеў птушак, пеўнік галасісты,
Узлет буслоў над сенажаццю
І так духмяны сад квяцісты.

А прыгажосць лясоў зімовых
Як казачная таямніца,
Нібыта з пацерак цудоўных.
А ў спеку халадок крыніцы.

Мне ўсе тут роднае з дзяцінства:
Калодзеж, хлеў, праменчык сонца,
Садок, і хатка, і сцяжынка,
І свет ў маленькае аконца.

***

Мой родны кут, мая старонка,
Ты для мяне мая загадка.
Чароўны цуд - рабіны гронка
Каля варот бацькоўскай хаткі.

Вяргіні кветкі пад аконцам
І ластавак гняздо пад дахам.
Так сэрцу мілая старонка
Зальецца зранку песняй птахаў.

Зямля мая мяне напоіць
Святой халоднаю вадою,
Яна ў смутку супакоіць,
Не дасць прапасці мне з бядою.

## Камісарук Соф’я

# МОЙ КОБРИН

*(Посвящается гербу г. Кобрина)*

Смотрит Кобрин на лик Богоматери.
Символ веры, надежды, любви.
Сохранить то, что мы не утратили
Просим, Божия мать, помоги.

Помоги одолеть все невзгоды,
Что встают иногда на пути.
Чтобы кобринский край мой и город
Могли ещё краше цвести.

Ты, венчаемый честью и славою,
Заслужил этот герб неспроста.
За труды и за подвиги славные,
А какая души чистота!

Той души, что взывает с усердием,
Пусть все люди, как братья живут,
И в твоём обитает созвездии
Мир, тепло, созиданье и труд.

Будь же славен, рабочий и пахарь.
И носитель духовных начал
У руля, у станка и на пашне,
Чтоб с улыбкою утро встречал.

Охраняй нас, Царица небесная,
Огради нас от скверных оков.
Край родимый, наш город чудесный,
Живи, здравствуй, во веки веков.

# ДЕНЬ ДЕРЕВНИ

С детства помню деревню Хабовичи,
Те года не забыть никогда,
Когда пелись тут песни до полночи,
Так и хочется спеть иногда.

Эти песни, что пели красавицы,
О не сбывшейся первой любви.
Как по улице шли, взявшись за руки,
Обновление жизни несли.

От войны уходили подальше мы,
Обновляя землю трудом.
Пелись новые песни девчонками нашими:
«Уходил на поля молодой агроном».

Не полоски, а нивы бескрайние,
Бороздили уже трактора,
И серпы заменили комбайнами,
В школу новую шла детвора.

Трактористы, доярки, комбайнеры
Были гордостью нашей всегда.
И цветами встречали ударников,
Когда завершалась страда.

Перед вами склоняем головы наши,
Ветераны войны и труда.
Благородные помыслы ваши
Не умрут никогда, никогда.

## ЖИВИ, МОЁ СЕЛО

Утром проснёшься: белым бело,
В сумерках ранних дремлет село.
Оно отдыхает от летних работ,
От всяких терзаний, тревог и забот.

Лежит, отдыхает под снегом земля.
Нарушит покой только скрип журавля.
Собака залает, петух прокричит.
Вдали где-то слышно: телега скрипит.

Зима, что захочет, то сделает с ней,
Как будто бы хочет одеть потеплей.
То вьюгой завьюжит, снежком заметёт.
Улыбчивый месяц по небу плывёт.

То словно невесту оденет в наряд.
В блестящих снежинках деревья стоят.
Идёшь и любуешься: вот красота!
Только бы в людях была доброта...

# Кандрашук Наталля

## Я ШЧАСЛІВА З ТАБОЮ, КОБРЫН!

Хоць сталееш заўжды з году ў год,
Ды квітнееш ты болей, мой Кобрын,
Быццам часу сівы карагод
Перастаў раптам дыхаць у горны.

Пра былых ліхалеццяў агонь
Мне шапочуць бярозы ў парку.
Зеляніну кранае далонь -
Разумею, жыццёвы крок шпаркі.

Сем стагоддзяў мінулі як дым,
Адляцелі, бы птушачкі ў вырай.
І ўсё ж горад такі малады,
Сустракае гасцей вельмі шчыра.

Я па вуліцах ціхіх прайду,
Зазірну ў Мухавецкія вочы
І забуду пра боль і нуду,
Шчасце побач са мною пакрочыць.

## КЛЮЧ СЯБРОЎСТВА

Ключом сяброўства адчыняем дзверы
Паміж людзьмі і нават гарадамі.
Мы, кабрынчане, шчырым сэрцам верым:
Братэрскай повязі мацнець з гадамі!

# Кірылюк Марыя

## НАШ КОБРИН

Кобрин, седой и древний,
Как ты помолодел,
Радужные наряды
Праздничные надел.
Над Мухавцем, обновлённый,
Торжественно ты стоишь,
В людей своих влюблённый
Уверенно вдаль глядишь.
Всем сердцем тебя мы любим,
Дыханием греем своим.
Для нас всегда ты будешь
Единственным и родным.

# ЖИВИ, МОЁ СЕЛО!

Мое село, село родное,
Живи веками, не старей!
Ты мне такое дорогое,
Ты – песня юности моей.

Спешат друзья в свой шумный город,
А я спешу в свое село.
Оно – мой щит, моя опора,
Моё надёжное крыло.

Моё село, земля родная!
Сколько смогу на свете жить
Ты будешь мне цветеньем мая,
Тобою буду дорожить.

# ХРАНИТЕ СВОЙ ДОМ

Ко всем живущим на Земле
Я обращаюсь искренне и просто:
Храните свой родительский очаг,
Как в бурном океане тихий остров.

Храните в памяти, в мечтах,
И в праведных делах своих храните
Долину детства, колыбель любви,
Святую материнскую обитель.

Проходят годы, пробегают дни...
Куда б вас только судьбы ни загнали –
Вам отчий дом всегда сродни,
К нему во сне вы часто приплывали.

Чтоб никогда не угасала жизнь –
Своих детей вы тоже научите
Очаг родительский хранить
Ещё сильней, чем вы его храните.

***

Даражэй за ўсё на свеце
Мне родная хатка,
Дзе калісь я пражывала,
Будучы дзіцяткам.

Дзе матуля калыханку
Мне калісь спявала
І зязюля на світанку
Пра лёс кукавала.

Дзе гучаў такі лагодны
Мілы бацькаў голас,
Выспяваў на родным полі
Шаўкавісты колас.
Дзе чароўная крынічка
Мяне ўмывала,
Дзе рамонка на пялёстках
Шчасце нагадала.

Як святому, пакланюся
Я таму парогу,
Скуль матуля адпраўляла
Мяне ў дарогу.

Колькі жыць на свеце буду,
Адкуль не вярнуся,
За цябе мая радзіма
Я заўжды малюся.

## СВЕТЛАЯ МАРА

Я жыву на Палессі, дзе дубы векавыя,
Дзе купаецца сонца ў расе,
Дзе гамоняць таполі, нібы сведкі жывыя,
Дзе крынічка аб шчасці пяе.

Дзе з глыбінь жыватворных даўніна выплывае
І ляціць на далонькі мае,
Запаветную мару ў маё сэрца ўсяляе
Захаваць для патомкаў яе.

Лёгкакрылая мара, ты ляці ў паднябессе,
Адшукай там падтрымку сабе,
А калі адшукаеш, тады напрадвесні
З добрай весткай вярніся да мяне.

Нашых продкаў багацці я па крохах збіраю
І ў скарбонку складаю сабе,
Старадаўнія песні любоўна спяваю
Мая мара, не здраджу табе!

## Кірылюк Наталі

# МАЯ БЕЛАРУСЬ

Люблю маю Радзіму - Беларусь,
Прыгожую, ласкавую, як маці.
Люблю яе раздоллі, шум бяроз,
Скрып веснічак ля хаты сустракаці.

Народ наш беларускі я люблю за тое,
Што ён добры і руплівы.
Люблю хадзіць па сцежцы басанож
І назіраць прыгоства ўсёй радзімы.

Люблю мой край за тое, што ён даў
Мне неба, сонейка і родную нам мову,
За тое, што ўскарміў і ўзгадаваў
І навучыў у водгуку мне быць гатовай.

Квітней, мой край, квітней, мая старонка,
У шуме рэк і ў цішыні лясоў,
У чыстым, любым спеве жаваронка.
Жыві заўжды на тысячу вякоў!

## Клачковіч Валянціна

# МОЙ ГОРОД

Мой Кобрын, мой горад цудоўны!
Я ганаруся табой.
Ты, быццам бы сад той чароўны,
Расцвіў маладою красой.

Люблю я твой парк старажытны
І вербы над ціхай ракой,
Дзе шчасце пад небам блакітным,
А у сэрцы – цяпло і спакой.

Люблю тваіх вуліц шумлівых
Паслухаць той ранішні звон,
Калі галубоў палахлівых
Узнімае да воблакаў ён.

А людзі твае - залатыя,
Што самі будуюць свой лёс,
І славу тваю, горад родны,
Узносяць да самых нябёс!

Жыві і квітней, горад родны,
Надзея мая і любоў,
Куды ні вяла бы дарога,
Да цябе я вяртаюся зноў.

Мой Кобрын, мой горад цудоўны!
Мой лёс, ты заўсёды са мной,
Пад небам краіны свабоднай
Расцвіў ты красой маладой.

## РОДНЫ КУТ

Мяне ўразіла сталіца
Жыцця свайго імклівым рытмам,
Сваімі гмахамі-дамамі
І вечаровымі агнямі.

Сквераў і паркаў прыгажосцю,
У ёй няўлоўнае ёсць штосьці,
Чаго не выкажаш славамі,
І што так дарага нам з вамі.

Мой край, мой Мінск,
Мая сталіца!
Табою можна ганарыцца,
Ты – лепшы горад на зямлі.

Дзе б мы ні ехалі, ні йшлі,
Сюды нам хочацца вяртацца,
З табой на ўсё жыццё застацца.
Цудоўны горад! Ну і што ж?

Але мой родны слаўны Кобрын
Мілейшы майму сэрцу ўсё ж!
Мне так тут хораша і светла,
Такое чыстае паветра.

Так лёгка дыхаецца тут!
Мой самы мілы родны кут,
І толькі тут, так мне здаецца,
Душой сваёй магу сагрэцца.

Няхай зіму змяняюць вёсны,
Няхай праходзяць дні, гады,
Мой горад родны! Маё сэрца
Табе належыць назаўжды!

## РАДЗІМЕ

Ты светлы сум мой
І слязінка на шчацэ,
Букет рамонкаў белых у руцэ,
Бярозак шоўкавыя косы
І ранкам летнім залатыя росы.
Ты – дожджык, цёплы і ласкавы,
На лузе скошаныя травы.
Ты ручаёчак, звонкі і празрысты,
На плоце певень галасісты.
І бусел белы ў небе сінім –
Усё гэта ты, мая Радзіма.
Сцяжынка да бацькоўскай хаты.
Той край, што песнямі багаты.
Матулі роднай калыханка
І спеў дзяўчат ў сяле да ранку.
Дзіцячы смех – вясёлы, звонкі,
Усё гэта ты, мая старонка.
Прызнання ў каханні словы –
І мілагучнасць роднай мовы.
Ты лёс мой, светлы і шчаслівы,
Ты для жыцця даеш мне сілы.
Мая Радзіма, край мой родны,
Жыві шчаслівa, вольна, годна.

# МОЙ КРАЙ

Мой родны край, мой лёс, мая зямліца!
Душой і сэрцам да цябе хачу я прытуліцца,
Абняць цябе хачу, з табою паяднацца
І паляцець, у неба тваё чыстае падняцца.

Стаць птушкаю хачу, ляцець свабодна ўгору,
Каб прыгажосць тваю ўбачыць з вышыні,
І вольныя прасторы.
Твае лясы зялёныя, лугі і нівы залатыя.

Мае мясцінкі родныя, так сэрцу дарагія.
І гмахі гарадоў, і сціпласць мілых вёсак,
Дзе сонейка купаецца ў рэчак сініх плёсах
І дзе валошкі ў збажыне так хораша цвітуць,

Там дзеці твае, родная зямля, працуюць і жывуць.
Там замкі продкаў нашых у неба сінь імкнуцца,
І дзе б я ні была, мне да цябе зноў хочацца
вярнуцца.
Любіць цябе, зямля мая, увек не перастану,
Тут унукам нашым лёсам жыць наканавана.

# МАЁ ЖЫЦЦЁ

Адвечная тэма, адвечныя словы:
Радзіма, матуля і родная мова.
Пяшчоту і ласку да роднага краю,
І шчасце, што тут я жыву, адчуваю.

Усім сэрцам сваім я аддана табе
У каханні і ў шчасці, у бядзе і журбе.
Куточак мой родны, Радзіма мая,
Табой, як матуляю, узрошчана я.

Пад небам тваім, такім чыстым і светлым,
Удыхала я пахі Радзімы з паветрам.
Чаромхавы водар зялёнай вясною,
Марознага ветру халоднай зімою.

Цудоўныя пахі ўсіх красачак улетку
І пах збажжыны на асеннім палетку.
І пах, што ўздымаўся, здаецца, да неба –
Пах цёплага, смачнага, свежага хлеба.

Расла і сталела я разам з табою,
Каханне сустрэла аднойчы вясною.
У квецені красак, што сонцам сагрэты,
Вясёлкай растаяла цёплае лета.

Узышлі, прараслі ўжо кахання зярняткі,
І выраслі дзеці - мае птушаняткі.
І цесна ім стала ў родным гняздзе,
Сваёю дарогаю кожны ідзе.

Настала ўжо восень, пара залатая,
Цудоўныя ўнучкі мае падрастаюць.
Хачу я, каб быў у іх казачны лёс –
Хай свеціць ім шчасце, як сонца з нябёс.

Хай будзе ў іх лепей за нашую доля,
Бяды і хваробаў не стрэнуць ніколі,
І будуць у іх жыццях адвечныя словы:
Радзіма, матуля, і родная мова.

***

Шчасця, долі не шукаю
На чужой старонцы.
Яно тут, у родным краі,
Пад Радзімы сонцам.

Маё шчасце – мае дзеці,
А цяпер – і ўнукі.
Мір, спакой у белым свеце,
Ды матулі рукі.

Зноў спяшаюся дадому
Па вузкай сцяжынцы.
Усё да болю тут знаёма –
Кожная драбніца.

Таты згорбленыя плечы
Здалёк заўважаю,
І пачуцці ад сустрэчы
Ледзьве ўтрымаю.

Пабягу яму насустрач
Як калісь ў маленстве.
Што нічога не вярнуць ужо
Разумею сэрцам.

Не сустрэне на парозе
Мама, як калісьці,
Бо ўжо крыжык на пагосце
Ды грудок зямліцы.

Не цвітуць парою вешняй
Маміны вяргіні.
І мяне цяпер суцешаць
Толькі ўспаміны.

Быццам птушкі, залатыя
Гады праляцелі,
Мы ўжо немаладыя,
Валасы ссівелі.

Сум на сэрцы невыносны,
Хто ў тым вінаваты?
І ў душу глядзяць, як вочы,
Вокны роднай хаты.

## Лазарчук Васілій

# НАШЭ СЫЛО (РУХОВІЧЫ)

Прышла высна, в козацькому каналі
Ломае крыгу быстрая вода
І жайворонок высоко спывае,
Бо вжэ мынулы зымні холода.

І скоро стэп і гай зазэлэніе,
На полэ выйдуть нашы тракторі,
І дождык тэплый, і вітёр повіе,
І загудуть роямы комарі.

А гул моторув с піснею злылыся.
Спывають хлопці в нашому сэлі,
А там высоко в нэбы ростяглыся,
З вырая лынуть знову журавлі.

Кращэ ныма ныгдэ на всему світы,
Як в Руховэцькім нашому сэлі.
Цвытуть садкы як ыніём покрыты,
А край дорогы рослы тополі,

А за сэлом высокый гай ольховый
І рясны вэрбы гнутся до зэмлі.
Про всю красу словамы нэ роскажэш
Що в Руховэцькім нашому сэлі!

***

Наша славна Руховщына,
Нашы лугы і болота.
Бо то наша батьківщына,
Но працюй жывы и дбай.

Нам нэ трэба Амерыка,
Нэ трэба нам Канада,
Можно в нас жыты заможно,
Но робыты трэба.

Нашы поля, нашы стэпы,
То наш рідный край.
Як прылытыть вэсной птаство,
Кругом глянэш - красота.

## Лазюк Людміла

## МОЙ ГОРОД

Для меня любимый город лучший на Земле,
Он как будто нарисован на цветном стекле.
Разноцветные дома здесь, речка и мосты –
Всё рождает вдохновенье, смелые мечты.

Этот город, просыпаясь, смотрит в облака,
Их зеркально отражает Мухавец-река,
Люди радостно встречают солнечный восход.
И куда-то манят дали и зовут вперёд.

Этот город, не похожий ни на что вокруг.
Улыбается прохожий, словно старый друг,
Помогает человеку верить в чудеса,
Распускаются каштаны прямо в небеса.

Солнца блики золотые, яркие цветы,
Шум берёз в старинном парке - это, Кобрин, ты.
Ты как будто нарисован красками любви,
Расцветай, любимый город, и в веках живи!

## Літошык Валянціна

# ПОД СЕНЬЮ КОБРИНСКИХ БЕРЁЗ

Под сенью кобринских берез
Так дышится легко, свободно!
Здесь Мухавец средь пышных лоз
Стремится к Бугу полноводно.

И речка Кобринка течет,
Низинами струясь, петляет.
И рукотворный Боны ход
Окрест болота осушает.

Историей тут дышит всё.
Суворов проживал когда-то,
Отечество любил свое,
Был полководцем и солдатом.

Здесь ветер мягким рукавом
Пылинки древности сметает.
Любая улица и дом
Своей легендой обрастает.

Кто тут ни ехал и ни шёл!
Какие войны, битвы были!
Здесь каждый, что искал, нашел –
Иные доблесть, тлен иные.

Семь в лету канувших веков,
Как - будто вышли из забвенья,
И Кобрин выплывает вновь,
Как челн в упругие теченья.

Все дальше плыть ему и плыть
Под резвым парусом надежды,
И не растратить свою прыть,
С ветрами споря, как и прежде!

# ПЕСНЯ О КОБРИНЕ

Древний наш Кобрин веками стоит,
В плавной реке отражается,
Подвиги славных сынов своих чтит
И в новый день устремляется.

Он в окруженьи красивых мостов
Словно в объятиях нежится,
В зелени парка, в цветеньи садов
Белыми волнами пенится.

Бережно город к успеху ведёт
Швей, музыкантов, художников,
Юным строителям крылья даёт
От штукатуров до плотников.

Женщин прекрасней, чем в Кобрине нет:
Нежных, надёжных, внимательных,
Благоуханных, как розовый цвет,
Трудолюбивых, хозяйственных.

Кобрин родной Беларусью согрет,
Мирное счастье в нём ценится.
Пусть процветает он тысячи лет,
В ласковом солнышке греется.

# ЛЮБИМЫЙ ГОРОД

Люблю тебя, мой Кобрин город –
Особняки, дворцы, ансамбли.
Прекрасен ты и в зной, и в холод,
Так и погладил бы, и обнял бы.

Весь парк с травою изумрудной,
Пруды с изящной балюстрадой,
Фонтана веер серебристый,
Амфитеатр с его эстрадой.

«Ампир», «Модерн» в твоих карнизах,
Седых столетий глубина,
И современностью пронизан
В лучах зеркального стекла.

Как Мухавец в одежде строгой
Повенчан с Кобринкой навек,
Так с благодатию от Бога
Пусть жил бы каждый человек.

И обновлёнными стопами
Ступал по новой мостовой,
Душой и сердцем, и устами
Творил хвалу стране родной.

## СОЖЖЁННЫЕ ДЕРЕВНИ

Сорок второй военный год:
Расстрелы, ужасы, кошмары.
Фашизм ужесточает гнёт.
Кругом беда, кругом пожары.

Внедряя Барбаросса план,
Людей с лица земли сметая,
Не обошли и кобринчан,
И деревень не исключая.

Каменка, Речица, Борки,
Орел, Новосёлки, Лука –
Эти названия громкие
Пытались стереть навека.

А также Борисовка с ними,
И Черевачицы тоже
С людьми полыхали живыми.
Покой снизошли для них, Боже.

Сотни и взрослых, и малых
Криком взорвали простор…
Плачут гранитные мамы.
Помним и мы до сих пор.

Но не исчезли деревни (кроме Орёл)
Снова живет в них народ.
Так же в названиях древних
Память о предках несёт.

## Лукашук Вікторыя

# ПРОВИНЦИАЛЬНЫЕ СНЫ

Чёрные крылья ночей, в окнах - застывшие звёзды.
Город-корабль ничей стынет в белом снегу.
Провинциальные сны вновь не дают мне покоя,
И от весны до весны я лишь надеждой живу.

Пусть четверть века делю здесь судьбу лишь с тобой.
Долгим мне кажется срок, но в твоём времени малым.
Семь сотен лет ты стоишь на леденящем ветру,
Ждёшь пассажиров своих у пустого причала.

Застигают врасплох мысли жёлтых огней,
И феерия грёз цепи рвёт якорей.
И застывшей воды своя грусть и печаль.
Ты меня на ладонях, мой Кобрин, качай.

Что знаю я о тебе? Не нахожу вновь ответа.
Тенью страданий и бед время рвало штурвал.
Вахты бессоных ночей, и в кумаче, и в огне ты,
И на французский манер стал мне дороже вдвойне.

Бронзовый гордый орёл на рукотворной скале -
Символ он совести, чести, доблести, славы всех
поколений.
Увы, памятью их дорожим
Только тогда, когда время забвением правит.

Пепел прошлых веков ностальгию хранит,
А забитый погост - отреченье и стыд.
Имена сыновей и своих, и чужих
Лишь в названиях улиц на долго ль живым?

Чёрные крылья ночей, в окнах - застывшие звёзды.
Город-корабль ничей стынет в белом снегу.
Провинциальные сны вновь не дают мне покоя,
И от весны до весны я лишь надеждой живу.

Застигают врасплох мысли жёлтых огней,
И феерия грёз цепи рвёт якорей...
Одинокий корабль, как мираж наяву.
Как ни странно, но здесь лишь я серцем живу.

## Люлькоўская Алена

# ПОСВЯЩЕНИЕ КОБРИНУ

Ты, мой город, конечно, не можешь сравниться
С городами, шумящими гулом турбин.
Но ты Родины нашей огромной частица.
Самый близкий, родной и любимый один.

Много есть на земле городов самых главных:
Ленинград и Ташкент, Кишинёв и Москва.
Только ты для меня среди них самый славный,
Хоть во многих из них я ещё не была ...

Много мест у тебя, что так дороги людям.
Ведь у каждого что-то любимое есть ...
Город мой! Мы повсюду тебя помнить будем.
Родились мы и выросли именно здесь!

Наша школа, которая в мир нас вводила,
Помогала нам жить, и мечтать, и дерзать,
Ненавидеть, страдать и любить научила...
О тебе я сейчас не могу не сказать!

А вы, рельсы стальные, так часто хотели
Увезти меня вдаль от родных наших мест...
Только все мои мысли обратно летели,
Лишь мне стоило выехать за переезд.

А наш парк! Посмотрите, какие просторы!
Много лет здесь шумят вековые дубы.
Охранять наш покой завещал им Суворов,
Человек необычной, завидной судьбы!

Наша речка! Совсем небольшая, пожалуй,
Но смогла ты весь город собою обнять.
Не забыть мне, как все мы когда-то бежали
На твой мост, чтоб рассвет выпускной свой встречать.

Город мой! Я люблю тебя летом, весною,
Когда праздники празднуешь или грустишь.
Твои милые улицы всюду со мною.
Их предпраздничный шум и вечерняя тишь.

Каждый, кто к нам приедет, и каждый прохожий
Обязательно скажет, что строишься ты.
Пролетают года, только ты всё моложе ...
И сбываются наши с тобою мечты.

В жизни часто выходит не так, как хотим мы.
Может жить мне придётся вдали от тебя...
Но ты знай, знай и помни, мой город любимый,
Я песчинка твоя, я частица твоя.

Пусть проходят года, разрушают и строят.
Мы не будем считать наших прошлых потерь...
Навсегда-навсегда моё сердце с тобою!
Ты всегда будешь милым, родным, как теперь!

## Момлік Надзея

### МОЙ ГОРАД

Мой горад у ранішняй цішы
Люляеш маўклівы спакой,
Дзе неба аблокі калыша
Над Мухаўцам - любай ракой.

Мясцін гераічных нямала
У войнах палітых крывёй.
Святою зямля гэта стала,
Дзе вызваляльны ішоў бой.

І воінаў слаўных імёны
У памяць увайшлі назаўжды.
Схіляемся ў нізкім паклоне,
Пашану нясем праз гады,

Бо ў вечным даўгу перад вамі
За шчасце.Тут дзецям расці.
Дарогай, абранаю намі,
Упэўнена йсці па жыцці.

Тут песня бясконца ільецца
У святочныя, светлыя дні.
І радасць у вачах адаб’ецца:
Усмешкі – куды ні зірні.

І верыцца: больш ужо ніколі
Ніхто не кране твой спакой.
Дай Бог табе шчаснае долі,
Мой горад над мірнай ракой.

## МАЯ ВЁСКА ЖЫВЕ

Пастарэлі былыя падворкі
Пад цяжарам няспынных гадоў,
Не чуваць гаманлівай гаворкі…
Толькі шэпт задуменных садоў.

Як у дзяцінстве: на вокнах фіранкі,
Палымнеючы шэраг вяргінь,
І разбуджаны пеўнямі ранкі,
І антонаўкі подых тугі.

А за вёскай бяскрайняе поле,
Гул камбайнаў над цішай плыве…
І знікае бязлітаснасць болю:
Мая вёска і сёння жыве!

Як раней, незабыўнае поле,
Ты хвалюеш прастор збажыной.
І на гэтым бязмежным прыволлі
Адчуваю сябе маладой.

Дзякуй вам, хто ўкінуў тут зерне
У мяккі пух узаранай раллі.
Я ў любым кутку ў час вячэрні
Захлынаюся пахам зямлі.

## РОДНЫ КРАЙ ВЯСНУ ЧАКАЕ

У небе чыстым глыбіня спакою,
Я ў чаканні новага жыцця,
Ад бяроз салодкага напою
Выходжу са знямення, з забыцця.

Тут ад світанку, вытканага сінню,
Блакітам хваль калышацца рака.
І сніцца палахлівы сон асіне
З прылётам першавесніка - грака.

Ад зеляніны руні шаўкавістай
І ад пушыстых каташкоў вярбы,
Ад водару п’янкога белай вішні
Знікае след зімовае журбы.

Ці я нап’юся гэтым зіхаценнем
У краі, дзе радзіцца выпаў лёс,
Ці наталюся водарам цвіцення
Сярод шчасліва сцішаных нябёс?

І застануся, пэўна, назаўсёды,
Каб удыхаць і піць нектар палёў,
Там, дзе світальнай раніцай прыроду
Абудзіць зычны покліч жураўоў.

Я негу буду піць так асцярожна,
Каб ані кроплі долу не праліць,
Бо па глытку малым напіцца можна,
Каб гэтага ніколі не забыць.

Да цябе, мой край, трысцінкай тонкай,
Сполахам зарніцы прыпаду.
Краявідаў роднае старонкі
У цэлым свеце лепшых не знайду.

## ТУТ ДАРАГОЕ ЎСЁ

Тут дарагое ўсё – куды ні глянеш…
Спяшаюся да родных берагоў,
Дзе белая чаромха на паляне
Нявесціцца пад поглядам дубоў.
Дзе дыхае ўзараным полем ранне
І водарам вясёлкавых лугоў.
Тут дарагое ўсё – куды ні глянеш…
Спяшаюся да родных берагоў.
Ці ў людзі выйдзеш ты, вядомым станеш,
Ці стомішся пад сцюжаю вятроў,
З бядой ці з радасцю вяртаешся дамоў,
Твой родны кут не здрадзіць, не абмане.
Тут дарагое ўсё – куды ні глянеш…

## МОЙ КРАЙ ЗАПАВЕТНЫ

Мой край запаветны, пад сонцам ці ветрам.
Любою парою ты ў думках са мною.
Паўсюль па вясне ў першацветах узлескі
Блакітным паглядам чаруюць пралескі.

Чаромха выходзіць, як тая нявеста,
У садзе вясновым аж водару цесна.
Усюды, дзе глянеш, загадкавасць ёсць
І ў кожнай трысцінцы свая прыгажосць.

І нават калі непагодлівы ранак
Закрые ўсё непраглядным туманам,
То сонейкам верас аднекуль прагляне,
Шчасліва ўсміхнецца маўклівай паляне.

Ці ўлетку, ці стылай парой лістападу,
У радзінным кутку адшукаю параду.
Нібыта тану ў заварожанай цішы,
Дзе родны куток, бы ў дзяцінстве, калыша.

## ДЗЕ ЖЫЦЦЁ ПАДАРЫЛІ

*(Маёй роднай вёсцы Залессе)*

Заблудзілася тут
Мая светлая мара,
Дзе цудоўны мой кут
І дзе свет я спазнала,

Дзе ўтульнасць лугоў
І дзе цішы гамонка.
Я вярнуся ізноў
У пяшчоту рамонкаў.

Я прыеду сюды
І на ганку спынюся,
Ад трывог і бяды
Тут цяплом захілюся.

Ды ў вечнасць сышла,
У нябёс таямніцы,
Тая кропля цяпла,
Што цяпер не напіцца.

Не чуваць ужо даўно
Поступ крокаў нясмелых,
І палае агнём
Сэрца боль анямелы.

Тут прысутнасць твая
У паветра дыханні.
Ды пад спеў салаўя
Надышоў час растання.

Да самотнай вярбы
Ля мастка пры дарозе
Ад балючай журбы
Прыхілюся ў знямозе.

Прыспяшае жыццё,
Час становіцца шчыльным.
Пасталела ўсё,
Што калісь было дзіўным.

Пра жаданы мой край
Буду жыць успамінам,
Дзе валошкавы рай
І брынчыць арабіна.

Не здарожыцца шлях,
І не сцішацца словы...
Я цяпер у гасцях -
У дзяцінстве ружовым.

Дзе мы ўбачылі свет
І дзе сталі на крылы,
Тут жыцця запавет
Нам бацькі падарылі.

## НА СУСТРЭЧУ З ДЗЯЦІНСТВАМ

Журавы ў сінім небе курлычуць,
Пакідаючы край родны свой.
На сустрэчу з дзяцінствам імкнуся -
Тчэцца ніткай дарога дамой.

Гэтым днём вераснёвым лагодным
Я ў дзяцінства вяртаюся зноў.
Незнаёмым усё мне здаецца:
З той пары шмат мінула гадоў.

Прыадкрыю заслону ў маленства
Праз гады і сумёціцу дзён.
Адчуваю жыцця незваротнасць,
Успамінаў, надзей, мараў плён.

Сталі гонкімі нашы бярозы,
Што у юнацтве садзілі з табой.
Успамінаю ўсю шчырасць размовы
Вечаровай спаткальнай парой.

На сцяжыне ўсё казкай здаецца:
Утульны лес і бязмежнае поле.
Родны кут, што радзімай завецца,
Я люблю цябе моцна, да болю.

## ПАДАННЕ ПРА ДЗІВІН

Праз сівыя вякі, праз стагоддзі
Нам паданне ад продкаў дайшло
Пра імкненне людзей да свабоды,
Ды пра роднай зямлі харaство…

Уцякалі ад ворагаў лютых
Праз балоты і неруш лясоў
Безнадзейна знямоглыя людзі.
Каго неслі, хто ледзве ішоў.

Раптам скончыўся лес гэты нудны,
І адкрыўся чысцюткі прастор:
Луг зялёны рамонкавы цудны.
Паабапал – рабіны касцёр.

І пачуўся ўзрушаны голас:
«ДЗІВА», «ЛЮБА» край трэба назваць.
Будзем жыць тут шчасліва і доўга,
Сеяць хлеб і дзяцей гадаваць…

«ДЗІВІН» – ДЗІВІН, а «ЛЮБА» – ЛЮБАНЬ.
Цеплыні колькі ў назвах гучыць!
Твае дзеці цябе не разлюбяць,
Родны край, без цябе не пражыць.

## ВЁСКА ЗАЛЕССЕ

(Мая малая радзіма)

У Беларусі лясамі багатай
Будаваліся вёскі бліз лесу.
Смаляныя складаліся хаты.
Назву вёскам давалі – Заляссе.

Слых пра вёсачку нашу не згіне
У суседніх маўклівых гаях:
Тут яшчэ старажытнай часінай
Белавежскі наладзіўся шлях.

На раўніне адкрытай, за лесам,
Дзе палёў камяністых абшар,
На шырокіх прасторах Палесся
Продак жыў мой – зямлі гаспадар.

Быў спакой найважнейшым дарадцам
У віхуры жыццёвых падзей,
І заўжды вёску славіла праца
Бескарыслівых, простых людзей.

Пастарэлі былыя падворкі
Пад цяжарам пражытых гадоў,
Пацішэла на вулцы гаворка…
Толькі шэпт задуменных садоў.

Бы ў дзяцінстве, на вокнах фіранкі,
Тонуць дворыкі ў квеці вяргінь,
І разбуджаны пеўнямі ранкі,
І антонаўкі подых тугі.

А за вёскай бяскрайняе поле,
Гул камбайнаў над долам плыве.
І знікае па каліўцу боль мой:
Мая вёска і сёння жыве.

## РОДНАЙ ВЁСЦЫ ЗАЛЕССЕ

*(Гасцінным гаспадарам «Маціўскай хаты»)*

Наша вёсачка ціха сумуе -
Мой бярозавы стомлены край.
Вецярок шапаткі, клапатліва
Тут спакой і пяшчоту люляй.

Ссірацелай стаяць больш не будзеш:
Ёсць нагода наведаць часцей,
Бо наш Рэвень штогод запрашае
У глыбінку цікавых гасцей.

Рэўнем роў тут назвалі калісьці -
За напорыстасць так нараклі,
Бо шумлівыя воды з пагоркаў
Бушавалі ў Рэўню, раўлі.

Пра цябе, Рэвень, памяць шануем:
Ты з маленства ўсіх гадаваў.
І ўлетку, і зімкаю снежнай
Колькі ты рыхтаваў нам забаў!

Незабыўныя нашы бярозы
Шэпчуць косамі казку сваю
Пра залівісты гоман дзіцячы...
Ды не чутны цяпер ён чаму?

Мая веска, табе не загінуць,
Бо ўзрасціла нашчадкаў сабе,
Сэрцам шчырым бязмерна адданых,
Што шануюць і славяць цябе.

Хоць цяпер не жывеш ты багата,
Не смуткуй і не стой у журбе:
Нарадзіла «Маціўская хата»
Добрых, удзячных нашчадкаў табе.

Дзякуй Вам, гаспадар гэтай хаты.
Гаспадыні - паклон і хвала
За любоў да чароўнай мясціны
І да вёскі, што працай жыла.

## ВЕЛІКОДНЫЯ ДНІ Ў РЭЎНІ

Адпіла тут глыток веснавога напою,
Патанула ў гаі змаладзелых бяроз.
У абдымках гаючых, мой краю, з табою
Наталюся бальзамам сярэбраных рос.

Зноў стаю на зямлі, што мяне калыхала,
Тут, дзе ціша гайдае ўспамінаў узлёт,
Як заснежаным днём горка нас заклікала
І як беглі сюды мацаваць першы лёд.

Вось абуджаны Рэвень шумлівай гаворкай,
Галасістая песня ў надхмар'е ляціць.
Да Вялікадня тут аднавілася горка -
Каляровыя яйкі зноў будзем каціць.

Напаўняецца гулам спусцелая вёска,
Смех і гоман дзіцячы гайдаюць прастор.
Кожны год Рэвень наш маладзее патрошкі
Пад нястомным святлом арабінавых зор.

І надзея не згіне, бо памяць жывая,
Бо ў свята сярод самых добрых гасцей
У адноўленых звычаях роднага краю
Сэрца грэюць уцеха, смех звонкі дзяцей.

# РОДНЫ КРАЙ

У небе чыстым глыбіня спакою,
А я ў чаканні новага жыцця
І ад бяроз салодкага напою
Выходжу са знямення, з забыцця.

Тут ад світанку, вытканага сінню,
Блакітам хваль калышацца рака
І сніцца палахлівы сон асіне
З прылётам першавесніка-грака.

Ад зеляніны руні шаўкавістай
І ад пушыстых каташкоў вярбы,
Ад водару п'янкога белай вішні
Знікае след зімовае журбы.

Ці я нап'юся гэтым зіхаценнем,
Дзе нарадзіцца выпаў шчодры лёс?
Там наталюся водарам цвіцення
Сярод шчасліва сцішаных нябёс?

І застануся, пэўна, назаўсёды,
Каб удыхаць і піць нектар палёў
Там, дзе світальнай раніцай прыроду
Абудзіць зычны покліч журавоў,

Я негу буду піць так асцярожна,
Каб ані кроплі долу не праліць,
Бо па глытку малым напіцца можна,
Каб гэтага ніколі не забыць.

Зноў да цябе, мой край, трасцінкай тонкай
І сполахам зарніцы прыпаду,
Бо краявідаў роднае старонкі
У цэлым свеце лепшых не знайду.

# ВКУС ДОРОГОЙ ЗЕМЛИ

Бесценный вкус отеческой земли
Подарком благодатным получила.
Хоть вдаль пути-дороги увели,
А край мне этот вечно будет милым.
Со мною он, как жизнь, не разделим:
Здесь черпаю уверенность и силы.
Летят стрелой безропотно года,
Но вкус волшебный помнится всегда.

# НА ПРАДЗЕДАЎ МАІХ ЗЯМЛІ

## *(Вянок санетаў)*

1

Мой родны кут, збалелаю душою
Я дыхаю цяплом тваёй зямлі,
І зноў мне сэрца радасна хвалюе
Пах свежаўзаранае раллі.

Кіпяць сады ў квецені ружовай,
Азіміна блішчыць у промнях дня,
І церпкая алешыны абнова -
У родным краі правіць баль вясна.

І цепліцца ў душы замілаванне,
І льюцца словы чыстага прызнання,
Складаюцца ў шчырасці радок.

І ўспамінам поўніцца ўзлесак
Пад асляпляльным покрывам пралесак.
Люблю цябе, адвечны мой куток.

2

Люблю цябе, адвечны мой куток,
І сцежку ў маленства пракладаю,
І выкрадаю з памяці шматок,
З далёкіх вёснаў казачнага раю,

Дзе маці завіхалася ля печы
І горкаю аладкі на стале...
Ды болем ад журботнае сустрэчы
Пранізліва хвалюе сэрца мне.

Цяпер ты толькі ў думках, і ў снах,
Ды ў радках устрывожанага верша,
А пра цябе, матуля, быў ён першым.
Хоць правіць баль квітнеючы вясна,

А сэрца абліваецца крывёю:
Успамінаю маці маладою.

3

Успамінаю маці маладою,
У «пад паненку» крамяной хусціне,
З адкрытаю і добраю душою,
Руплівай гаспадыняй у хаціне.

Адбітак ног на вымытай падлозе,
Што выслана аерам у святах...
А дзеці твае недзе ў дарозе,
Бо выраслі, узляцелі, як той птах.

Ды толькі незабыўныя карціны
Майго сяла і роднае хаціны
Выкідвае зноў памяць незнарок.

І мрояцца мне вербы каля хаты
Пякучым болем незваротнай страты.
І поклічы буслiныя здалёк...

4

І поклічы буслiныя здалёк
Як абвяшчэнне блізкага вяртання
У восенню пакінуты куток,
У край з вясёлкавым жаданым раннем,

У аблогі аксамітныя лугоў,
Калісьці дзіва-травамі пакрытых.
Бавоўнік, лотаць і балігалоў
Загублены пад ворывам, забыты.

Ды думак безнадзейных не пускаю,
Бо руні свежай пах тут адчуваю,
І сэрца - пад бязмежнай цеплынёй.

І толькі ўспамін плыве аблогам
Над поплавам да роднага парогу,
Трывожыць мой прыглушаны спакой.

5

Трывожыць мой прыглушаны спакой
Зноў памяць пра забавы ў нашым Рэўні,
Бо весялосці, радасці такой
Нідзе больш не адчую ўжо, напэўна.

А пазалотай крапіцца лістота -
Цяпер і восень правіць сумны баль.
Ды ладзіцца нашчадкамі з ахвотай
У Рэўню невялічкі фестываль.

Сяброў сваіх тут шчырасцю сагрэта,
Зваротам у маладое наша лета,
Успамінам пра шчаслівы школьны баль.

Ліст з пазалотай стомлена кружыцца...
Яшчэ мне доўга ноччу будзе сніцца
Лістоў асенніх дзіўны карнавал.

6

Лістоў асенніх дзіўны карнавал,
Што падаюць пакорліва пад ногі, -
Гасцей заўжды так Рэвень сустракаў
З мясцін цудоўных, з дальняе дарогі.

І хата, стомленая адзінотай,
Гасцінна свае дзверы адчыняе,
Усіх прымае радасна, з ахвотай.
«Заходзьце, калі ласка», - запрашае.

Прыветны і цудоўнейшы мой краю,
З табой заўжды сустрэчы я жадаю,
З табой і асалода, і спакой.

Вярнуліся да страчаных высноў
У мрояў васільковых дзіўных сноў,
Тут дыхаю цяплом і дабрынёй.

7

Тут дыхаю цяплом і дабрынёй.
Чырвоны кут: ручнік над абразамі,
Абрус льняны з арнаменту каймой,
Што вытканы быў умелымі рукамі.

А ў дворыку ёсць кветнічак стракаты,
Далей, за клуняю, - высокі вал,
І глог, заўжды на ягады багаты,
Шырокі роў, бярозкі абапал.

Бацькоўскія цудоўныя мясціны...
Падворак ля «Маціўскае хаціны»,
Дзе ладзяць вераснёвы фестываль...

З мелодыяй суцешнага спакою
У краі з непрыдуманай красою,
Дзе ў бярозках зелянее вал.

8

Дзе ў бярозках зелянее вал,
Такі цудоўны від «глядзельнай залы».
Зноў вераснёвы ладзіцца тут баль,
Ды гледачоў ужо засталося мала.

На сценах клуні яркія партрэты
Пад вераснёвым барвяным праменнем.
І радасцю сягоння ўсе сагрэты,
Хто вёску славіў працай і ўменнем.

І хочацца сказаць усім вам, людзі,
Жыццё хай светлым і багатым будзе.
За стомленай душы благаславенне,

За шчасце ад прыемнага вяртання,
За гэтае гаючае спатканне -
Усім дзякуй за цудоўныя імгненні.

9

Усім дзякуй за цудоўныя імгненні:
Зноў вёску закружыла карагодам,
Развеяліся смутак і сумненні,
І танчыць сёння вуліца з народам,

У Рэвень на «вяселле» запрашае
Бабулек, што прыбраліся да свята.
Над вёскай песня звонкая лунае,
Бо сёння ў сяле гасцей багата.

Вяселлем напаўняюцца падворкі:
І песня, і з павагаю гаворка -
Ад адзіноты сумнай пазбаўленне.

Забыліся на клопат і турботы,
Няспынную сялянскую работу...
Тут шчырасць і святло заспакаення.

10

Тут шчырасць і святло заспакаення
У барах, што не краналіся адвеку.
У палоне неабдымнага трызнення
Адкажа чысцінёю нават рэха.

Мой краю запаветны, белакрылы,
Мне мілату, як прашчуру, аддаў,
І наш народ цябе што мае сілы
За бацькаўскую шчырасць апяваў.

Няхай гучыць зноў песня ладна, звонка
Над вёскаю, над мілаю старонкай,
Куды вядзе нястомная сцяжына,

Святлом даверлівым, жывым пральецца
І промнем незгасальным адаб'ецца
У вачах заціхлых стомленай жанчыны.

11

У вачах заціхлых стомленай жанчыны
Ад веку пацямнела біруза.
Няма на тое важкае прычыны,
Ды задрыжэла сціплая сляза.

Як важна на хвілінку затрымацца
І адпачыць ад шуму гарадоў.
Патрэбна часам проста ўглядацца
У твары ўсіх бабулек і дзядоў.

Вось роспач і глухое хваляванне
Змяніліся душы замілаваннем,
Бо сёння ў іх настрой прыўзняты.

Дзяцінства басаногае згадаю,
Пяшчотна ў сэрцы музыка зайграе -
Я не спяшаюся, хоць сціхла свята.

12

Я не спяшаюся, хоць сціхла свята,
Бо не наведала адзін куток -
Завулачак на ўзгорачку прыўзняты
З загадкаваю назвай «Арабок».

Разбуджаная памяць запляла
У маленства незабыўнае зварот:
Праз поле жытняе калісь вяла
Сцяжынка да дзядулевых варот.

Тут прыпынюся з ціхім хваляваннем.
Я ўдзячна лёсу: новае спатканне,
Але без нас сумуе дзеда хата.

Мне не забыць ніколі гэты край -
Майго дзяцінства непаўторны рай,
Тут людзі шчырасцю, дабром бататы.

13

Тут людзі шчырасцю, дабром багаты.
І помніцца, як у цудоўным сне:
Чыгункі грукат, на ўскрайку хата...
Ды толькі родных не хапае мне.

Туды трымаю свой жалобны шлях,
Дзе душы родныя знайшлі прытулак,
Бо праз гадоў бязлітасных віхуры
Боль непамернай страты не пагас.

Тым болем падзялюся я з сасною,
Душою аб'ядналюся з раднёю:
Тут колішняя добрая сям'я.

Тут продкаў маіх слаўная зямля,
Дзе дзверы хата родная адчыніць.
Тут слаўная зямля маёй Айчыны!

14

Тут слаўная зямля маёй Айчыны!
Нашчадкі ўдзячныя жывуць табою:
Ларыса, незвычайная жанчына,
І Аляксандр, з багатаю душою.

Сустрэнемся прыветнаю вясною,
Уваскрэсенню Хрыстову будзем рады.
І спраўдзяцца нязвыклай навіною
Тут колішнія добрыя абрады.

І сэрца захлынецца асалодай,
Бо знойдзена цудоўная нагода
Вярнуцца да калыскі нашай долі,

Адчуць абуджаных палёў раздолле,
Застыць у яднанні трапяткім з табою,
Мой родны кут, збалелаю душою.

15

Мой родны кут, збалелаю душою
Люблю цябе, адвечны мой куток.
Успамінаю маці маладою
І поклічы буслiныя здалёк.

Трывожыць мой прыглушаны спакой
Лістоў асенніх дзіўны карнавал.
Тут дыхаю цяплом і дабрынёй,
Дзе ў бярозках зелянее вал.

Усім дзякуй за цудоўныя імгненні.
Тут шчырасць і святло заспакаення
У вачах заціхлых стомленай жанчыны.

Я не спяшаюся, хоць сціхла свята:
Тут людзі шчырасцю, дабром багаты.
Тут слаўная зямля маёй Айчыны!

## Навасад Зінаіда

# КОБРИНУ

Не простым языком, не простыми словами
О тебе бы, мой Кобрин, суметь рассказать,
Красоту, что семью шлифовалась веками,
Мне бы сердцем своим и душой передать.

Площадей твоих, улиц родное дыханье,
Знаменитый музей и церквей добрый знак,
А влюбленных для встреч и для нежных признаний
Приглашает любезно старинный наш парк.

В час труднейший у Мухавца плакали ивы
Над погибшими в страшных кровавых боях,
А березки, каштаны и липы красиво
Всей роднёй привечали победный наш шаг.

Город-труженик! Память свою осторожно
Я листаю, бывая в других городах,
Вдалеке от тебя не грустить невозможно.
Здесь Суворова след утвержден навсегда.

Ты и молод, и сед, здесь приветливо каждый
Свою руку протянет навстречу друзьям.
Если были у нас хоть случайно однажды,
Вновь сюда возвратиться захочется вам.

Мне без Родины золото мира ничтожно,
Ведь по милости Божьей даны нам края,
Где душой прорастаем своею и кожей,
Город мой, Беларусь дорогая моя!

# ЧАСТИЦА РОДИНЫ МОЕЙ

Посмотрите! Кобрин наш любимый
Обновился, весь похорошел!
Он и раньше был неповторимым,
А теперь жемчужинка уже.

Аквапарк, ледовая арена.
Городской наш парк, амфитеатр –
Всё прекрасно, очень современно,
Кто трудился здесь - наш друг и брат.

А река-то как преобразилась!
А гребная база, стадион ...
Дружбы улица соединилась
Вдруг с мостом, что классно возведён.

Как цветок, для праздника раскрылся
Город славный, город мой родной,
Он мгновенно видоизменился,
Мы должны беречь его, друг мой!

Отворим сердец наших засовы
Для людей хороших - для гостей.
Это новый город, это новый
В отраженье улиц, площадей!

Здесь людей сердечных очень много.
Труд нелёгкий всех объединил.
За надежд свершенье, слава Богу,
Что он этот труд благословил.

Средь забот и трудностей суровых
Воплощенье множества идей.
Это новый город, это новый!
Он частица Родины моей.

# ПОКЛОН ТЕБЕ!

Поклон тебе, земля родная,
Где зреют в поле колоски
И ветром рожь волну роняет
В ромашки - солнышка цветки.

Где свежесть будущего хлеба,
Сверчки блистают, василёк.
Прелестно синий цвет у неба
В аренду взят на летний срок.

Поклон, тропиночка витая,
Из леса вышедшая тут,
Всё то же поле огибая,
Вплелась мне в сердце на версту.

Поклон осенней позолоте,
Чудесной зимней белизне
И всей божественной природе,
Что расцветает по весне.

Моя счастливейшая участь
Родиться здесь, где мирный труд,
Под чистым небом Беларуси
В тепле проснуться поутру.

За красоту родного края,
За солнца свет, за дух и плоть,
За колос хлебный урожая,
За то, что жизнь благословляешь –

За всё тебе поклон, Господь!

## Я С ТОБОЮ...

Снова я с тобою, мой любимый
Берег восхитительной реки,
Здесь такой восторг неповторимый –
Осени божественной мазки.

Ива об ушедшем плачет зное,
Ветер выстилает камыши,
Травка нарядилась желтизною,
Птицы улетели, ни души...

Солнышка внезапно луч прорвался,
Красит лист невидимой рукой,
Дождичек немножко задержался,
Чествует нас милостью такой.

Облако волшебной колесницей
Речку проплывает всё быстрей.
Сказка наяву с рожденья длится.
Нет земли красивее моей!

Тишь вокруг, таинственность, прохлада...
Небу поклонюсь за этот дар.
Мне других красот совсем не надо,
Здесь моя душа и сердца жар!

Здесь сердечно радуюсь и плачу,
Здесь простой души моей полёт.
Родина! А что же это значит?
Значит, что люблю я свой народ.

Значит, что люблю свой уголочек,
Дивные озёра и пруды,
Поле, лес и каждый бугорочек –
Я без вас, что речка без воды.

## Ніжнік Ігар

# КОБРИН – ГОРОД КРАСОТЫ

Конечно, каждому родней
Тот город, где родился ты,
И мне всех городов милей
Мой Кобрин – город красоты.

Как чувства все мне передать?
Я слов таких не нахожу.
Их сердцем можно подобрать:
Весьма тобою дорожу.

Ты город сказок, небылиц.
Ты город счастья, доброты.
Ты город милых, светлых лиц.
Ты город всей моей мечты.

Конечно, каждому родней
Тот город, где родился ты,
И мне всех городов милей
Мой Кобрин – город красоты.

# МОЙ ГОРАД

Кобрын, мой горад, радзіма мая!
Як паважаю, люблю цябе я!
Нават не верыцца: столькі вякоў
Ты ўжо адмераў і столькі шляхоў!

Колькі няшчасця і гора, бяды
Ты перажыў, перамучыўся ты.
Кобрын, у час ліхалецця, вайны
Колькі людзей недалічваўся ты!

Слёзы жалобы, святы перазвон
Толькі ўзмацнілі тваё хараство.
Адбудавалі – і зноў ты расцвёў.
Страшна падумаць: сямсот ужо гадоў.

Хоць невялікі – утульны, зялёны.
Кобрын мой родны не знікне ніколі!
Светлым, прыхожым і чыстым такім
Я ганаруся куточкам сваім.

## Нявесценка Васілій

# МОЙ ГОРОД КОБРИН

Иду переулком знакомым,
Каштаны свечами цветут.
Мой город, ты самый красивый,
Везде чистота и уют,

Приубраны скверы и парки,
Аллеи вокруг площадей,
Широкие двери вокзалов
Открыты для наших друзей.

С моста Мухавца я любуюсь
Церквями, теченьем реки
И думаю: трудятся люди,
И это - мои земляки!

Деревья прикрылись листвою,
Здоровьем вздохнула земля,
Всегда в эту пору весною,
Страдают влюблённых сердца.

Я вижу приятные лица,
Улыбки и радостный смех.
Мы можем сегодня гордиться:
В труде своём видим успех!

И этот успех очевиден,
Но Кобрин - мне дорог в другом ...
Он запахом детства мне близок,
Пульс Родины вижу я в нём.

## Піваварава Юлія

### ДЗІВІН

Зноў казку чароўную шэпча вецер,
І з выраю птушкі дадому ляцяць.
Пра Дзівін, при дзіўнае дзіва на свеце
Сягоння мы будзем Вам песні спяваць.

Ён часта нам сніцца ў дальняй дарозе
І шэптам бярозак развее тугу,
Даруе ўсё, заспакоіць у трывозе,
Пад голаў паложыць прастор мурагу.

Тут сэрцу нам кожная вулачка люба,
То ў поле ў ранні яна прывядзе,
То раптам заверне да возера Любань,
Дзе лебедзь бялюткі плыве па вадзе.

Мілуюцца хвалі пад сонцам пяшчотным,
І чайкі, як квецень рамонкаў, ляцяць.
Жыццё падаецца такім бесклапотным
Для двух закаханых, што ў чоўне сядзяць.

А восень надыдзе - вяселле згуляюцъ.
Так продкі рабілі, і мы робім так.
Як хораша ў Дзівіне людзі співаюць,
Аж ногі міжволі прытуптваюць у такт.

## ЛЮБАНЬ

Майму сэрцу аднолькава любы
Хрусткі снег, ручаёў перазвон,
Над прачнуўшымся возерам Любань
Гоман птушак і смех наўздагон.

Першы промень сплятаецца з хваляй -
Мудрагелісты выйшаў узор.
Наша возера многія хваляць,
Як убачаць, то помняць з тых пор.

Мне таксама яго не забыцца.
І аднойчы у чужой старане
Зноў прасмолены човен прысніцца
І юнак, што кахае мяне.

## Пучык Ніна

## МАЛЕНСТВА БЛАСЛАЎЛЁНЫ КРАЙ

Сцяжынка ўздоўж поля васільковага
Бяжыць расой краплістаю, згубіўшыся ў палыне.
Былінкай гнуткай, позіркам дакорлівым
Дадому кліча вёсачка мяне.

Завядзі мяне, сцяжынка, як калісьці
На сунічную паляну ў Божы Дар.
Дай там водарам магічным наталіцца
І спакоем, як жывільная вада.

Сунічнік той на ўзгорку невысокім
Пазёмкамі матуля называла,
Бо зямля паіла шчодра сокам,
Гаючай сілай гронкі налівала.

Зарасніку бэзу аддам усе трывогі,
Знайду прытулак там няздзейсным надзеям.
Засыпанай пялёсткамі дарогай
Прайдуся па жыцця свайго падзеях.

Белая замець бэзу духмянага
Белай надзеяй вярэдзіць да слёз.
З ільнянога поля палатнянага
Вытканы маёй дарогі лёс.

Маленства бласлаўлёны край,
Прабегчыся дай па лугавым кіліме,
Прыпасці зноўку да крыніц дабра,
Адчуць сябе часцінкаю Радзімы.

## ВЯСКОВЫЯ СНЫ

Пагаслі ліхтары на сонных вуліцах,
Вёска патанула ў цішыні.
Туман грывасты на галінках туліцца
Ды зоркі мігацяць удалечыні.

Спавітая гаючым сном
Заснула вёска аксамітнай ноччу.
Накрытая раскідзістым крылом
Дабра і шчасця сваім людзям хоча.

Сніцца хлебаробам залатая ніва,
Высакародны колас гнецца да зямлі.
Натруджаныя рукі іх руплівыя
Спрадвек шчыруюць на святой раллі.

Выспелы вусаты, паўнаважкі колас –
Узнагарода лепшая для іх.
Роднае зямліцы звонкі, чысты голас
Дзіўнаю мелодыяй радуе ім слых.

Ледзьве першы промень світанковы
Жыватворнае цяпло абрыне на палі.
Расплюшчыць вёска вочы валашковыя
І прывітае шчодры дар зямлі.

# ДАРОГІ

З першага кроку ад роднага дома
Пачынаюцца ўсе дарогі.
Ці шчаслівыя, - лёсу вядома, -
Ці напоўненыя трывогай.

Ціхім крокам насустрач марам,
Што здаліся святымі з свяцейшых,
Шла нясмела ў дарожным марыве
І надзеямі сэрца цешыла.

«Не спадзявайся, а ідзі», - казалі мне
Бязмежныя й бясконцыя дарогі.
І павярталі да бацькоўскага парога,
Дзе сум блакітных незабудак у акне.

У агародчыку гаючы водар мяты
Развярэдзіў мне да слёз душу.
І сцяжынку росную да роднай хаты
На ўсіх дарогах у сэрцы я нашу.

## Сабчук Ганна

# РАДЗІМА

Памятаць жадае кожны
Горад Кобрын, пыл дарожны,
Небасхіл такі прыемны,
Прыгажосць не блік дарэмны.

Нарадзілася ў месцы цудным:
І прыемным, і прывабным,
Хоць маленькі горад Кобрын,
Аднак у вобласці ён зграбны.

Школаў шмат і цудных крамаў.
І светлых хапае храмаў,
Гістарычныя музеі,
Разнастайныя падзеі.

Дом культуры рамантуюць,
Аквапарк ужо будуюць,
Розных дасягненняў будзе,
Пабудоў яшчэ прыбудзе.

Ганарыцца будзем гуртам,
Што наш Кобрын разнастайны,
І сучасны, і магутны,
Позірк нам знаёмы патайны.

Няма вуліцы бліжэй,
Па якой заўжды хаджу,
Раніцой і кожны вечар
Я на родны плот гляджу.

Шмат чаму з’яўляюся сведкам.
Я Радзіму так люблю!
Ты калыска, горад Кобрын,
І таму я тут жыву!

# ПАСЁЛАК ФРУКТОВЫ

Паміж Дзіцячай вёскай
І вёскай Мазуры
Пасёлак прытаіўся,
Дзе мары ўсе мае.

І казачная назва,
І яблык чую пах,
Мянуецца Фруктовы -
Чытаю на вачах.

Праз рэчку пралягае,
Што Мухаўца прыток,
І кожнае дзіцяці
Садоў усіх знаток!

Бо яблык, грушаў смачных
У гэтым садзе ёсць,
І баба з дзедам нават
Успомняць маладосць.

Асабовая лазня, невялікая ферма,
Лясныя масівы, зялёныя палі,
Вось гэткія цуды, прыемная радасць
У аснову пасёлка даўно заляглі.

Каля роднага дома нашага пралягае,
Да Брэста вядзе, мяне захапляе.
Калі вакол седзячы гляджу на палеткі,
Так люблю я палі і цудоўныя кветкі.

Ва Фруктовым калі пабываў ты аднойчы,
Запамятай, што прыедзеш ты тройчы!
Прыгажосць, зеляніна, утульнасць і ласка -
Родны кут мой, Фруктовы, ты мара і казка!

## Салей Іна

# МОЙ ГОРОД

Старый Кобрин, город древний -
Вырос ты среди веков.
Не боялся нападений,
Страшных недугов врагов.

На берегу реки глубокой,
С судоходною водой,
Крепостью стоял высокой,
И справлялся ты с бедой.

Загляни в людские души,
В них - признанье и любовь.
Ты, мой Кобрин, самый лучший
Средь белорусских городов.

## Сацук Алесь

# РОДНОЙ ГОРОД

В дни невзгод и в праздничном уборе
Словно витязь, зорко смотришь вдаль,
Ты стоишь у Мухавца в дозоре,
Наш любимый город-юбиляр!

Твоих улиц ровное теченье,
Свежесть парка, окон витражи.
Здесь прошли истории мгновенья,
Путь Суворов к славе проложил.

Сколько раз землю твою поганил
Лютый ворог, нёс с собой позор,
Но всегда на поле ратной брани
Ты давал захватчикам отпор.

Снова ты в строю на мирном марше
Вместе с нашей Родиной большой.
Все сильней становишься и краше
С каждым годом, город наш родной.

Над тобою ярче солнце светит,
Все невзгоды выдержал не зря,
И сейчас над улицами ветер
Развевает флаги Октября.

Смело в завтра Кобрин наш шагает
И на труд, на подвиг и на бой -
Хлебом-солью всех гостей встречает
Вечно юный город и родной.

## Сацук Таццяна

# ПАКЛАЎШЫ СЭРЦА НА ДАЛОНІ

Мой родны край, мая старонка,
Дзе свеціць сонейка і месяц малады,
Дзе льюцца песні матчыны так звонка,
Зачараваным лугам бягуць мае гады.

Паклаўшы сэрца на далоні,
Я праўду ў вочы гавару.
Няма на свеце больш пашаны,
Чым жыць на шчасця берагу.

Тут жураўліны крык агучвае паветра,
Звініць дзіцячы смех у дварах.
А неба чыстае хвалюе душу
І мір такі, што слёзы на вачах.

І хочацца зноў бегчы па скракатым лузе
Насустрач шчасцю, лёсу, грамадзе
Да той бацькоўскай хаткі ля бярозкі,
Што бачу ўсё на яве і ў сне.

## Сацута Наталля

# ПА-НАД РОДНАЮ СТАРОНКАЙ

Па-над роднаю старонкай
Наша песня льецца.
Смех, вясёлая гамонка
Навакол нясецца.

Усіх сардэчна бачыць рады
І гасцей шануем.
Гэй, заходзьце ў нашу хату
Смачна пачастуем.

Хай лагодным сонца будзе,
Поле з ураджаем.
Дабрабыту добрым людзям
Ад душы жадаем.

Хай заўжды гармонік грае
І пяецца песня
Шчасцем сэрца напаўняе
Роднае Палессе.

## Сідарук Анжаліка

# В МОЁМ ГОРОДЕ ОСЕНЬ, ТУМАН, ЛИСТОПАД

В моём городе осень, туман, листопад.
Я тихонько брожу по пустынным аллеям,
Улыбаюсь друзьям, говорю невпопад
И признаться в любви своей к людям не смею.

Я люблю этот город, как любят свой дом,
Сохраняя в нём добрый уют и порядок.
И хочу рассказать я несмелым стихом,
Как люблю кобринчан, что живут со мной рядом.

Приезжайте в наш город, он славен трудом,
Полюбуйтесь его площадями и парком.
Вы поймёте, что значит радушный приём,
И, конечно, друзей обретёте вы в нём.

Кобрин наш, обновлённый и чистый, и ясный,
Даже в самые хмурые дни он прекрасный,
Я люблю этот город, он мне с детства родной,
Пусть он всех привлекает своей красотой.

## Скрашчук Аляксандр

# МИЙ ДЫВЫН

Кала озыра дывного Любані
Стоїть дывнэ поліськэ сыло.
Воно е навмылішэ за всіх мыні:
Там дытынство мое прошло.

Кажнэ місцэ в ему е за риднэ мні,
Кажна вулыця, кажный куток.
Іхні йменя хоришчы на всій зымні:
Рыбынь, Ратыньска, Чэмыр, Лазок.

О, мий Дывын, я гондэ знов.
Тыбэ я нызабув, в души своій лылію,
Як батька свого бырыжу й шаную, мий Дывын,
Ты - радость, ты и смуток, ты - надия!

Гондэ хлопцямы босымы бігалы
Аж до вэчора - от було діл.
До дывчэт залыцелыся мніго мы.
Но згадаю, и вжэ молодій.

Пороз'іхалыся хлопцы хто куды,
Алы раз но на рік в одын дэнь
Зобыримось на озыры Любані
Заспываймо дывынськых пысэнь.

О, мий Дывын, я гондэ знов.
Тыбэ я ны забув,в души своій льшію,
Як батька свого бырыжу й шаную, мий Дывын
Ты - радость, ты и смуток, ты - надія!

## Слабуха Аляксей

# СВЯТА ДАЖЫНАК

Сёння мы на адпачынку,
Будзем весяліцца.
Сёння свята ў нас - «Дажынкі»,
Ёсць чым ганарыцца.

Працавалі ўсе мы ўпарта
На нашай зямліцы.
Ураджай вырас багаты,
Не грэх весяліцца.

Усё да зерня мы сабралі,
Жыта і пшаніцу.
Пячы будзем караваі,
Будзем весяліцца.

Будзе хлеб і будуць песні,
І да хлеба скварка,
І, вядома, хоць ты трэсні,
Будзе да іх чарка.

Славім рукі залатыя
Сейбітаў і жнеяў,
Хто змагаўся са стыхіяй,
Хто сушыў і веяў.

Хлебу песню заспяваем,
Нашаму багаццю
На дажынках, фестывалі,
На ўрачыстым свяце.

Ляцяць песні ў паднябессе
Па ўсёй акрузе.
Пра людзей руплівых, дбайных
Роднай Беларусі.

## Сушко Эмілія

***

*Давайте молча Родину любить...*
*Л. Якушева*

Давайте молча Родину любить.
Любить ее, а не играть словами,
Чтоб в суете бесплодной не забыть
О небе, что у нас над головами,

О поле, о луне и о реке,
Что тихо плещет в утреннем тумане,
О роще, что белеет вдалеке,
О том, как дождь по крышам барабанит,

Как солнце вечером садилось в камыши
И как сияли звезды - взор печали,
Как в зябкой просыпавшейся тиши
Напевы птиц симфонией звучали.

Чтоб не забыть о подвиге солдат,
Не позабыть, что люди мы - не звери,
Что Родина - ценнейший в мире клад
И он не может нами быть утерян.

## Фалькоўскі Дзмітрый

# ОЧЕРЕТ МЕНІ БУВ ЗА КОЛИСКУ

Очерет мені був за колиску;
В болотах я родився і зріс.
Я люблю свою хату поліську...
Я люблю свій зажурений ліс...
Що там тропіки,
що там пампаси? –

Загляніць - но у пущу до нас!..
Я аддав би за неі адразу
І Тібет,
і Урал,
і Кавказ...

## МОІ ДАЛЕКІ, РІДНІ СЕЛА!

Мої далекі, рідні села!
Ніяк, ніяк вас не забуть...
Мабуть, тому, що невесела
Була од вас у місто путь...

Мабуть, тому, що всю дорогу
Таки нелегко було йти,
І оббивать чужі пороги,
І обминать чужі хати.

І от тепер, коли утома
В своїх обіймах пригорта,-
Мені так хочеться додому,
Де коливаються жита...

Де льон зелений між вівсами
Такий замислений цвіте
І голубими головками
Мені нагадує дітей -

Де гречка буйна і шумлива,
Як невгамовний битий шлях,
Рожевим цвітом соромливо
Знялась на радісних полях.

Не сходять ранки, щоб умерти
І знов воскреснути в росі
Серед хмарин напівроздертих,
Серед пташиних голосів;

Де соловей виводить скерцо
У надвечірній тишині,
Де все таке близьке для серця,
Де все таке близьке мені.

***

Пройшли сумніви і вагання,
Пройшли, як сон, як сивий дим,
Як перший запал молодий,
Як тінь забутого кохання.

Ах, день один... один лиш день
Серед борів своіх пожити...
О, скільки міг би я створити
Легенд нових, нових пісень!..

Та знаю я що вже ніколи
В свое Полісся не прийду,
Не вдарю пісню молоду
Об синь гаів, болот і поля.

Не жди ж, мій батеньку, мене
І ти, від злійднів жовта мати:
У чаднім місті кострубато
Спалю життя свое сумне.

І вже ніколи мої ноги
Не вмиють роси осоки,
І упаде мій спів стрункий
На перехрещені дороги...

Мені тут сумно, сумно так...
На скронях - ніби мох на соснах.
І сниться хата, в хаті кросна,
І лід роздертий в болотах.

...Весна... Болото розлилося,
І, певне, батько мій в човні
Гайса... і шле привіт мені
Своім розчубленим волоссям.

## Цялічка Мікалай

### КОБРИН

В шелестящем лиственом наряде
На втором от Бреста рубеже
Город Кобрин встал на автостраде
И стоит всегда настороже.

Здесь в боях империи и классы
В прошлом истекали кровью ран,
И войны Отечественной асы
Уходили в небо на таран.

Средь штакетных крашеных заборов
Низкоросл, отважен и двухжил.
Здесь поныне Александр Суворов
Самый знаменитый старожил.

## Цярэнцьева Наталля

### МОЙ ГОРОД

Города есть, конечно, богаче,
С мишурой из витрин всевозможной,
Ну, а мой, пусть немного иначе,
Но зато без него невозможно!

Где-то улицы-караваны
Проплывают в огнях! Аж больно!
А в моём, - зацветут каштаны
И от свеч их светла довольно!

Где-то пальмы и шум океана!
Небоскрёбы глотают тучи!
Но нет краше берёзки стана
И реки моей нету лучше!

Этот город мне дан в наследство,
Пусть он даже не самый-самый!
Только здесь моё бегает детство
И ласкают ладони мамы.

От того он мне всех дороже!
Вместе с ним я шагаю и старюсь,
Прирастая к нему всей кожей,
Навсегда в нём стихом останусь!

***

Город встречал нас радостным небом!
Солнцем весёлым, вокзала тушем!
Робко ходил он за нами следом
И ухом улиц признанья слушал.

Он стал причастен к большому счастью
Двоих влюблённых, к сплетённым душам,
Укрыл собою от злых напастей
И все тревоги в сердцах разрушил!

Город обнял нас шумной толпою,
Звоном трамвайным пел, как с эстрады!
Стал для нас пристанью, светлой судьбою,
Сотни витрин нам двоим были рады.

Он провожал нас притихшим другом,
Дома нахмурив, ссутулив плечи,
Мы расставались с ним и друг с другом,
А он огнями мигал вслед! До встречи!

## Чайнікаў Міхаіл

Во дворе шумели пацаны,
Юность по Суворовской катилась.
Пыль гребли клешёные штаны.
Юность... неужели мне приснилась?

Мне приснились танцы в РДКа,
Первый поцелуй у старых пушек.
И кружились в парке до утра
Мы, а вместе с нами наши души.

Обгоняя утренние сны,
Мы бежали, пел знакомый кто-то.
Пыль гребли клешёные штаны,
Что ж была тогда такая мода.

Я иду по улице своей.
Здравствуй, мы учились вместе в школе,
Там еще растет у входа ель?
Может, на второй этаж заглянем, что ли?

Во дворе шумели пацаны,
Юность по Суворовской катилась.
Эти пацаны уже не мы.
Неужели юность мне приснилась?

## Шафранская Ксенія

# НА ПРАСТОРАХ ЗЯМЛІ БЕЛАРУСКАЙ

На прасторах зямлі беларускай
Горад мой старажытны стаіць.
Родным Кобрынам я ганаруся,
У ім утульна і радасна жыць.

Усё мне люба ў горадзе гэтым:
Вуліц шум і праспектаў прастор.
Цешыць душу вясёлка ў небе,
Саграваe цяплом родны двор.

Усім на радасць растуць тут палацы,
На пацеху дарослым і дзецям.
Быццам мы апынуліся у казцы,
Самай лепшай казцы на свеце.

Людзі тут працавітыя, добрыя,
У бядзе дапамогуць адразу.
Запрашаю сяброў усіх у госці я,
Пагуляем па Кобрыну разам.

## Ярмалюк Людміла

***

Гэта шчасце - на Радзіме жыць
І паветрам чыстым поўніць грудзі.
Выбіраць з жыццёвых пуцявін
Тую, што карыснай стане людзям.

Гэта шчасце - на Радзіме жыць.
Гадаваць дзяцей пад светлым небам.
Слову роднаму радком служыць
І трымцець душой ад паху хлеба.

Гэта шчасце - на Радзіме жыць.
Восень сустракаць з вясной у сэрцы.
І не шкадаваць, што час бяжыць,
Бо пад родным сонцам можаш грэцца.

Гэта шчасце - на Радзіме жыць.
Прачынацца без нуды і болю.
І зямлёй бацькоўскай даражыць,
Прысягнуўшы ёй у сваёй любові.

## Ярмашук Мікалай

***

Люблю твои я улицы и скверы,
Тенистый парк и облик Мухавца.
Ты настежь всем распахиваешь двери,
Кто в мир и дружбу верит без конца.

И пусть под солнцем пролетают годы,
Лишь об одном, мой Кобрин, знаю я,
Что ты со мной навеки, милый город,
Мой город Кобрин - родина моя.



# III. УНІКАЛЬНЫ КУТОК БЕЛАРУСКАЙ ЗЯМЛІ

## Дубоўка Уладзімір

### НА АЎТОБУСНЫМ ВАКЗАЛЕ Ў КОБРЫНЕ

Трымае маці ладны клунак,
А сын - тры кніжачкі ў руцэ.
- Купілі сыну падарунак?
- Ды не, злавіў ён у рацэ!

- Як так? Жартуеце вы, пэўна?!
 - Якія жарты! На кручок
Злавіў ён шчупачкоў нядрэнных,
Папаўся добры ментузок.

Тады ж мяне і папрасіў ён:
«Прадай іх, мама, купім кніг!»
А збоку сын стаяў шчаслівы,
Перагартаў старонкі ў іх...

- Ды колькі. ж год табе, сыночак?
- Дзевяты сёлета пайшоў... -
Дапытліва прабеглі вочкі
Каля мяне, маіх сяброў...

А тут аўтобус.
- Час вам добры! -
Мы адвіталіся ў адказ.
Прыгожы незвычайна Кобрын
Пакінулі на доўгі час...

Яго красою сэрца поўна,
Яна ўсюды тут, наўкол.
Сюды і хлопчык той цудоўны
З сваімі кніжкамі ўвайшоў.

З малецця ён сваёй рукою
Кладзе сцяжынку да святла.
На свеце самае святое усё,
Што праца набыла.

## Дудзюк Зінаіда

# ПАДДАНЫЯ КАХАННЯ
*драматычная паэма*

### Дзейныя асобы

Бельскі Хведар — князь.
Ганна — князёўна з Кобрынскіх.
Кобрынскі Іван — князь, брат Ганны.
Хадора — княгіня, жонка Івана Кобрынскага.
Лукомскі Іван — князь.
Алелька Міхал — князь.
Гальшанскі Іван — князь.

Хадкевіч — князь.
Казімір IV — вялікі князь літоўскі і кароль польскі.
Дзямід — пан.
Слугі, варта, баяры, віжы, каты, воі, людзі на вуліцы, у карчме і шынку.

## ДЗЕЯ ПЕРШАЯ

### БЕРАСЦЕЙСКІ ЗАМАК

1480 год. Каралеўскі баль. Весяляцца госці. Зала зіхціць ад мноства свечак, шыкоўных убораў, залатых і дыяментавых упрыгожанняў. Гучыць урачысты гімн.

*Хор*

Уздымем чаркі за герояў,
Што ў бітвах ворагаў змаглі,
Іх раны час няхай загоіць
І слава роднае зямлі.
І за жанчын уздымем, госці,
Кілішкі поўныя віна!
Квітнець іх вечнай маладосці
І радаваць заўсёды нас.
Святкуйма мірную часіну,
Забудзьма страты і трывогі,
Няхай непрыяцелі згінуць
І згубіць зло да нас дарогу.

На авансцэне з’яўляецца сям’я князёў Кобрынскіх: князь Іван, ягоная сястра князёўна Ганна і жонка Хадора.

*Хадора*

Цудоўны баль!
Князі з Літвы ўсяе
У Берасце сабраліся, напэўна.

*Кобрынскі*

Баль каралеўскі!
Вось дзе папяе,

Паскача панства
Аж да трэціх пеўняў.

*Хадора*

А вунь князёўны нашае жаніх,
Князь Хведар Бельскі.
Ён сюды спяшае...

*Кобрынскі*

Як рады я за нашых маладых.
Няхай ім Бог спагадна памагае.

Да Кобрынскіх падыходзіць князь Бельскі, цалуе рукі жанчынам, вітаецца з князем Іванам.

*Бельскі*

Шчаслівы бачыць у здароўі ўсіх!
Бязмерна рады з Ганнаю сустрэцца!
Хачу наблізіць дзень, каб назусім
З каханаю з'яднаць жыццё і сэрца.

*Кобрынскі*

Адбудзем па Вялікадні вяселле.
І шчасця вам — на доўгія гады.

*Бельскі (цалуе рукі Ганны)*

Палац мой, адзінотаю заселены,
Каханнем нашым ажыве тады.

*Ганна*

Ліста чакала — выпала спатканне...

*Бельскі*

Дазвольце мне з маёй нявестай танец...

Бельскі і Ганна ідуць у гурму гасцей. З'яўляецца князь Лукомскі з пляшкаю ў руцэ.

*Лукомскі*

Ох, і выпіў бы я,
Ды кілішка няма.
Хілю, хілю — не цячэ!
Каля сэрца пячэ!

*(Узрадавана заўважае князя Кобрынскага з жонкаю, княгіняй Хадорай)*

Князь Кобрынскі з княгіняю Хадорай!
Вітанне вам з Лукомскае зямлі!

*Кобрынскі*

Здароў будзь, князь Іван!
Яшчэ ёсць порах!
І ворагаў зашмат мы не змаглі!

*Лукомскі*

Згадайма, княжа, нашыя паходы!
Як мы калісь рубалі крымчакоў!
Ты добры вой...
Няма ў дзяржаве згоды.
Кіруе рада здрадніцкай рукой...

Кобрынскія і Лукомскі ідуць у гурт гасцей. На авансцэне зноў з'яўляюцца князь Бельскі і князёўна Ганна.

*Бельскі*

Мая нявеста! Сам сабе не веру,
Што між снягоў, між халадэч зімы
Шчаслівы па-юнацку я без меры,
Мяне няма ўжо — ёсць на свеце мы.

*Ганна*

Князь Хведар, радасць я хіба схаваю?
Мне светла ў тыя вочы пазіраць,
Якія сню, якія ўспамінаю,
Якімі кожны крок мне вымяраць.
У тлуме часу і турбот дзявочых,
У мроіве прыдуманых шляхоў,
Чакала шчасця я скрозь дні і ночы...
І немінуча, ўрэшце, ты прыйшоў!

*Бельскі*

Князёўна Ганна, летуценны промнік,
Душу лагодзіш, радуеш пагляд
Нязначным жэстам, позіркам няўлоўным,
Што адтае замерзлая зямля.

Развеснавее — зладзіцца вяселле.
Пустуе пад Смаленскам мой палац.
Каханнем мы з табой яго заселім,
Яскрава дзень той бачыцца здаля.

Збоку за Бельскім і Ганнай зайздросліва назірае пан Дзямід.

*Дзямід (сам сабе)*

Прыгожая князёўна, што й казаць!
Хацеў бы замуж я такую ўзяць,
Каб з Ягелонам раптам парадніцца.
Такое шчасце толькі ў сне прысніцца!
Але дарма! Яна свой лес абрала.
І да мяне князёўне справы мала.

Пан Дзямід адыходзіць у цень, з'яўляецца князь Лукомскі, п'е нагбом з пляшкі, спявае.

*Лукомскі (набліжаецца да Бельскага і Ганны)*

Хілю, хілю — не цячэ!
Каля сэрца пячэ!
Князь Бельскі і цудоўная князёўна!

*Бельскі*

Мая нявеста.

*Лукомскі*

Ну, віншую, брат!
Нас лес шпурляе, праклінае, гоніць.
Я для душы ў віне шукаю спрат.
Табе шанцуе! І калі ж вяселле?

*Бельскі*

У траўні.

*Лукомскі*

Кахаеш, бачу, любую сваю!
Прысядзьма тут. Асушым гэта зелле
За будучую добрую сям'ю.
*(Садзяцца.)*
Князёўна Ганна Кобрынскага роду,
Зачараваны прыгажосцю я.

Хай у Літве не будзе переводу
Такім князёўнам і такім князям.
Слоў не стае, адно вачамі лыпаць
У захапленні застаецца мне.
Хачу з пантофлі прыгажуні выпіць
За хараство дзівоснае яе...

*(Становіцца на калена перад Ганнай, здымае з яе нагі пантофлік, ставіць у яго келіх, поднесены слугою, і з пажаданнем шчасця і здароўя выпівае.)*

Здароўя маладым і насалоды!
Багацця, шмат дзяцей, сумеснай згоды!

Да прысутных набліжаюцца князі Іван Гальшанскі, Міхал Алелька, Іван Хадкевіч і пан Дзямід.

*Лукомскі*

Горка! Горка!

*Алелька*

Пра што такая ладная гаворка?

*Лукомскі*

Пра маладых, шчаслівых, закаханых!
Князь Хведар Бельскі і князёўна Ганна
Пабрацца па Вялікадні павінны.

*Князі*

Віншуем! Шчасця! Добрыя навіны!

*Лукомскі (становіцца на калена, надзявае Ганне пантофлік)*

Ах, дзякую, цудоўная дзяўчына,
За цеплыню. Туга душу гняце,
Што наша занядбаная Айчына
Глядзіць з дакорам на сваіх дзяцей...
Ды гэта ўжо мужчынская турбота...

*Алелька*

Усіх прашу ласкава у суботу
На ловы ў пушчу.

*Бельскі*

З радасцю, сябры!

*Лукомскі*

Пры каралеўскім сённяшнім двары
Гэта, бадай, важнейшая работа.

*Дзямід*

А ў пятніцу прашу ўсіх на вячэру,
Шчаслівы буду бачыць вас без меры...

*Лукомскі*

Гасцінны дом чаму б і не наведаць?
Што застаецца нам? Вячэраць ды абедаць...

Лёкай падносіць келіхі з віном, князі ўздымаюць чаркі за маладых.

*Князі*

За нарачоных! Шчасця маладым!
Жыць сто гадоў, не сустракаць бяды!

*Лукомскі*

Хілю, хілю — не цячэ!
Каля сэрца пячэ!

Ганна і Бельскі кіруюцца да гасцей, Лукомскі, як зачараваны, ідзе следам.

*Дзямід (сам сабе)*

Адну князёўну Ганну толькі бачу,
І нездарма душа сумуе й плача,
Шукае паратунак у віне.
Яна ж — ніякай ўвагі на мяне...
Гальшанскі *(да Алелькі)*
Што з Ноўгарада добрага чуваць?

*Алелька*

Аціхлі наўгародцы, як трава,
Акружаныя войскам маскавітаў,
І пад прымусам прысягнулі ім.
А звон, што некалі на веча клікаў,
Завезены ў Маскву, стаў без'языкі.
Канец — рэспубліцы, няволя — наўгародцам!
Яны Літву чакалі, нібы сонца!

*Хадкевіч*

Дарма! Вялікі князь літоўскі Казімір
І не збіраўся ім на дапамогу.
Не хоча ён рызыкаваць людзьмі,
Не любіць ён ні войны, ні дарогі...

*Алелька*

А ў Ноўгарадзе нашы пабрацімы
За ўсё сваёй крывёю заплацілі.
І самі мы ў варожым атачэнні
Даседзімся! Паставяць на калені
Ці Польшча, ці Масква! Канец адзін!
Бяздольны будзе шчыраваць ліцвін
На ворага свайго, не на Радзіму,
Якая нас для волі нарадзіла.
Чужое войска стане ля дзвярэй,
Зямлю і нават душы адбярэ...

*Гальшанскі*

На тронах двух сядзіць вялікі князь,
Ды ўжо даўно адной ён служыць Польшчы.
Няхай Літву каму з сыноў аддасць,
Каб не было ліцвінам шкоды большай.

*Алелька*

Мы ўсе велікакняскія нашчадкі
Блакітнае Альгердавай крыві,
Вярнуць жадаем дзедаўскія спадкі,
Былую славу роду ажывіць!

*Гальшанскі*

Да Казіміра трэба нам пайсці,
Пакуль ён тут, у Берасці, на ловах.
І разам выйсце нейкае знайсці,
Каб не трываць наперад безгалоўя!

*Хадкевіч*

Да Казіміра!

Князі падымаюць келіхі са словамі: «За Літву! За Радзіму!» Выпіваюць і разбіваюць келіхі на шчасце.

## АЎДЫЕНЦЫЯ
## Ў БЕРАСЦЕЙСКІМ ЗАМКУ

Прыёмная святліца вялікага князя літоўскага і караля польскага Казіміра IV.

*Казімір*

Даў Бог мне шмат радні,
Ды не на радасць.
Так і макаю дзень пры дні
Братэрскай здрады.
На трон не ўсядзешся сям'ёй,
Як у карэту.
Гадую семера сыноў —
Сем канкурэнтаў.

*Слуга (уваходзіць)*

Тут праваслаўныя князі
Сустрэчы прагнуць.

*Казімір*

Даўно не бачыў іх. Вядзі!

Слуга кланяецца і выходзіць.

Жыццё, як багна!
З адною справішся бядой,
Другая — поруч!
І перамогай над сабой
Свой шлях азорыш.

Уваходзяць князі Алелька, Гальшанскі, Лукомскі Хадкевіч.

*Князі*

Добрага здароўя, гаспадар!

*Казімір*

І вам здароўя!
З турботаю якою завіталі?

*Гальшанскі*

Турбота ў нас адна, вялікі князь, —
У гаспадарстве землі заняпалі,

Лаціна вынішчае дух радзінны,
Сваёю мовай мкнецца аппладняць
Польскае панства мысленне ліцвінаў!

*Алелька*

Мы наўгародцам здрадзілі падманна!
Рэспубліка задушана Іванам!
А люд закатаваны ці ў выгнанні...
Літву чакае гэтакая ж доля,
Калі сябе абараніць не здолее
Ад маскавітаў, татарвы, палякаў...

*Казімір*

Папрокі слухаць прыкра мне ўсялякія!
Хто дужацца надумае з Масквою,
Наўрад ці застанецца з галавою!

*Лукомскі*

Вялікія князі Альгерд і Вітаўт
Не мелі звычкі страх з аглядкай блытаць!

*Хадкевіч*

А кожны бараніў сваю Айчыну,
Як і належыць ваяру і сыну.

*Алелька*

Калі ўладар старэе на пасадзе,
Яго краіна поўніцца бязладдзем.
Атручаны княжаты і паняты
Раскошаю, распустаю заўзятай!

*Казімір*

Ды ці Алельку іншых папракаць?
Хіба збяднела слуцкая зямелька?

*Алелька*

Твая велікакняская рука
Забрала Кіеў — спадчыну Алелькаў.
Намеснік твой гвалтоўна там кіруе,
Хоць Кіеў нездаволена віруе...

*Лукомскі*

Адмоўся, Гаспадар наш, ад пасаду
І перадай каму з сыноў уладу.

Няхай кіруе намі з ласкі Божай,
А мы парадай добрай дапаможам.
Наш будзе князь вялікі — малады,
А ты ў Кароне каралюй заўжды.

*Казімір*

Мае сыны яшчэ недараслі,
Каб кіраваць вялікаю краінай.
Адказны я за лес маёй зямлі,
Аддам пасад, як гэты свет пакіну.
Прадбачу вашы тайныя намеры!
Але для ўсіх аднолькавы закон.
Хто поўніць сэрца дзёрзкім недаверам,
Жыццё паставіў на здрадлівы кон.
Вы мне радня, а горай за чужых!
Ад вас — ні разумення, ні спагады!
Ці пад крыжом мой лес, ці на крыжы,
Ад вас заўжды чакаю толькі здрады!
*(Разгневаны выходзіць.)*

*Алелька*

Дарэмныя ўсе нашы намаганні.

*Гальшанскі*

Ды трэба ўсё ж шукаць выратавання
Для нашай занядбанае Айчыны.

*Алелька*

Дык не дамо ж ёй бессэнсоўна згінуць!

*Хадкевіч*

Не проста гэты вузел развязаць,
Патрэбна сілу сілай зваяваць...

*Алелька*

Кром сілы, ёсць у чалавека розум,
Патрэбна ўсё узважыць нам цвяроза...

*Лукомскі*

Каб не наклікаць на сябе бяды,
Кіруймася законамі заўжды.

*Гальшанскі*

Не месца тут для гэтакіх размоў...

*Алелька*

Пайшлі адсюль.

*Хадкевіч*

Даўно пара!

*Лукомскі*

Дамоў...

Усе выходзяць.

## ДОМ ПАНА ДЗЯМІДА Ў БЕРАСЦІ

Гаспадар частуе гасцей — князёў Алельку, Гальшанскага, Бельскага, Лукомскага, Хадкевіча. Слугі падносяць віно.

*Дзямід*

Вяльможныя князі, уздымем дружна чаркі,
Каб не было між нас павек ніякай сваркі!
Каб бараніць сябе, нам трэба паяднацца.
Уздымем чаркі зноў за еднасць і за брацтва.

*Алелька*

Да бездані вядзе Ўладар краіну,
І выйсця для Айчыны не відаць.
Аддаць пасад літоўскі нават сыну
Па-добраму не згодны Гаспадар.

*Бельскі*

І не магчыма ўжо трываць далей
Лаціну, здзек і нашае бяспраўе.
Напэўна, на чужыне лепш калець,
Калі вось так улада нас карае...

*Гальшанскі*

Вялікі князь залежыць ад падданых:
Падаткі, войска, поўная казна.
А ён міжвольна цешыцца падманам,
Нібыта абыходзіцца без нас.

*Хадкевіч*

Пара яму напомніць, што часова
Абраны быў аднойчы на пасад.
І нашы просьбы не пустыя словы!

*Гальшанскі*
А як гэта зрабіць? Мо скажаш, брат?
*Хадкевіч*
Ды Казімір нам прыклад падае,
Што ворагаў караць патрэбна смерцю...
*Лукомскі*
Між нас пакуль што ката не стае,
Хто б гэта здзейсніў. Мілы князь, прыкмецьце..
*Алелька*
Пакуль пасад займае Казімір,-
Нічога памяняць не зможам мы.
Жыць Казіміру — і гібець Айчыне.
Падумайце, што выбраць мы павінны?
*Лукомскі*
Хоць вас, сябры, я добра разумею,
Падняць руку на родзіча не смею.
*Алелька*
Па-хрысціянску, гэта грэх, напэўна.
А ці ж не грэх — краіну разбураць?
Ён брат нам, але ён і вораг крэўны,
Якога варта смерцю пакараць.
*(Да Бельскага.)*
Што скажа маладое пакаленне?
Ці не асудзіць нашыя памкненні?
*Бельскі*
Што прадзеды крывёю здабывалі,
Вялікі князь не руціцца ўтрымаць.
А войска зброю ў скрыні пахавала,
Нібы яму зусім турбот няма.
Таму намер ваш падтрымаць гатовы.
*Гальшанскі*
А дзе гэта зрабіць?
*Хадкевіч*
Найлепш было б на ловах,
Якія вельмі любіць Казімір.

*Гальшанскі*

Цяпер на ловы ён нас не запросіць...

*Бельскі*

Запросім мы!
У Кобрын, на маё вяселле з Ганнай.
А нам абдумаць трэба ўсё старанна...

*Алелька*

Хто возьмецца ажыццяўляць задуму?

Князі замаўкаюць.

*Дзямід (слугам)*

Віна сюды! Занадта стала сумна!

*Гальшанскі*

Прысуд Хадкевіч выканаць павінны,
Служыў ён пры Гаспадару у Вільні,
Дык ведае і звычкі, і парадкі,
На што Уладар наш асабліва падкі...

*Хадкевіч*

Я?..

*Алелька*

Чаму б і не?..

*Хадкевіч*

Што ж, дзякую за гонар!
Вялікі князь часцей
У ложку, чым на конях...
Давер вялікі. Ды цяжкі мой меч.
Хай Усявышні дапаможа мне...

*Лукомскі*

Заганны шлях — праз гвалт і беззаконне
Імкнуцца захапіць у княстве ўладу.
Злачынства душы вашыя палоніць,
Спыніцеся — адна мая парада!

*Хадкевіч*

Мы лёс Радзімы хочам перакроіць,
А князь Лукомскі тут за ўсіх мудрэй.
Адседзіцца — і выскачыць героем,
Каб да сканання весці ў п’янках рэй!

*Лукомскі*

Хадкевіча я на двубой не клічу,
Хоць ворагаў бязлітасна душыў!
Братазабойства мне не да душы...
*(Да Бельскага.)*
Жаніх няхай за крыўду не палічыць,
Што на вяселле не прыеду я.
Удачы і здароўя ўсім князям.
*(Выходзіць.)*

*Хадкевіч*

Сярод князёў хапае баязліўцаў.

*Алелька*

Не варта на Лукомскага крывіцца,
Ён з намі, наш, але занадта добры.
Уздымем чаркі за спрыяльны Кобрын!

*Дзямід*

Здароўя ўсім! За перамогу!

*Князі*

За ўдачу! За Айчыну! З Богам!

## КОБРЫНСКІ ЗАМАК

Вяселле князёўны Ганны Кобрынскай і Хведара Бельскага. Граюць музыкі, весяляцца госці. Праз сцэну прабягаюць слугі з пачастункамі. Уваходзіць вялікі князь Казімір са сваей дворняй. Князь Іван Кобрынскі з княгіняй Хадорай сустракаюць шаноўнага госця, усаджваюць на пачэснае месца. Гучыць вітальная песня Уладару.

*Хор*

Трымаецца наша дзяржава
Велікакняскай уладай,
Мудрасцю, праўдаю, ладам.
Вялікаму князю слава!
Ен дзеліць нашы трывогі,
Вояў вядзе ў паходы,
Як бацька разумны і строгі,
Кіруе сваім народам.

Заняты дзяржаўнай справай,
Ен служыць аддана Богу,
Не ведае стомы і змогі.
Вялікаму князю слава!
Слава! Слава! Слава!

Да вялікага князя набліжаюцца Ганна і князь Бельскі для баславення.

*Казімір*

Велікакняскаю воляю баслаўляю маладых
На доўгае і шчаснае жыццё!
Мінацьмуць хуткаплынныя гады,
Ды сэрцаў непарыўнае зліццё!
Лад у дзяржаве — і на сэрцы радасць!
З яднала іх чароўная вясна.
За тое варта чаркі нам падняць,
Каб згодна жыць і век не ведаць здрады
Горка!

*Госці*

Горка! Горка! Горка!

Маладыя цалуюцца. Дзяўчаты-чалядніцы водзяць карагод і спяваюць.

*Хор*

Салавейка ў гаі свішча
Ды сваю зязюльку кліча:
«Прыляці, зязюлька,
Да майго садочка,
Бо ў маім садочку
Большы лісточкі».
Маладзенькі ходзіць,
Маладзеньку просіць:
«Пераедзь, Ганулька,
Да майго татачкі,
Бо ў майго татачкі
Большая хатачка».

Раптам дзявочы карагод рассыпаецца, дзяўчаты са смехам і крыкамі: «Каравай! Каравай!» выбягаюць. Выходзяць усе госці. Застаюцца толькі князі Алелька, Гальшанскі і Хадкевіч.

*Хадкевіч*

Князі, за шчасце і за нашу ўдачу!
Ці пераможам, ці мо нас аплачуць...

*Алелька*

Трывожна мне. І сны ўвесь час цяжкія,
Хоць ведаю: нас падтрымае Кіеў.
І Ноўгарад, магчыма, адгукнецца,
Ды непрытульна і самотна сэрцу.

*Гальшанскі*

За шчасце! Перамогу і сяброў!
Здаровы будзьма!

*Алелька*

Будзьма!

*Хадкевіч*

Будзь здароў.

Выпіваюць. З'яўляюцца Ганна і Бельскі. Слугі падносяць усім поўныя келіхі.

*Алелька*

Сто першы раз — за шчасце маладых!

*Гальшанскі*

Жыць і кахацца доўгія гады!

*Дзямід (сам сабе, назіраючы з авансцэны за князямі)*

Пакуль князі змагаюцца за ўладу,
Панам наводзіць трэба свой парадак.
Як я хацеў бы ўзяць князёўну замуж,
Каб нарадзіць сабе княжат таксама!
Прыгожая князёўна. Праваронiў!
Ей Бельскі сэрца ўмомант запалоніў.
А калі я шапну віжам на вуха,
Што давялося мне пра змову слухаць?..
*(Таксама падыходзіць да маладых і віншуе са шлюбам.)*

*Князі*

За ваша шчасце! Горка!
Горка! Горка!

Маладыя цалуюцца. Князі і пан Дзямід па-змоўніцку выходзяць, пакідаючы маладых сам-насам.

*Хор (за сцэнаю)*

Хто там у цёмным лесе блукае?
Гэта Ганулька мамку гукае:
«Дзе ж ты, матулька, сёння жывеш,
Што на вяселлейка не ідзеш?»
І пачула Ганначка ціхі стогн:
«Змарыў мяне, донечка, вечны сон».
*(Ганна з Бельскім таксама выходзяць.)*
Хто там у цёмным лесе блукае?
Гэта Ганулька татку гукае:
«Дзе ты, мой татачка, сёння жывеш,
Што на вяселлейка не ідзеш?»
І пачула Ганначка ціхі стогн:
«Змарыў мяне, донечка, вечны сон».

Уваходзяць князь і княгіня Кобрынскія, заклапочаныя турботамі пра вяселле і гасцей.

*Хадора*

Здаецца, добра ладзіцца вяселле,
Хоць госці прытаміліся, бадай.

*Кобрынскі*

Нічога, па пакоях іх расселім,
Праспяцца, адпачнуць — і ўся бяда!
Аднак шкада развітвацца з сястрою.
Быў я ёй брат і бацька, што й казаць.
І сумна будзе, жонка, нам з табою,
Як забярэ князёўну нашу зяць.

Кобрынскія выходзяць. На пустой сцэне з’яўляецца Хадкевіч. Ён разгублены і ўстрывожаны.

*Хадкевіч*

Навошта я звязаў сябе зарокам?

Навошта пагадзіўся на злачынства?
Мне ўжо цяпер штоночы плаха сніцца!
Я заўтрага не бачу цьмяным зрокам...
Гатовы дзень і ноч маліць нябёсы,
Няхай памогуць зараз мне яны
Не згінуць вінаватым без віны.
Аддам сваю душу на волю лесу...
Мой востры нож, але рука слабая,
Баюся: сам я ад яго сканаю...
Вунь Казімір кіруецца сюды...
Як захаваць сябе мне ад бяды...

Хадкевіч хаваецца за шырму. Уваходзіць вялікі князь Казімір, вакол яго мітусіцца маўклівы слуга, памагае сесці, папраўляе адзенне.

*Казімір*

Слуга мой верны, ты радней ад брата!
Састарыліся разам мы няўзнак.
Стамляемся ад будняў і ад святаў,
Ад службы, ад радні і проста так...
Вось блаславілі маладых на шчасце.
Дай, Божа, дзетак ім, а мне падданых.
Чаго маўчыш? Ці так заняты працай?
Ах, нешта на душы ў мяне пагана...

Хадкевіч трымае напагатове нож, чакае зручнага моманту, каб забіць вялікага князя.

Ці ты глухі, што, як нямко, маўчыш?
Пара табе падрыхтаваць замену.
Вярэдзіць нешта з раніцы ў плячы...

*Слуга*

Надвор'е памяняецца, напэўна.
Я зараз, княжа, прынясу узвар,
Каб спалася лацвей на новым месцы,
Каб маскалёў не сніў ты і татар,
Няхай спакой і радасць сэрца песцяць.

(*Накіроўваецца за кулісы, раптам спыняецца, прыслухоўваецца)*

*Казімір*

Што?..

*Слуга*

Нічога... Падалося...
*(Выходзіць.)*

Князь Хадкевіч выглядвае з-за шырмы, бязгучна падкрадваецца да вялікага князя. Але на твары ягоным — разгубленасць, а нож дрыжыць у руцэ... І ў гэты момант вяртаецца слуга.

*Слуга (заўважае Хадкевіча)*

Князь?!

*Казімі*р *(азірнуўся, здзівіўся з'яўленню Хадкевіча)*

Князь!

*Хадкеві*ч *(падае на калені, хавае нож)*

Даруй велікадушна, Гаспадар,
Што я, нікчэмны, твой спакой парушыў!
Збіраецца вялікая бяда —
Рыхтуюць змову здрадлівыя душы.
Цябе забіць задумалі яны!
Я вартаваў! Няма маёй віны!

*Казімір*

Што? Змова зноў! Трымайцеся, паны!
Я гэтакіх свавольстваў не прабачу,
Яны крывёю мне за ўсё адплачуць!
Кажы імёны!

*Хадкевіч*

Знаю толькі двух:
Іван Гальшанскі і Міхал Алелька.

*Казімір*

Мая радня! Стрыечныя браты!
Мне цесна з імі ў княстве немаленькім!
І гэта ўсё?

*Хадкевіч*

Яшчэ князь Бельскі...
Пра змову, пэўна,
Ведаць мог і ён.

*Казімір*

А ці сумленне чыстае тваё?

Мо намаўляеш на князёў хлусліва?
Занадта позірк у цябе ліслівы!

*Хадкевіч*

На Бібліі клянуся на святой,
Што з праўдаю стаю перад табой!

*Казімір*

Варта! Схапіць Гальшанскага з Алелькам!
З Хадкевічам іх дапытаць!

*Хадкевіч (распластаўся перад Казімірам)*

Гаспадар, не трэба катаваць!

Варта хапае Хадкевіча і валачэ за кулісы.

Казімір *(адзін)*

А Бельскаму дарую ноч кахання.
Ён ранкам, пэўна, з'явіцца і сам.
Ці зможа князь хавацца па лясах,
Калі чакае маладая Ганна?
Я прагнуў дабрабыту і спакою
Усім падданым і маёй зямлі.
І кіраваў уладнаю рукою,
Каб людзі тут у вольнасці жылі,
Але закон дзяржаўны шанавалі
І помнілі пра страшны Божы суд.
Падумаць толькі: змову рыхтавалі
Употай, крэўныя... Ды на вяселлі, тут!
Каб заадно адсвяткаваць хаўтуры
І новага абраць Гаспадара?
Свавольны вецер наклікае буры.
Свавольствы абарваць даўно пара!
Зазналі ўдосталь міжусобных войнаў,
Братазабойчых дзікіх калатнеч.
Злачынцы ўсе адкажуць прад законам!
Сваім жыццём яны заплоцяць мне.

*Слуга (уваходзіць)*

Твая міласць, Алельку і Гальшанскага ўзялі,
Яны пацвердзілі свае намеры,

Калі іх у вязніцу завялі...
Хадкевічу, напэўна, можна верыць.

*Казімір*

Хадкевіча вядзі, няхай Бог бачыць:
Што ўмею я падданым і аддзячыць.

Слуга кланяецца і выходзіць.

Іван Гальшанскі і Міхал Алелька,
Шкада мне вас. І зводзіцца наш род.
Ды цесна з вамі ў княстве немаленькім,
Таемна варагуем з году ў год.
Здалося вам, што шапка Гедыміна
На кожную налезе галаву?
Няварты пад яе вагою згіне,
Адно ўлюбёнцы Божыя жывуць!
А каб мяне вы здолелі забіць?
За ўладу перагрызліся б, няйначай,
Паміж сабою. Я тут мушу быць,
Каб не зайшоўся край хаўтурным плачам.
Хто ведае, як мне даецца мір
З татарамі і сквапнаю Масквою?
Якую горыч зносіць Казімір,
За ўсё хварэе думнай галавою...

Слуга прыводзіць Хадкевіча.

Удзячны, князь Хадкевіч, я табе,
Што ты злачынства папярэдзіць здолеў.
У гэтай дзёрзкай крэўнай барацьбе
Злачынцаў і ахвяраў усё болей...

*Хадкевіч*

Вялікі князь, служыць буду заўжды,
Так, як служыў мінулыя гады
У Вільні міласці тваёй аддана...

*Казімір*

Я ўмею ўдзячным быць сваім падданым.
Табе даю намесніка пасаду

У Кіеве... Ды нешта ты не рады?..

*Хадкевіч*

Дзякую, вялікі князь, за шчодрасць і давер,
Я шчыра гавару... Павер...
*(Выходзіць.)*

*Казімір*

Радня мяне імкнулася забіць.
Знайшоўся сярод іх высакародны.
Каго мне ненавідзець і любіць?
Хто мне чужы, а хто мне самы родны?
Не можа быць радні у караля —
Ёсць слугі і падданая зямля...

## СПАЛЬНЯ МАЛАДЫХ У КОБРЫНСКІМ ЗАМКУ

*Бельскі і Ганна.*

*Бельскі*

Паснулі госці ад віна і ўтомы.
Каханая, нарэшце мы адны.
Ля сэрца ўецца смутак падсвядомы,
Нібыта ў шчасця лічаныя дні.

*Ганна*

Пра што ты, Хведар?
Мы з табой навекі
З'яднаныя і Богам, і людзьмі.
Зліліся нашы лёсы, нібы рэкі.
Тугу сваю, як свечачку, задзьмі.
Напэўна, я звычайная князёўна,
Ды мне паслаў анёл-ахоўнік знак.
Яшчэ з табой мы не былі знаёмыя,
А ён цябе мне паказаў у снах.
З усіх краёў каханага чакала.
Нас звёў у Вільні каралеўскі баль.
Цябе адразу са спіны пазнала,
А ў сэрцы — радасць, стоенасць, журба.

*Бельскі*

Прызнаюся, на словы я не шчодры.
Уражаны, тады зусім знямеў.
Нібыта ў сне мне трызніўся твой Кобрын,
Ад мрой і думак роздыху не меў.
Пра што я тут?.. Чакае шлюбны ложак...

*Ганна*

Мне ўсё цікава! Любы, гавары!
Як жыў, што думаў, з кім сварыўся, можа,
Хто ворагі твае і хто сябры?

*Бельскі*

Сяброў няшмат і ворагаў нямала.
І тайна ёсць, што не магу сказаць.
А ты нібыта думкі прачытала...
Чаму дачасна — на вачах сляза?

*Ганна*

Прысніла сёння — на душы трывога, —
Нібы табе наткала палатна.
Мне разгадалі: рушыш ты ў дарогу,
А я павінна буду жыць адна.

*Бельскі (цалуе маладую жонку)*

Сцалую слёзы са шчакі каханай.
З табою я, не вер трывожным снам.
Навек цяпер мая, князёўна Ганна,
Як шчасце, як надзея, як вясна...

Маладыя спыняюцца каля шлюбнага ложка. Бельскі здымае Ганны вэлюм, абдымае, любуецца жонкаю.

Люблю твае даўгія валасы,
Губляю розум, расцвітаю сэрцам
Навідавоку гэткае красы,
Якой ні часу, ні жыццю не сцерці.

*Ганна*

Мне радасна ў абдымках заміраць,
Лагодны голас слухаць твой, каханы,
І кожны дзень наступны вымяраць

Тым шчасцем, што навек наканавана.

*Бельскі (на руках нясе Ганну і кладзе на ложак)*

Заўсёды буду ухваляць я лёс,
Што звёў нас...

*Слуга (уваходзіць)*

Ратуйся, князь! Данос!
Алельку і Гальшанскага ўзялі.
Вялікі князь — у гневе! Не даруе!

*Бельскі (да слугі)*

Рыхтуй каня!

Слуга з паклонам выходзіць.

Вось, Ганна, мушу з роднае зямлі
Уцякаць, куды няшчасце накіруе.

*Ганна*

Каханы, не палохай... Растлумач!

*Бельскі*

У змове быў я супраць Казіміра.
А да злачынцаў літасці няма.
Вось і лячу ў непажаданы вырай.
Ці помніш, Ганна, нашыя бацькі
Змагаліся ў паўстанні Свідрыгайлы?
Вялі за вольнасць дзёрзкія палкі,
Хоць гінулі, але перамагалі.
Радзіме зараз цяжка ад прыблуд:
Чужая мова, вера, рытуалы!
Я марыў адрадзіць маю зямлю,
Але не здолеў — сілы бракавала!
Цяпер — уцёкі. Нібы ад сябе!
Хіба ўцячэш ад болю за Айчыну?
У гэтай патаемнай барацьбе,
Баюся, што бясслаўна я загіну.

*Ганна*

Выгнанне, Хведар, мо не горш за смерць.
На каралёў зыходзіць міласэрнасць.
Няхай у гневе Казімір цяпер,

А заўтра мо даруе ўсім нявернасць?
Але што б там і як бы ні было,
Вазьмі мяне, каханы мой, з сабою.
Падзелім горыч, холад і святло,
Суцешымся адзінаю любоўю.

*Бельскі*

Дзяўчынка, радасць ясная мая,
Ці ж я магу рызыкаваць аж гэтак?
Чакай мяне. Вярнуцца мушу я
Сюды ізноў з-за далечы, з-за свету...

*Ганна*

Чаму? Чаму? Ну, хто мне растлумачыць?
У гэты дзень, у гэты дзіўны час...
Няўжо нічога нельга перайначыць?
Ці не залежыць аніўшто ад нас?

*Бельскі*

Напэўна, Ганна, трэба прымірыцца...

*Ганна*

Ды сэрцам не прыняць мне аніяк,
Што сёння з тым павінна разлучыцца,
У кім і доля, і любоў мая...

*Слуга (уваходзіць)*

Гатовы, княжа, коні і карэта.

*Бельскі (да слугі)*

Чакай!

*Ганна*

Чаму? Чаму? Ну, хто мне растлумачыць?
У гэты дзень! У гэты дзіўны час!
Няўжо нічога нельга перайначыць?
Ці не залежыць аніўшто ад нас?
Хутчэй вяртайся, любы мой, назад...
Я не паспела лепшых слоў сказаць...
Спрыяльную пашлі нам, Божа, долю,
Каб больш не разлучацца аніколі...
*(Плача.)*

Заслона

# ДЗЕЯ ДРУГАЯ
## ЗАМАК КНЯЗЯ ЛУКОМСКАГА

Прамінуў год. Бельскі ўвесь гэты час хаваўся ў праваслаўных князёў Віцебска і Полацка. Цяпер ён гасцюе ў князя Лукомскага.

*Бельскі*

Алелька і Гальшанскі — у турме,
Я ж, бы злачынец, мушу тут хавацца,
Каб дзе з віжамі раптам не спаткацца.

*Лукомскі*

Шкадую, князь, што не ўдалося мне адгаварыць
Той наш хаўрус ад змовы.
З законам згодна мы павінны жыць.
Закон! І толькі ён — першавыснова...

*Бельскі*

Законы пішуць нам уладары,
Ды пад сябе. Ты шчыра мне скажы,
Ці праведныя нашыя законы?

*Лукомскі*

Закон патрэбны, каб натоўп скарыць,
Закон — грамадзяніну абарона.
Парадак — лепш заўжды, чым беззаконнасць!

*Бельскі*

Чужую мову, веру, рытуалы
Вялікі князь імкнецца ўкараніць.
Нам розуму і сілы бракавала,
Каб ад прыблудаў край абараніць.
Каталікам даюцца прывілеі.
Лаціна вынішчае дух радзінны.
Ліцвін не разумее ўжо ліцвіна,
На роднай мове гаварыць не смее.
І на сваёй зямлі не гаспадар,
А толькі госць! Што гэта за парадак?
Нашто зямлі маёй такі Уладар
З яго злачыннаю і згубнаю ўладай?

*Лукомскі*

Ад Бога ўладары даюцца нам,
Ад Сатаны — і змовы, і забойствы.

*Бельскі*

Уладалюбцу купіць Сатана —
Трывай народ дурноту і убоства?

*Лукомскі*

Не скончыць спрэчкі гэтай нам ніколі.
Не забывайма, што сябры ў няволі,
Іх нам патрэбна неяк ратаваць.
Вялікі князь не зможа дараваць
Правіны іхняй.

*Бельскі*

І маёй, канечне.
Ды дзякуй Богу, Казімір не вечны!
Гатовы памагчы яму памерці,
Калі не ўласнай, дык гвалтоўнай смерцю.
І не крывіся, князь! Я не святы!
Каб волю даць паплечнікам маім,
Развею Вільню ў попел, прах і дым!

*Лукомскі*

Адзін?

*Бельскі*

Я ведаю: ёсць у мяне браты
Не па крыві, а па высокай праўдзе,
За што змагаўся бацька мой і прадзед...

*Лукомскі*

Браты вартуюць жонак і маёмасць.
Яны не баязліўцы, не паскуды,
Але дарма рызыкаваць не будуць.
І гэта добра нам з табой вядома!

*Бельскі*

Ах, князь, мае ты сэрца палавініш!
Ці Ганну я хацеў сваю пакінуць?
Забыўся пра сябе дзеля Айчыны.
А калі трэба будзе, дык загіну!

*Лукомскі*

Вядомы кошт высокім парыванням,
Але няма пакуль табе вяртання
Ні ў Кобрын, ані ў Вільню, мне павер,
Вартуе смерць цябе паўсюль цяпер.

*Бельскі*

Бяздзейнасць і чаканне — горш за смерць
А можа, варта ў Кіеў ехаць мне?
Хадкевіч там...

*Лукомскі*

Высокая ў Хадкевіча пасада!
Чым куплена? Падумай! Ці не здрадай?
Усе пра гэта шэпчуць пры двары.
І пан Дзямід пра гэта гаварыў...

*Бельскі*

Няўжо Хадкевіч запрадаў нас подла,
Каб кіравала Ягелона кодла?
А Ноўгарад, дзе сілай, дзе падманам,
Задушаны і знішчаны Іванам.
Няма адкуль чакаць мне дапамогі,
Адна надзея можа быць на Бога.

*Лукомскі*

Чакайма, князь! Нам трэба ўмець чакаць.

*Бельскі*

Я вар'яцею ад тугі і злосці!
Ператваруся хутка ў мерцвяка!

*Лукомскі*

Паеду ў Вільню сам да ягамосці,
Паслухаю, пабачу, што ды як,
Хоць дальні Казіміру я сваяк.

*Бельскі*

Шчасліва, князь! Чакаць буду і думаць,
Як саўладаць з гаркотаю і сумам.
Супроць мяне — нягодаў легіён.
Мне цесна з Казімірам,
Я - ці ён!..

*Лукомскі*

Бывай. Да хуткага спаткання.
*(Развітваецца і выходзіць.)*

*Бельскі (адзін)*

Душу стаміла доўгае чаканне.
Каханая, зноў зацвіла чаромха,
Каля млына паветра аж звініць.
На камянях, што зелянеюць мохам,
Русалкі будуць ноччу росы піць.
Твае сляды ля Кобрынкі цалуе
Бадзяга-вецер. Зайздрасцю гару,
Зноў ён цябе, нявенчаны, мілуе
Ля замка ў вечаровую пару.
Пяшчотна ўецца ля тваіх каленяў
І шамаціць шаўковым палатном.
Схіляю галаву сваю ў маленні,
А ў сэрцы цёмна, свету не відно...

## КАРЧМА Ў ВІЛЬНІ

Кобрынскі і Дзямід. Людзі ў карчме п’юць і спяваюць

*Хор*

Дзе ж тая барылачка,
Што была з гарэлачкай?
Ці ў хаце пад лаўкаю
Зарасла мураўкаю?
Ці ў сенцах пад суднікам
Зарасла трыпутнікам?
Прычакаем раніцу,
Адкачаем п’яніцу,
Сядзем з ім на лаўцы,
Вып’ем зноў па чарцы.

*Кобрынскі*

Гавораць пры двары, што быццам днямі
Наш Гаспадар расправіцца з князямі
Алелькам і Гальшанскім... Шкода іх.

*Дзямід*

Што дворня смее выказаць услых,
Збываецца звычайна. Страшны кон
Іх напаткаў, а жорсткі наш закон
Шануе ўладароў, трымае ўладу
І да слабых не ведае спагады...

*Кобрынскі*

Такіх князёў, палітыкаў і вояў
Караць, нібыта злодзеяў ліхіх!
Чым Казімір сумленне супакоіць?
І як замоліць гэткія грахі?

*Дзямід*

Цішэй... Яшчэ віжы пачуюць раптам —
Умомант неба ўбачым цераз краты,
Пасля даводзь, што быў невінаваты.
Плач-галасі, а рады не дасі!
На сёння маю іншыя намеры,
З купцамі трэба падпісаць паперы.
А што ж у Вільню прывяло цябе?

*Кобрынскі*

Прыехаў з Ганнай літасці прасіць
За зяця. Сястра мінулы год зжыла ў жальбе,
Змарнела, нібы цень. Да слёз яе шкадую.

*Дзямід*

А Бельскі дзе? Пакінуў маладую!
Які ён князь? Які, нарэшце, муж?

*Кобрынскі*

Напэўна, цяжка, пане, і яму
Хавацца і чакаць смяротнай кары,
А пра сустрэчу з жонкай толькі марыць.

*Дзямід*

Шукаць у Вільні літасці дарма.

*Кобрынскі*

Мая сястра аслеплена каханнем,
Таму няхай упэўніцца сама,
Што Бельскаму не будзе даравання.

Уваходзіць князь Лукомскі, вітаецца з князем Кобрынскім і панам Дзямідам.

*Лукомскі*

Вітанне, князь!
І пан Дзямід? Вітаю!
Арлы якія ў Вільню залятаюць!

*Кобрынскі*

Дабры дзень, князь!

*Дзямід*

Вітанне! Рады бачыць!

*Лукомскі*

Чаму ж тады ад радасці не скачуць?
Карчмар, што маеш, на сталы нясі!
Балююць праваслаўныя князі!

Карчмар і ягоны слуга прыносяць на стол пітво і ежу.

*Кобрынскі*

Што ў Віцебску і Полацку чуваць?

*Лукомскі*

Па-польску хутка ўсе пачнём куваць.
Кругом ксяндзы кадзіламі трасуць,
Сваю лаціну гвалтам нам нясуць.
*(Звяртаецца да Кобрынскага.)*
Лепш пра княгіню Ганну раскажы...

*Кобрынскі*

Жыве, бы ў пустцы. А кругом віжы...
Пра Бельскага не ведае нічога.
Нібы манашка, моліцца ўсё Богу.
Прыехаў з ёю літасці прасіць
За зяця. Казімір прыняць не хоча...

*Лукомскі*

Вось дні пайшлі! Чарнейшыя ад ночы!
Яшчэ віна, карчмар, сюды нясі!

Слуга прыносіць пітво.

Усе свае тут, і магу адкрыць:
Хаваюць князя Бельскага сябры.

Я сустракаў яго. Ён быў устурбаваны,
З маркотай згадваў жонку сваю Ганну.
Імкнуўся да яе душой тужліва...
Ды як пераламаць лёс нешчаслівы?

*Дзямід*

Дзе ён дакладна? У каго? Каб ведаць,
Хацеў бы сябра я свайго праведаць...

*Лукомскі*

Віжоў навесці на яго сляды?

*Дзямід*

Крый божа. Княжа, што падумаў ты?..

*Лукомскі*

Падумаў што? Пра тое памаўчу...
Княгіню Ганну ўбачыць я хачу,
Каб прывітанне перадаць ад мужа,
Сказаць, што ён яе кахае дужа,
Дні каратае ў смутку і расстанні
І марыць пра шчаслівае спатканне.

*Кобрынскі*

Пайшлі. Княгіня будзе рада.
Ёй трэба суцяшэнне і парада.

*Лукомскі*

А пан Дзямід таксама пойдзе з намі?

*Дзямід*

Сустрэча тут прызначана з купцамі,
Я вымушаны трохі затрымацца.

*Кобрынскі*

Тады дазволь нам, пане, развітацца.

Кобрынскі і Лукомскі выходзяць.

*Дзямід*

Дазнацца б мне, хто Бельскага схаваў!
Яго, напэўна, б я падпільнаваў,
Аддаў бы Казіміру на расправу,
А сам вяселле зладзіў бы на славу
З ягонай удавой княгіняй Ганнай...
Пра што я? Шлях аблюбаваў заганны...

Пустое! Недарэчныя ваганні!
Здабуду шчасце я свае ў змаганні.
Шапну віжам — і Хведар Бельскі ў пастцы.
І з гэтым, мабыць, варта паспяшацца.
*(Кліча віжа.)*
Гэй, чалавек!

Віж набліжаецца, слухае.

Я маю весткі,
Дзе ад суда хаваецца князь Бельскі.

*Віж*

А ці вядома гэта, пан, дакладна?

*Дзямід*

Напэўна.

*Віж*

Паведамлю начальству неадкладна.

*Дзямід (сам сабе)*

Няцяжкая загадка, дзе князь Бельскі.
Там, дзе Лукомскі, у яго зямлі...
Каб толькі там яго віжы знайшлі...

## ВІЛЕНСКАЯ ТУРМА

Іван Гальшанскі і Міхал Алелька ў вязніцы.

*Гальшанскі*

Не хочацца дарэмна паміраць
І ведаць: вораг твой непераможны!
Як здраднікам маглі мы давяраць
І ў самы першы дзень, і ў дзень апошні?

*Алелька*

Ахвярнасць наша сталася ахвярай.
І літасці не варта нам чакаць.
Як цяжка жыць, пра недасяжнасць марыць,
Калі аковы на тваіх руках.

*Гальшанскі*

Я не баяўся згінуць у баях
За незалежнасць роднае Айчыны,

Але памерці гэтак вось злачынна
I бессэнсоўна не згаджуся я.

*Алелька*

Ніхто пытацца згоды ў нас не будзе.
Сам разбірайся, судзяць Бог ці людзі.

*Гальшанскі*

Хадкевіч—здраднік! Ну, а Бельскі дзе?
Чаму не пусціць Вільню ўсю пажарам?
Які яшчэ ўратуе дабрадзей
Ад ганьбы нас і немінучай кары?
Жылі ў несправядлівасці і зле,
Маёмасць наша нас перажыве.
Зламаны я душою... Не жылец...
I блытаюцца думкі ў галаве.
А сны, нібыта чорныя віры,
Што страшна згадваць, страшна гаварыць.

*Алелька*

Мы не забілі, нас заб'юць за гэта —
Такі закон звярыны выжывання.
Пакутнікамі адплывём у Лету,
А Казімір братазабойцам стане...

*Гальшанскі*

Яшчэ не смерць, а думка пра яе
Спыняе ў жылах кроў, і немагчыма
Змірыцца з лёсам... Ну, а што далей?
Калі жыццё зямное за плячыма?
I для чаго мы існавалі тут?

*Алелька*

Суд чалавечы нам яшчэ не суд.
Чакае, княжа, нас яшчэ суд Божы.
Жыві нават тады, калі не можаш.
Вось сэнс жыцця! А мы забіць маглі!
За гэты грэх адказваць давядзецца
Цяпер і потым. Памяць на зямлі
Пра нас, магчыма, нават застанецца.
Чым мы яшчэ праславіцца маглі?

А Казімір — шчаслівец і абраннік,
Які даўно ад медных труб аглух...

*Гальшанскі*

Выходзіць, што маё наканаванне —
Крывёй паліць радзімую зямлю,
Пазначыць шлях, якім ніхто не пойдзе?

*Алелька*

Не ведаю, што наша смерць народзіць,
Ды адчуваю за Радзіму боль,
Палае ў сэрцы дзейсная любоў.
І як мяне тут лес ні пакарае,
З любоўю жыў, з любоўю паміраю!
З любоўю паміраю...

## ВУЛІЦА Ў ВІЛЬНІ

Шматлюдна. Тут павінны правесці на эшафот князёў Алельку і Гальшанскага. На ўзвышэнні стаяць князь Кобрынскі, княгіня Ганна, князь Лукомскі.

*Лукомскі*

Тут павядуць князёў на пакаранне,
Гальшанскага з Алелькам...

*Ганна*

Ах, Божа мой! У залатое ранне
Спыніць жыццё гвалтоўна чалавеку!
Каменнае у Казіміра сэрца,
Калі дазволіць ён князям памерці!

*Лукомскі*

Вялікі князь не падаруе здрады.
А смерць князёў яму, няйначай, — радасць.

*Кобрынскі*

Чуваць ужо і барабанны пошчак.
Вядуць! Вядуць сюды, да плошчы!

*Першы з натоўпу*

Глядзі, князі і зараз гонар маюць,
Галовы перад смерцю не схіляюць.

*Жанчына з натоўпу*

Шкада іх! Грэх няхай даруе неба!

*Другі з натоўпу*

Злачынцаў шкадаваць? Так ім і трэба!
Ад бунтароў — і войны, і нягоды,
Пакуль жывуць яны, не будзе згоды!

*Трэці з натоўпу*

Усе злачынствы на зямлі ад грошай.
Чым багацейшы пан, тым злодзей большы!

*Жанчына з натоўпу*

Калі яны ўжо гэтак моцна вінны,
Няхай бы прэч прагналі іх з краіны.
*(Плача.)*

*Першы з натоўпу*

Маўчы, не галасі! Прычэпяцца віжы.
У кожнага свой лес, што тут ні варажы...

Пад барабанны пошчак пад канвоем праводзяць па сцэне князёў Алельку і Гальшанскага, якія заўважаюць у натоўпе знаёмых князёў, ківаюць у знак развітання.

*Ганна*

Падумаць страшна: з імі мог быць Хведар,
Прылюдна смерць гвалтоўную прыняць.
А я ішла б бездапаможна следам...
Як жудасна такое мне ўяўляць!

*Лукомскі*

Пазналі нас, кіўнулі ў знак вітання.
Ідуць туды, адкуль няма вяртання.
Я адчуваю і сваю віну —
Не дапамог няшчасце абмінуць.

*Кобрынскі*

Мы ўсе, напэўна, моцна вінаваты:
Не дазваляем жыць без працы катам.

*Лукомскі*

Ля плахі сталі. Ім прысуд чытаюць...
Ужо выратавання не чакаюць...

*Ганна (хрысціцца)*

Божа літасцівы...

*(Губляе прытомнасць, Кобрынскі падхапіў яе.)*

*Жанчына з натоўпу*

Жах! Ратуйце!

*Першы з натоўпу*

Усё! Няма! Як не было ніколі!

*Другі з натоўпу*

Адно галовы адляцелі долу!

*Трэці з натоўпу*

Цьфу! Ганьба!
І няма на што глядзець!

*Першы з натоўпу (да жанчыны)*

Ідзі! Здранцвела! Цягнешся ледзь-ледзь...

*Кобрынскі*

Як ты, Ганна?

*Ганна (да яе вяртаюцца сілы)*

Нічога. Ужо не так пагана...

Натоўп паволі разыходзіцца. Звоняць званы. Гучыць памінальная малітва.

*Лукомскі*

Як наша неба гэты грэх трывае,
Пакуль жывы жывога забівае?!

*Ганна*

І будзе ў княстве звонку лад і згода.
Улада праўду ўсякую сказіць.
Без лютых войнаў, без цяжкіх паходаў
Галовы склалі гэткія князі.
Цяпер ужо не трэба ім нічога.
Адзенне возьме кат, надзелы — Гаспадар.
І душы іхнія пад блаславеннем Бога
Глядзяць уніз спагадліва з-за хмар.
Адкрылася ім мудрасць незямная
І марнасць чалавечай мітусні.
Цяпер яны такую тайну знаюць,
Якую агаляюць смерць і сны...

*Кобрынскі*

Бездапаможны я, бядой аглушаны...

*Лукомскі*

Дык памянём загубленыя душы...

Усе выходзяць.

## КОБРЫНСКІ ЗАМАК

Ганна моліцца на каленях перад абразамі.

*Ганна*

Злітуйся, Божа, і мужа майго паратуй
Ад ворагаў лютых, ад смерці гвалтоўнай і болю.
Думкі свае я з тугі невычэрпнай праду,
Надзеяй жыўлюся, чаканнем і вернай любоўю.

*Кобрынскі (уваходзіць)*

Прабач, сястра, патурбаваў не ў час.

*Ганна*

Цябе, Іван, заўжды я рада бачыць.

*Кобрынскі*

Які цяжар ты носіш на плячах?!

*Ганна*

Не трэба шкадаваць, яшчэ заплачу.
Тужліва адлятаюць птушкі ў вырай.
Ізноў — зіма, самотная зіма...
Вартуюць замак служкі Казіміра,
І добрых вестак мне чакаць дарма.
Мой дзень вясельны — шчасце і бяда.
Шкада сябе і Хведара шкада.
Ці ён кахаў, што на алтар змагання
Бяздумна кінуў і мяне, і шлюб?
А я сама? Навошта нараканні
Расчаравана да нябёсаў шлю?

*Кобрынскі*

Не сумуй, калісь міне бяда...

*Ганна*

Мой лепшы час сплывае, як вада...

*Кобрынскі*

Прыехаў пан Дзямід з такою весткай,
Што служыць у Маскве цяпер князь Бельскі.

*Ганна*

Ён у Маскве? Схаваўся там ад катаў!
Далёка ён... Жывы...
І я ўжо рада!

*Кобрынскі*

Маскоўскі князь прыслаў да Казіміра
Свой ліст у гонар будучага міру
І просіць адпусціць цябе да мужа.

*Ганна*

Што ж Казімір?

*Кобрынскі*

Ён помслівасці служыць.
І адказаў: «Няхай прыедзе Бельскі
І забярэ з сабою жонку».

*Ганна*

Ён кліча Хведара ў радзімую старонку,
Каб тут гвалтоўна смерцю пакараць?

*Кобрынскі*

Так...

*Ганна*

Ці можам мы Дзяміду давяраць?

*Кобрынскі*

Пагавары сама з ім. Я паклічу.
*(Выходзіць.)*

*Ганна (сама сабе)*

Вось, Хведар, і з’яднаўся ты з Масквою.
І мне цябе кахаць, а не судзіць.
А я хацела вечна быць з табою,
Табе жадала сына нарадзіць,
Каб галубіны галасок дзіцяці
Напоўніў шчасцем замак наш стары.
Ах, Хведар, я стамілася чакаці,
Няхай у пекла — толькі забяры...

*Дзямід (уваходзіць)*

Цалую рукі маладой княгіні.
Прызнаюся: я закаханы, гіну...
Даўно шукаў нагоды, каб сустрэцца,
І зараз сэрца, нібы птушка, рвецца.
Як выказаць мне ўсю маю любоў?..

*Ганна*

Шаноўны пан Дзямід, сустрэлася з табой,
Каб гаварыць пра мужа, і не болей!
Падстаў не падавала я ніколі,
Каб мог ты заляцацца да мяне.

*Дзямід*

Княгіня, гнеў твой хутка праміне.
Не вернецца князь Бельскі ў родны край,
Табе змірыцца з тым даўно пара.
Падумаем пра будучыню лепш.
Ці на самоце век свой дажывеш?
Кахаю я цябе даўно аддана,
Дык будзьма разам, дарагая Ганна,

*Ганна*

Да Бельскага і ў пекла я пайду,
Каб з ім дзяліць і горыч, і бяду.
Калі няма для Хведара вяртання,
Мяне не напалохае выгнанне.

*Дзямід*

Як гэта бессэнсоўна, немагчыма,
Адзіная, каханая жанчына,
Маёю стань. Каханне потым будзе!
Ты Бельскага навек са мной забудзеш!
Злачынец, здраднік і выгнаннік Хведар,
Табе даўно пара пра гэта ведаць.

Паколькі ён цябе навек пакінуў,
Лічы, што ён памёр або загінуў...

*Ганна*

Пакінь мяне, нахабны чалавек!

Сама сваю я вырашаю долю!
Мне з мужам міг адзін важней за век,
І я яго не разлюблю ніколі!

*Дзямід*

Княгіня, знаю: у трывозе ты.
Гатовы я чакаць адказу доўга.
Мінуць, магчыма, месяцы, гады...
Яны не азначаюць анічога.
Мае каханне да цябе не згіне...

*Ганна*

Ці я пра гэта Госпада маліла?
Мой муж жывы яшчэ, а не ў магіле.
І сватанне тваё нібыта здзек!
Ці бачана такое, людзі, дзе?
Сібірны вецер з поўначы павее —
Турбуюся, як мужу там майму?
І хто яго душою адагрэе?
Сам да каго прыхіліць галаву?
Уцёк ад смерці. Не забіў, не здрадзіў...
Ці ж забаронім чалавеку жыць?
Дай, Божа, нам з душой сваей паладзіць,
Калі бяда знянацку набяжыць.
Ці ж на Радзіму Хведар не маліўся,
Гатовы скласці ў бойцы галаву?
Каб Казімір да Польшчы не гарнуўся,
Не бегалі б падданыя ў Маскву.
Як мае сэрца стомлена шчыміць...
Шчаслівае дарогі, пан Дзямід...

*Дзямід*

Бывай, княгіня Ганна, да спаткання.
Пакліч мяне, як невыносна стане.
*(Выходзіць.)*

*Ганна (адна)*

Каханы мой, заўжды жыву табою.
І мне цябе кахаць, а не судзіць.
Няма мяжы маркоце і любові...

Як я хацела б сына нарадзіць,
Каб галубіны галасок дзіцяці
Напоўніў шчасцем замак наш стары.
Князь Хведар, я стамілася чакаці.
Няхай у пекла — толькі забяры...

*Кобрынскі (уваходзіць)*

Сястра, ты плачаш?

*Ганна*

Слёз ужо няма.
Мне замак наш стары, нібы турма,
Куды не прычакаеш добрай весткі.
Хачу ляцець туды, дзе князь мой Бельскі.
Я сню яго бясконцымі начамі
З самотнымі пяшчотнымі вачамі.
Мяне ён кліча. Я іду... Губляю...
Хачу ў Маскву!..

*Кобрынскі*

Туды ехаць не раю!
І ці дазволіць Казімір табе?

*Ганна*

Маліць буду яго ў маёй журбе,
Каб мне дазволіў выехаць да мужа.
Сумленна род наш Казіміру служыць,
Ды прызначэнне іншае я маю.
Няўжо жанчыне не паспагадае?
*(Плача.)*

*Кобрынскі*

Сястра, балюча чуць мне твае словы,
Але табе не здатны я адмовіць.
Збяромся ў Вільню і паедзем днямі.
Няхай жа будуць Бог і ўдача з намі.

*Хадора (уваходзіць)*

Што здарылася, Ганна? Ты ў слязах!

*Ганна*

Мой Хведар у Маскве — хачу быць побач!

*Хадора*

Княгіня, ехаць у Маскву? Ну, гэта жах!
Хіба шукаць няшчасця і хваробы?!
Сярод чужых і на чужой зямлі...

*Ганна*

Мой Бельскі там! Пра што яшчэ маліць,
Пра што яшчэ прасіць магу я Бога?..

*Хадора*

Я разумею ўсе твае трывогі,
Але скажу, што прывідным каханнем
Дарма жыццё загубіш у чаканні.

*Ганна*

Якая доля ёсць — яна мая,
На іншую не памяняю я.

*Хадора*

Ах, Ганна, Ганна... Шчаснае дарогі
Хачу табе ад сэрца пажадаць.
Няхай мінаюць горыч і бяда!

Няхай і ў Вільні, і ў Маскве шанцуе.
Малітвы нашы, можа, Бог пачуе...

## ВІЛЬНЯ. ВЕЛІКАКНЯСКІ ЗАМАК

Вялікі князь Казімір і слуга.

*Слуга*

Благія весткі: зруйнаваны Кіеў.
Кіян пагналі крымчакі ў палон.
А скарбы, скарбы вывезлі якія!
Палацы, храмы праглынуў агонь.

*Казімір*

А наш намеснік, князь Хадкевіч дзе?

*Слуга*

З сям'ёй палонны ў чорнай той ардзе,
Загінуў, мусіць...

*Казімір*

Што яшчэ?

*Слуга*

Нічога болей.

*Казімір*

На ўсё, як бачыш, Божая ёсць воля.
Ды адбудуем Кіеў мы нанова —
І валасцей, і люду дастаткова.
Яшчэ?

*Слуга*

Княгіня Бельская просіць прыняць яе.

*Казімір (незадаволена паморшчыўся)*

Зноў скаргі, каб разжалабіць мяне?
Не саступлю злачынцам! Ужо ж годзе!
Аднак пакліч... Няхай заходзіць...

*Ганна (уваходзіць)*

Дзень добры, літасцівы князь вялікі.

*Казімір*

Княгіня! Рады я! І сам збіраўся клікаць
На баль калядны. Прыгажуні гэткай
Пакрасавацца трэба пры двары.
Так і завянуць можна без пары
Манашкаю, маўклівай дамаседкай.

*Ганна*

Высокі гонар! Дзякую сардэчна!
Ды мне без мужа што за весялосць?!
Я князя Бельскага не бачыла ўжо вечнасць,
Самотная мінае маладосць.
І дні і ночы плачу і малюся,
Каб назаўжды ён да мяне вярнуўся...

*Казімір*

Княгіня, мужа я не адбіраў.
Ён сам уцёк у іншую дзяржаву.
Шукаў ён лепшай праўды і дабра.
Знайшоў у маскалёў і справу, й славу...
А для мяне ён здраднік і злачынец,

Літва яму ўжо дзверы не адчыніць!
Ты вольная! Не патурай журбе!
А жаніха я падбяру табе!

*Ганна*

Вялікі князь, я Бельскага кахаю.
Пакуль жывая, вернасць захаваю.
Што межы нам, законы, пакаранні?
Мы з Хведарам — падданыя кахання!

*Казімір*

Радзіме здрадзіў — здрадзіць і каханню,
Упэўнішся яшчэ, княгіня Ганна!
Калі ён, сапраўды, мужчына, муж,
Няхай вяртаецца і забірае жонку.

*Ганна*

Але ж тут пагражае смерць яму?
Вярнуцца як у родную старонку?!.
Таму дазвол прашу ў Маскву паехаць,
Каб аб'яднацца з мужам назаўжды...

*Казімір (смяецца)*

Куды, княгіня? Скажаш жа! Пацеха!
Пакінуць княства, землі, гарады?!.
Падданства згубіш — згубіш і маёмасць!
Ці паляціш жабрачкаю мо ў свет?
Вяртайся ў Кобрын і падумай дома
Пра ўсё, што я сказаў табе, як след!
Як родзіч я не тое што не раю,
Княгіня, ехаць у Маскву цяпер.
Я як вялікі князь забараняю!
І слову майму добраму павер!

*Ганна*

Маёмасць, грошы, палітычны шал!
А мне баліць, штодня баліць душа!
Грэх! Грэх табе, вялікі князь!
Каханы мой, усё тут супраць нас...
*(Выходзіць са слязамі.)*

# КОБРЫНСКІ ЗАМАК

Прамінула болей за дзесяць гадоў. Ганна — сталая жанчына, валасы яе крануты сівізной. Яна з княгіняю Хадорай сядзіць пры акне. Разам чакаюць вяртання з вайны князя Кобрынскага. У руках жанчын вышыванне.

*Ганна*

Чаму няма нідзе на свеце ладу?
Як не вайна, дык мор ці недарод.
Ці дасць Гасподзь калі такую ўладу,
Каб без пакутаў кожны жыў народ?

*Хадора*

Хаця б Іван з вайны жывы вярнуўся...
Туга! Што хоць уголас закрычы.

*Ганна*

За брата моўчкі кожны дзень малюся,
Па мужу ўпотай галашу ўначы.
Ужо дачасна косы пасівелі,
А я ж на свеце нібы не жыла.
За столькі год пад спеў сляпых мяцеліц
І маладосць мая няўзнак прайшла.

*Хадора*

Даўно кажу, што прывідным каханнем
Дарма жыццё загубіш у чаканні.

*Ганна*

Што адышло без шчасця — не шкадую,
Ды страшна, што няма чаго чакаць.
Вось так адна жыццё перабядую,
А мне да адзіноты не звыкаць.
Дай, Божа, шчасця хоць табе, Хадора.

*Хадора*

Трывожуся. Благія бачу сны.
У Берасце, казалі, пазаўчора
Вярнуўся нехта з гэтае вайны.
І ходзяць чуткі: недзе пад Заслававам
Ардынцаў нашы ўсё ж перамаглі.

*Ганна*

Цяжкая бітва — пераможцам слава,
Забітым — гонар і спакой зямлі...

*Хадора*

Вунь на дарозе —коннікі! І шмат!
З вайны! Да нас! Чакалі нездарма!

*Ганна*

Дзе князь Іван? Не бачу! Дзе мой брат?

*Хадора*

Насустрач пабягу... Не ўседзець, Ганна...
*(Выбягае.)*

*Ганна (устрывожана)*

Чамусьці на руках нясуць Івана?..
Што з князем нашым? Божа, памажы!
Дай яму сілу і надзею жыць!..

Слугі прыносяць на кажусе параненага князя Кобрынскага.

*Хадора*

Дзе ж вы былі, баяры Некраш, Дробыш?
Не збераглі! Паранены наш князь!
*(Прыпадае да мужа.)*

*Кобрынскі*

Сам вінаваты я...
І што тут зробіш?
Хіба ад лесу на вайне ўцячэш?
Сатры слязу дачасную з вачэй...

*Ганна*

Дзень добры, воі! З перамогай вас!
Мы вочы ўсе прагледзелі ў чаканні!
З вяртаннем, дарагія! Добры час!

*Воі*

Дзякуем на слове добрым!
Здароўя князю ды з княгінямі!

*Ганна*

Сталы чакаюць. Ежце на здароўе!
Тых памяніце, што ў баях загінулі.

Воі выходзяць. Ганна схіляецца над князем Іванам.

Пусці, Хадора, брата пацалую.
Не слёзы, а віно патрэбна ліць.
Нічога, брат, сяк-так паразімуем,
Ізноўку будзеш тупаць па зямлі...

*Кобрынскі*

Не дачакацца мне, сястрычка, лета,
Жыццё мае па кропельцы сышло.
Шкада, што Бог не даў мне нават дзетак,
Падрэзаў роду нашаму крыло.

*Хадора*

Навошта, князь, пра смерць цяпер гаворыш?
*(Плача.)*

*Кобрынскі*

Не плач загодзь. Наплачашся, Хадора...
І ты адна, гаротніца-сястрыца,
Апошняя... Дык пажыві даўжэй.
Калі б паспеў нашчадак нарадзіцца,
Які ўладанні нашы зберажэ,
Памёр бы я без болю і трывогі...
Але не прымушаю замуж, не...
Ёсць лес... І ёсць жыццёвая дарога...
Няхай цябе нядоля абміне...
*(Сілы пакідаюць князя Кобрынскага.)*

*Хадора*

Князь! Муж мой, не пакідай мяне!..
*(Плача ў роспачы.)*

*Ганна*

Брат! Мой брат!
Як жыць на свеце мне?..
*(Плача.)*

Жалобна-пахавальна звоняць званы ў Кобрыне. Гучыць памінальная малітва.

*Хор*

Прымі, Госпадзі, душу раба твайго князя Івана

Кобрынскага, даруй яму ўсе грахі, свядомыя і
несвядомыя, адчыні перад ім царства вечнае
Славы Тваёй, супакой яго разам са святымі
Тваімі і ўчыні яму вечную памяць. Амінь!

З’яўляецца Ганна ў чорным адзенні.

*Ганна*

З бацькамі разам пахавалі Івана.
Вяснова дзень за вокнамі звініць.
Вось адбалелі братавы ўсе раны,
А мне мой боль павек не загаіць.
Душа яго звысока зорна свеціць,
Як памяць і як вечная любоў.
Нашто мне жыць адной на гэтым свеце?
Чаму Іван не ўзяў мяне з сабой?

Да Ганны падыходзіць апранутая ў чорнае Хадора. Жалобна звоняць храмы.

## МАСКОЎСКІ ШЫНОК

Людзі п’юць, спяваюць прыпеўкі, рагочуць, скачуць.

*Першы саліст*

Мой хозяин-то богатый,
Гребет денежки лопатой.
Сидит на скамейке,
Считает копейки.

*Хор*

Запрягу я бугая, бугая!
Куда люди—туда я, туда я!

*Другі саліст*

Смастерила сваха
Белую рубаху.
Вышивала серебром,
Чтобы бес не лез в ребро.

*Хор*

Запрягу я бугая, бугая!

Куда люди — туда я, туда я!

За сталом у адзіноце сядзіць змрочны Бельскі.

*Бельскі*

Пакутую самотай і адчаем
Пад нечы рогат, песні, дзікі свіст.
Нібыта дні чужыя пазычаю,
Душой даўно як адарваны ліст.
У родны край не будзе мне вяртання.
Я лішні. Там мяне чакае скон.
З Літвы ў Маскву не выпускаюць Ганну —
Нас аб’яднаў і раз’яднаў Закон.
Хіба мячом працерабіць дарогу?
Але супроць каго мне ваяваць?
Ці супраць тых, хто быў маім народам,
Якога, як бацькоў, не выбіраць.
Скрозь жорсткі свет, няма любові месца.
Яна ў выгнанні вечным на зямлі.
Уладары нянавісць хітра песцяць
Аднолькава і ў Вільні, і ў Крамлі...

У шынок уваходзіць Іван Лукомскі, заўважае Бельскага, узрадавана кідаецца да яго.

*Лукомскі*

Дзень добры, князь! Такая радасць!

*Бельскі*

Лукомскі! Князь! Здароў!
Што на Радзіме?

*Лукомскі*

Помслівасць ды здрада...

*Бельскі*

Як мая Ганна?

*Лукомскі*

Жыве, ды лёс яе паганы...

*Бельскі*

Ці пры двары, ці з войскам у паходзе,

Са мной заўжды патайная жальба.
Яна і ў снах ад сэрца не адходзіць,
Яна мая ўладарка і раба.
З ёй гавару, а побач бачу Ганну
І думкі выкладаю ўсе, як ёсць,
Што лёс здрадлівы, і што час заганны,
І што ў Маскве душой я вечны госць.
Служыць цару чужому — хлеб сабачы.
Усім ты вораг, нават сам сабе.
З сябе смяешся, над сабою плачаш
І гінеш у зацятай барацьбе...

*Лукомскі*

Бог не дае ў жыцці і Ганне святаў,
Зусім нядаўна пахавала брата.
Адна цяпер... Кругом яе бяда.
Шкада галубку нашую, шкада...

*Бельскі*

Князь Кобрынскі памёр?..
Дык памянём яго з Алелькам і Гальшанскім
Памерці з імі меў я шансы...

*Лукомскі*

Хадкевіч подла выдаў вашу змову...

*Бельскі*

Няхай цяпер жыве за ўсіх здаровы...

*Лукомскі*

Няма й яго. Узялі татары Кіеў,
Хадкевіч трапіў у палон, загінуў...
Нас пры жыцці карае Бог, князь Хведар.

*Бельскі*

Яшчэ што раскажы, усё хачу я ведаць...

*Лукомскі*

Вялікі князь пакінуў гэты свет.

*Бельскі*

Сканаў мой вораг, Казімір праклятa?!
Ці праўда, князь? Ці ты не маніш мне?
Такая навіна нібыта свята!

*Лукомскі*

Счэз Казімір, стаў сын ягоны правіць.
І дараваў князям правіны ўсе.
Але хіба сляпы мо не заўважыць:
Князі з Літвы ўцякаюць пакрысе.
І далучаюць землі да маскоўскіх,
Рабуюць і суседзяў, і радню.
Шлях здрадніцтва заўжды бывае коўзкі,
Душу сабе не купіш за казну.
З’ехаў і я, не ведаю чаму...

*Бельскі*

Як я хачу вярнуцца на Радзіму!
Мяне чакае жонка ўсё жыццё.
Шкадую, што адну яе пакінуў.
Сам ратаваўся... Ды ад шчасця ўцёк!

*Лукомскі*

Я б выпіў за тваё вяртанне чарку.
Але дарма. Адсюль ты не ўцячэш.
Мы здраднікі, мы свечкі-недагаркі,
Што не спалілі гэты Крэмль яшчэ.
Ды дзе рабам? Трывай! Служы, як цуцык!
І будзь цішэй вады, ніжэй травы.
Пачуе цар, дык так, глядзі, адпусціць,
Што пабяжыш дамоў без галавы...

*Бельскі*

Навошта ты сюды прыйшоў? Скажы?

*Лукомскі*

Хацеў разгледзець зблізку рай маскоўскі!

*Бельскі*

Цішэй... Нас падслухоўваюць віжы!

*Лукомскі*

Да д’ябла іх, вужакаў гэтых коўзкіх!
Няма спакою на зямлі Літоўскай,
Абкладзена варожа наўкруга
Маскоўскім войскам і татарскім войскам,
А Польшча не імкнецца памагаць.

Скрозь ворагі! А мы ў сусветнай бойні
З табой, князь Бельскі, хочам ацалець?
Загнаныя да смерці лёсу коні
Па бездарожжы цягнуцца ледзь-ледзь...

*Бельскі*

На вольны розум ёсць заўсёды пастка.
Схаваем думак грэблівых гурму...

*Лукомскі*

Служыць хачу не ўладарам, не царствам,
Адно народу роднаму свайму...

Раптам да князёў падбягаюць царскія віжы, скручваюць і выводзяць.

*Віжы*

Шпионы вражеской Литвы!
Хватай!
Держи!
Вяжи!
Лови!

## КРАМЛЁЎСКІЯ КАТОЎНІ

Пад нізкімі сутарэннямі сядзяць закаваныя ў жалеза князі Бельскі і Лукомскі.

*Лукомскі*

Вось тут мы нагаворымся даволі!

*Бельскі*

Благія жарты, князь Лукомскі.
Не ведаеш парадкаў ты маскоўскіх.
Няхай Гасподзь ратуе ад нядолі —
Тут целы трушчаць, вынішчаюць душы.
І нас не сцены акаляюць — вушы!
Яны і думкі нашы прагнуць ведаць.

*Лукомскі*

Маскоўскі рай! Ну, дзякую, князь Хведар!
Хоць ты маю наіўнасць зруйнаваў.
Трымае волю ў кайданах Масква,

Як скрозь вядзецца на зямлі здаўна.
Яшчэ раз дадзена расчаравацца...

*Бельскі*

Каб, князь Іван, нам неяк апраўдацца.
Тут надта жорсткі суд і хуткаспелы...

Уваходзяць два каты, хапаюць Лукомскага і цягнуць да дзвярэй.

*Лукомскі*

Я сам!.. Прэч ад мяне!

*Першы кат*

Ползет ведь еле-еле!..
Шпион литовский!

*Другі кат*

Ну, шевелись! Собака! Марш! Вперед!
*(Выходзяць.)*

*Бельскі (адзін)*

Спяшаюцца праліць чужую кроў!
Ці людаедства скончыцца калі
На гэтай грэшнай і святой зямлі?
Мне недасяжна сумна жонка сніцца.
Хацеў быць з ёю — а сяджу ў вязніцы!
Кругом я вінаваты без віны,
Няма прытулку мне і ратавання.
Даруй мой грэх, мая святая Ганна!
Адступнік я! Мой грэх недаравальны!
Аддаў цябе, самотніцу, на здзек.
Звон б’е ў Крамлі высокапамінальны...
Чым я жыву, нікчэмны чалавек?..

*Баярын (уваходзіць)*

Князь Бельский, ты обвиняешься в предательстве
Московского государства и в
шпионстве на пользу презренного Великого
княжества Литовского.

*Бельскі*

Якая здрада? Знаеш сам, баярын,
Літва сяброў маіх няшчадна пакарала.

Пакуль жывы быў Казімір Чацвёрты,
Мяне ён прагнуў бачыць толькі мёртвым.
І жонку не пусціў маю ў Маскву!
Ды ён памёр. А я пакуль жыву!
Хачу сюды забраць княгіню Ганну.
Якая ж гэта здрада ці загана?..

*Баярын*

А не подстрекал ли тебя князь Лукомский
убить царя Иоанна?

*Бельскі*

Такой гаворкі не было, павер!
Прыехаў князь, каб паслужыць Маскве.
Зусім не меў намеру ён благога.

*Баярын*

Что ж, ожидай суда. Молись, князь, Богу...
*(Выходзіць.)*

*Бельскі*

Адно жыццё! А не дадуць пражыць.
Судом і карай пагражае ўлада.

І толькі суцяшаюць міражы —
Каханне недасяжнае і радасць.

Каты прыцягваюць непрытомнага Лукомскага. Бельскі кідаецца насустрач.

*Кат*

Сидеть! Не сметь! Не трогать!

Каты пакідаюць непрытомнага Лукомскага і выходзяць.

*Бельскі*

Прывалаклі амаль што нежывога.
Ачніся, князь! Як эшафот, турма...

*Лукомскі (гаворыць з цяжкасцю)*

Ці я жывы? Ці ўжо мяне няма?
Майстры, як на кавалкі разарвалі
І цела, і нябачную душу.
Да поту, да знямогі шчыравалі...

Ды я зусім спагады не прашу...
Хацеў памерці. Зараз жыць хачу!
Чаго маўчыш? Скажы мне, князь, што-небудзь…

*Бельскі*

І ты маўчы, пакуль мы не на небе.
Тут вушы — скрозь і доўгія насы,
Тут азіяцкі позірк сочыць скоса.
І кожны, нават самы безгалосы,
Намовай здатны лес чужы скасіць.

*Лукомскі*

Але ж павінна ў людзях быць сумленне...

*Бельскі*

Сумленне хутка ставяць на калені.
Для ўсіх адзіна важны ёсць занятак —
Шукаць шпіёнаў, здраднікаў заўзята.
Даводзіць тым цару сваю адданасць..

*Лукомскі*

Я прадчуваю: скончацца пагана
Маскоўскія прыгоды для ліцвінаў,
І крыўдна на чужой зямлі загінуць...

Уваходзяць каты.

*Першы кат*

Продолжим, князь Лукомский, разговор.

*Лукомскі*

Я ўсё сказаў...

*Другі кат*

Ах ты, шпион! Ах, вор!

Каты падхапліваюць Лукомскага і валакуць да выхаду.

*Бельскі (сам сабе)*

Жыццё зусім нічога не каштуе.
Ляціць душа няўцямная ў прадонне.
Ані сябе, ані другіх не чуе.
Рабы мы не законаў — беззаконня,

*Баярын (уваходзіць)*

Князь, твоя судьба решена, ты высылаешься в

Галич до особого распоряжения.

*Бельскі*

А што Лукомскі? Ён не вінаваты...

*Баярын*

Горазды вы друг друга покрывать!
Он обвиняется в заговоре против государя и
будет предан смерти.
*(Выходзіць.)*

*Бельскі (бездапаможна)*

Той праведнік, што гвалт трываць не можа,
Загінуць мусіць сам гвалтоўнай смерцю.
Дзе справядлівасць, літасцівы Божа?..

## КОБРЫНСКІ ЗАМАК

Ганна ў чорным адзенні, Хадора — у святочным, яркім.

*Ганна*

Ты ўжо зняла жалобнае адзенне?

*Хадора*

Стамілася без мары і надзеі.
Я фундавала храм у гонар мужа...
Рыхтуюся да новага замужжа.
Князь Пац прапанаваў руку і сэрца...

*Ганна*

Хадора!..

*Хадора*

Ты мне параіш легчы і памерці?..
Прабач, ды не манашка я.
Настойвае на шлюбе ўся радня...
Табе, між іншым, раю я таксама
Забыць тугу мінулай драмы!

*Ганна*

Рабі што хочаш! Хай спрыяе лёс!
Я не суддзя табе і не дарадца.
Як адбалела тое, што было,
Дык і не варта да яго вяртацца.

*Слуга (уваходзіць, падае Ганне ліст)*

Ліст ад князя Бельскага.

*Хадора*

За гэтулькі гадоў — першая вестка!
Чытай! Хутчэй!

*Ганна (чытае ўслых, нібыта чуе голас Бельскага)*

Каханая, не ведаю, ці дойдзе
Мой ліст у Кобрын з гэтым веставым.
Малюся Богу, хай цябе ён знойдзе
Маім вітаннем рэдкім веснавым.
Адступнік я! Мой грэх недаравальны!
Цябе аддаў, самотніцу, на здзек!
Звон б'е ў царкве высокаразвітальны.
Чым я жыву, нікчэмны чалавек?..
Пракляты лёс мой, дарагая Ганна,
І гэта ўжо спакойна гавару.
Я ў Галічы. Жыву тут у выгнанні —
Не дагадзіў маскоўскаму цару.
Як шмат гадоў трываў з табой разлуку?
Калі ж сканаў, нарэшце, Казімір,
Падумаў: вось і развязалі рукі,
І жыцці з Ганнай паяднаем мы.
У гэтай думцы цар убачыў здраду
І адабраў надзеі ўсе і радасць.
Бывай, мая каханая, сумую
І рукі твае добрыя цалую...
*(Звяртаецца да Хадоры.)*
Уцёк ад лёсу Хведар ці ад смерці?
Ды і ў Маскве нявольны і чужы.
Як рвецца на Радзіму яго сэрца!
Ці давядзецца тут яшчэ пажыць?
Напэўна, не. Цар не даруе здраду.
Прадаўся ў рабства, дык, лічы, навек.
Бывай, мой Хведар! Страчаная радасць,
Адзіны мой каханы чалавек...

*Хадора*

Задоўга ліст блукаў. Зноў Бельскі пры цары.
Князь Пац казаў, што муж твой ваявода
Улады і вядомы пры двары.
Набегам і з Літоўскае зямлі
Ў палон забраў нямала ўжо народу.

*Ганна*

Не веру я!

*Хадора*

Што мы яму, ліцвіны?
Твой муж падданы іншае краіны!

*Ганна*

Ці ж на Радзіме не знайшлося б справы
Такому князю? Божа барані...
Нашто абраў сабе ён шлях крывавы,
Каб жыць тугой па блізкіх і радні?
Радзіму ў клунку ў дальні край не возьмеш,
Але яна заўжды ў душы з табой.
У снах і яве чуеш яе позвы,
Як шчасце недасяжнае і боль.
Якая ёсць, з такою трэба зліцца,
І беднасць, і адчай яе прыняць,
Не давяраць павек рукам чужынцаў
І на замежны рай не памяняць.
Не рваць яе, не трушчыць па жывому,
У войнах паміж дужых не дзяліць.
І мы належым ёй або нікому.
Не ёй без нас, нам без яе не жыць.

*Хадора*

Радзіму мы не можам выбіраць,
Ды вольныя абраць Уладара...

*Ганна*

Бывай, Хадора. Мне даўно пара
Сам-насам са сваей душой застацца —
Сустрэцца, а магчыма, развітацца...

*Хадора*

Палохаеш мяне навошта, Ганна?
Патрэбна жыць — самазабойства грэх!

*Ганна*

Калі жыццё такое ў нас заганнае,
Ці важна ўжо, як тут жывы памрэ?

*Хадора*

Паабяцай, што чорных думак верад
Не пусціш у душу супроць начы.
Паабяцай! Табе заўжды я веру.
Ну, што з табою, Ганна? Не маўчы!..

*Ганна*

За клопат дзякуй, мілая Хадора.
Я абяцаю да скanання жыць,
Хоць і дайшла да страшнае мяжы —
Душа мая двaіцца хваравіта,
Нібыта Богам я зусім забыта...

## БАЛЬ У КОБРЫНСКІМ ЗАМКУ

З нагоды заручын княгіні Хадоры і князя Паца весяляцца госці, гучыць музыка. Ганна і Хадора —на авансцэне.

*Ганна*

І ты мяне пакінеш назаўсёды...
Жадаю шчасця з мужам. Добрай згоды
Між новых сваякоў, у новым шлюбе!

*Хадора*

І да цябе мо вернецца твой любы...

*Ганна*

Ідзі. Цябе чакаюць госці, пэўна.

*Хадора*

А ты?

*Ганна*

Крыху пазней, цяпер там надта спеўна...

*Хадора*

Не сумуй! Наш лес нязнаны...
*(Выбягае да гасцей.)*

*Ганна (падыходзіць да люстэрка, глядзіцца)*

Сівыя косы расплятаю нанач,
Гляджу ў люстэрка з ціхаю тугой.
За што мне гэткі лёс наканаваны:
Кахаць і быць каханаю табой?
Мяне адлегласць пры табе трымае,
Але прастуе ў незваротнасць шлях.
Я ўжо не тая, я даўно не тая,
Бо праз пакуты чорныя прайшла.

*Слуга (уваходзіць)*

Вялікакняскі вястун прывёз грамату, якая дазваляе княгіні Ганне выехаць у Маскву да мужа, князя Хведара Бельскага.

*(Аддае грамату, кланяецца і выходзіць.)*

*Ганна (узрушана бярэ грамату, прабягае вачамі)*

Вялікі князь літоўскі Аляксандр даў мне
дазвол на выезд у Маскву?
Ад Бельскага мне позва!
*(Глядзіцца ў люстэрка.)*
Ах, позна, позна...

*(За сцяной весяляцца госці. Ганна разгублена апускаецца ў крэсла, задумваецца.)*

Князь Бельскі, прамінула паўжыцця!
Кранула старасць непрыкметна цела.
Ужо ў нас не народзіцца дзіця,
Каб я і вельмі гэтага хацела.
Усцешана, што зноў ты пры цары,
Нявінны не загінуў у выгнанні.
Табе нявесту знойдуць пры двары,
А будзе шлюб, мо з’явіцца каханне.
Жаніся, Хведар, не крыўдую я,
Бо крыўды ўсе даўно загаварыла.
А без нашчадкаў што мы за сям’я?
Сівыя знелюбелыя старыя.
І мне цяпер нічога не шкала,
Хіба адной самотнай маладосці,

Дык старасць пройдзе весялей, бадай,
Да старасці не ходзяць мары ў госці.
Мы падзялялі смутак і адчай,
Каханнем нам не дадзена дзяліцца.
Прыпала б зараз да твайго пляча,
Каб разам плакаць... А яшчэ маліцца.
Мой лес — ахоўваць родныя магілы,
У храмах светлых ачышчаць душу.
Ты быў каханы, стаў цяпер любімы,
Тугу сваю, як свечку, патушу.
Са мной, астатняй, згіне добры род,
Ды застануцца селішчы і храмы.
І, можа, летапіснае пяро
Міжвольна занатуе нашу драму...

*(Па твары Ганны коцяцца развітальныя слёзы: жыццё мінула, нічога нельга вярнуць.)*

*Заслона*

## Пазнякоў Міхаіл

### БЕЛАРУСЬ

Усяму вядомы свету
Наш руплівы край здавён.
Тут на сонечных палетках
Спеюць бульба, жыта, лён...

Тут Дняпро бяжыць прывольна,
Сож, Бярэзіна, Дзвіна,
Прыпяць, Шчара, Свіслач, Неман,
Вілля, Піна, Буг, Дзісна...

Тут крыштальныя азёры —
Нарач, Свіцязь, Снуды, Свір...
Полацк - наш найпершы горад,
Віцебск, Тураў, **Кобрын**, Мір...

Тут умельцы вырабляюць
Слаўны трактар «Беларусь».
Тут ствараюцца БелАЗы -
Трохсоттонны везці груз...

Тут сыны лятуць у космас,
Песні матчыны пяюць...
Гэты край наш найдзівосны
Беларуссю ўсе завуць.

## Таболіч Адам

### ХЛЕБАРОБАМ

На «Дажынкі», даўно абвешчаныя,
Сёння Кобрын гасцей збірае.
Хлебаробам насустрач Брэстчына
Выйшла зноў з залатым караваем.

Ён галоўны у нашых хатах -
Каравай на льняным абрусе.
З ім гасцей сустракаць прынята
У маёй дарагой Беларусі.

Як раней, мы і сёння ставім
Пачастункі свае на застоллях,
І з усёю краінаю славім
Тых, хто вернасць захоўвае полю...

Час жаданы жніва, час шчаслівы,
Па палетках ісці бясконцых,
Любавацца багатымі нівамі,
Што сагрэты людзьмі і сонцам.

Колькі іх за гады перамерана...
Рукі моцна трымалі штурвалы.
Вы на сталасць палямі праверany
Перш, чым выйсці да п’едэсталаў.

Працавалі з рання да зорак.
І на тое зусім не глядзелі,
Што субота была ўчора,
А за ёю прыйшла нядзеля.

Калі хмара з дажджом прыплывала,
Тое ў радасць было лянівым,
А рупліўцам работы хапала,
Бо гадзіны ляцелі імкліва...

Рады бачыць мы самых дбайных,
Каго колас вітаў паклонам.
Хто па зернетку на камбайне
Залатыя збіраў мільёны.

У снапе, што сабраць удалося,
Што на сцэну галоўную змешчаны,
Ёсць нямала цяжкіх калоссяў
І з палёў маёй роднай Брэстчыны...

Я хачу, каб «Дажынак» свята
Шмат прынесла прыгожых імгненняў,
Каб было і ў далейшым багата
На зямлі маёй дасягненняў.

## Таўлай Валянцін

# КОБРЫНШЧЫНА

(Апавяданне адной ночы)

*Кобрынскім паўстанцам - таварышам*
*па Лукішках - на ўспамін.*
*Аўтар.*

Ноч была такая летняя ды парная,
што здалося кожнаму: ну, прыйшла пара!..
Па сяле затупалі крокам гаспадарным,
выйшлі, - напачатак, - правады парваць.

Ой, паны вяльможныя, ласка ваша колецца,
не заўважыш,- скруціцца гадзінай-пятлёй;
пад Ляплёўкай - карнікі: ведае аколіца.
Мы на кару - караю ўстанем над зямлёй.

Хай абрэз іржавы, - мы рукамі голымі
з вашых ручак белых вырвем карабін:
помняць пра Нябабу песні ў нашых сёлах,
шэрымі радамі рушым на Дывін!

Расступіся, далеч, расступіся, цёмная:
месяц - дзед з бандурай - за бугром заснуў,
але нам здалося ў шэрасвітным гомане,
што праз сон музыка закрануў струну.

Напачатак, хлопцы, з гэтае асіны,
перуном пашчэпанай, надзярэм лучын:
хай здаецца кожнаму сукінаму сыну,
што штыкі над намі - добра на пачын.

Сцежкамі-прасёлкамі выйшлі на дарогу,
а на самакаце - знекуль паліцай.
Стой, куды паўзеш ты, гадзіна бязногая,
аддавай рэвольвер, стрэльбу аддавай!

З дзіву аж разявіўся: што мы за такія?
Не з паклонам нізкім, - ды яшчэ крычым.
Як рванём за сумку, як збабоўчым кіем, -
паляцела «ўлада» носам у карчы!

А за ім як гаркне наша стрэльба куцая,
наш абрэз іржавы - ды-мам аб-да-ло!
Толькі дым развеяўся, - хлопцы носам
круцяць:
ці не ў пятку трапілі, хоць цалялі ў лоб...

І не згледзіш пана - чэша без аглядкі,
па дарожцы заячай толькі трэск ды шум...
- Не журыся, хлопцы, - трапіўшы ў пятку,
можа, мы прастрэлілі панскую душу!..

Расступіся, далеч! Бандурыст, прачніся,
апусці на струны звонкую далонь,
перестань дражніцца з кобрынцамі, лысы,
ірвані казацкую - нашае ўзяло!

Грамадой мы рынулі па дварах асадніцкіх,
што паселі скуламі скрозь ля нашых сёл.
- Ну, паны вяльможныя, справімся да
раніцы:
наша ўлада, стрэльбы - аддавайце ўсё!

Вось і хутар Ксенскага, «стрэльцаў»
камандзіра.
Грукнулі па раме, - скочыў да акна:
зноў штыкі высокія, шэрыя мундзіры...
Тыя, што ў двадцатым, - ледзьве не сканаў.

За жывот узяўшыся, ракам поўз на ганак,
грамадзе схіляўся нізка - аж да ног...
- Стшэльбу і шабэльку аддаю з наганам:
зброю нават, бачыце, я для вас бярог...

Чловек естэм просты, хоць і афіцэр я.
Толькі - от нешчэнсце! - слабкі на жывот,
і таму трымаюся за яго аберуч,
але не ад страху - крыж найсвентшы вот...

Ой ты, вою бравы, запяваеш плаўна,
так і спадзявайся ад цябе дабра:
вось прайдзіся лепей - ноч такая слаўная! -
Паглядзі, як будзем пастарунак браць.

Расступіся, далеч, выплывай туманамі!
Месяц — дзед з бандурай — з-за балота ўстаў
і бяззубым смехам цешыцца, рахманы,
што асаднік просіцца зноў каля куста.

Высіцца над вёскай груганом насупленым
пастарунак панскі - логава гадзюк.
Ну, паны вяльможныя, наша злосць не
куплена,
наша помста вырасла ў чорных скібах мук!

Падвялі мы Ксенскага: стукай, пан, -
гаворым,
ды кажы па-шчырасці - свойскі гад паўзе...
А ў катоўні цёмнай ляскаюць затворамі
(эх ты, сукін заяц на адной назе!..).

А у паноў таксама тут мабілізацыя,
націскае з роспаччу кожны пан курок
і пытае бога: гіну, пане, за цо я?
Чорт мяне на гэтыя «крэсы» завалок!..

Ну, паны вяльможныя, паспрабуйце пораху:
хлопцы, - наўскрыжа па іх а-гонь!
... Мы страляць - стралялі б: куль не стала
скора,
хоць свярбіць мазольная на паноў далонь.

Але з шыльды хіліцца - не пытае: за цо? - •
кіпцем толькі скрэбае важны пан-арол,
на чужое квапіўся, - добры гуз намацае,
шчыры падарунак паляшуцкіх сёл.

Ну, няхай на сёння і бітва не скончана,
і над пастарункам наш не ўзняўся сцяг, -
з храпамі падбітымі завываюць гончыя,
сінякі залізваюць на сваіх касцях.

Ой ты, месяц-месячык, бандурыст старэнькі,
сеў за гай бярозавы, сеў і ўвесь абныў.
І здалося хлопцам, што з-за гаю енкнула
рэхам смерці зорнае - трэснутай струны...

Цверазелі рукі на халодных травах,
водбліскам нязбытага ззялі зоры рос...
Узнялі мы вочы, бачым - шлях крывавы
рассцілаюць золакі па вярхах бяроз.

Эх ты, ночка-зводніца, - ці ж прасілі мала:
дню - жняцу суроваму, ночка, не міргай!
А цяпер - світанне рукі заламала,
і далёкім шумам кліча гай.

Не ўдалося сёння, - можа заўтра ўдасца:
возьме наша некалі - дажывем пары,
хай сядзяць, праклятыя,- затрасі іх трасца! -
Нам дарога, хлопцы, проста на бары!

*1935-1940 гг.*

[1] *У Кобрынскім павеце ноччу з 3 на 4 жніўня 1933 года выбухнула паўстанне сялян, якія ў мэтах самаабароны перад «пацыфікатарамі»-карнікамі раззброілі суседніх асаднікаў і напалі на пастарунак паліцыі ў Навасёлках.*

*Крэсы - ускраіны (польск.).*

*Небаба - адна з мянушак Кастуся Каліноўскага - правадыра рэвалюцыйнага сялянскага паўстання ў Беларусі ў другой палове XIX стагоддзя.*

## Чапураў Анатолій

# КОБРИН

«Здесь лежит Суворов» -
В Ленинграде он лежит…
Дымится даль дорог,
И выходит прямо к автостраде
Кобрин - белорусский городок.
И в тиши,
В тени зеленых веток,
Верный деревянный старожил,
Без парадных арок и виньеток -
Низкий домик, где Суворов жил.
Здесь он жил,
Взирая на дубравы,
На когда-то грозные поля.
И хранит частицу русской славы
Эта белорусская земля.




# IV. КОБРЫНШЧЫНЕ РОДНАЙ ПЕСНІ ПРЫСВЯЧАЕМ

## ПЕСНЯ О КОБРИНЕ

*Слова и музыка И. Черника*



Пусть в этот город
Радость приходит,
И песни звонко
Здесь все поют.
Пусть молодеет
Он год от года,
А люди в мире
Вечно живут.

*Припев:*

Славу городу поём,
Кобрину родному,
Нивам, рекам и лесам,
Краю дорогому.

Вам, кобринчане,
Счастья, здоровья,
Долгих вам лет.
Пусть труд ваш мирный
Слава овеет,
Как подвиг предков
Военных лет.

*Припев:*

Славу городу поём,
Кобрину родному,
Нивам, рекам и лесам,
Краю дорогому.

# ПЕСНЯ О КОБРИНЕ

*Слова Н. Ярмошука*
*Музыка А. Шибута*




В мороз и зной, в любое время года
Куда б ни шёл, куда б ни ехал я
Со мною ты навеки, милый город,
Мой город Кобрин - родина моя.

*Припев:*

Живи и славься, Кобрин наш родимый,
Своим трудом вздымайся до высот.
И хорошей народам всем на диво
Из года в год, из года в год.

Люблю твои я улицы и скверы,
Тенистый парк и облик Мухавца.
Ты настежь всем распахиваешь двери,
Кто в мир и дружбу верит без конца.

*Припев:*

Живи и славься, Кобрин наш родимый,
Своим трудом вздымайся до высот.
И хорошей народам всем на диво
Из года в год, из года в год.

И пусть под солнцем пролетают годы
Лишь об одном, мой Кобрин, знаю я,
Что ты со мной навеки, милый город,
Мой Кобрин – родина моя.

*Припев:*

Живи и славься, Кобрин наш родимый,
Своим трудом вздымайся до высот.
И хорошей народам всем на диво
Из года в год, из года в год.

# КОБРЫНСКІ ВАЛЬС

*Словы М. Ярмашука*
*Музыка А. Кірыеўскага*



Лісцем - золатам ліпы з клёнамі
Усцілаюць абрусам зямлю.
Ці ты ведаеш, горад Кобрын мой,
Што цябе я бясконца люблю.

Што ні вуліца - закаханы я,
Што ні дом - мая ў ім радня.
Парк Суворава, сквер Пуганава,
Таямнічая цішыня.

Выйду ўвечары, выйду й слухаю -
Голас твой я люблю без мяжы.
Раскажы мне быль, рэчка Мухавец,
Партызанскую быль раскажы.

І куды б мяне ні паклікаў лёс,
І ні вабілі б як гарады,
Але ў горад мой, дзе з маленства рос,
Я ўсё роўна вярнуся сюды.

Лісцем - золатам ліпы з клёнамі
Усцілаюць абрусам зямлю.
Ці ты ведаеш, горад Кобрын мой,
Што цябе я бясконца люблю.

# ПЕСНЯ ПРА КОБРЫНСКІ КРАЙ

*Словы Л. Глушко*
*Музыка В. Сікачовай*




Высокае неба над кобрынскім краем,
І кружаць пад сонцам буслы пакрысе.
Мы роднаму краю ад сэрца жадаем,
Каб людзі гадамі жылі ў красе.

*Прыпеў:*

Квітней, квітней ты, Кобрыншчына наша,
Радзімы дом з дзяцінства дарагі.
Край родны, слаўся! Горад Кобрын, слаўся!
Жыві і слаўся, Беларусь!

Нямала край любы кобрынскі зведаў
За доўгі свой век: і бяды, і нягод.
Цяпер ідзеш да мэты, мэты светлай, родны
Герб лікаў святых наш нябесны пакроў.

*Прыпеў:*

Квітней, квітней ты, Кобрыншчына наша,
Радзімы дом з дзяцінства дарагі.
Край родны, слаўся! Горад Кобрын, слаўся!
Жыві і слаўся, Беларусь!

Табе пашана й слава, слава людзям працы,
Што мірны дзень заўжды мацуюць наш.
Жывіце, слаўце людзі ў шчасці,
Дзяржавы моцнай шчодры край!

*Прыпеў:*

Квітней, квітней ты, Кобрыншчына наша,
Радзімы дом з дзяцінства дарагі.
Край родны, слаўся! Горад Кобрын, слаўся!
Жыві і слаўся, Беларусь!

# ГОРОД МОЙ

*Слова К. Давидюка и А. Кириевского*
*Музыка А. Кириевского*




Здесь я родился, и вырос здесь я.
Кобрин юность моя.
Город мой очень родной.
Стоишь ты над Мухавцем рекой

Город мой, ты святой.
Живи и славься, Кобрин мой!

Здесь православный герой наш жил,
Солдат Суворов учил
Как защищать честь и страну
И как любить Отчизну свою.

Город мой, ты герой-.
Живи и славься, Кобрин мой!

Живёт наш Кобрин семь веков.
Как в сказке море цветов.
Здесь царит дружба, мир и покой
Живи и славься, Кобрин мой!

Город мой очень родной.
Живи и слался Кобрин мой-

## КОБРИНЩИНА

*Слова и музыка Ю. Харевича*

На прекрасной земле, что зовётся святой Беларусью,
Свои плечи раскинул чудесный берёзовый край,
Старый Мухавец здесь провожает канал Днепробугский
И весною встречает всегда голоса птичьих стай.

*Припев:*
Кобринщина - это милая сторонка.
Знает страна о тебе, о твоей красоте.
В сердце весна, пусть летит эта песенка звонко,
Кобринщина в моём сердце всегда и везде.

Пережить приходилось тебе и лихие годины,
В лихолетиях войн страну от врага защищать.
Память вечно живёт, в сердце боль никогда не остынет
О погибших героях. Теперь мы за них будем жить.

*Припев:*
Кобринщина - это милая сторонка.
Знает страна о тебе, о твоей красоте.
В сердце весна, пусть летит эта песенка звонко,
Кобринщина в моём сердце всегда и везде.

Так живи, процветай, хорошей и людей своих радуй!
Мы поможем любовью тебе, мы поможем трудом.
Ты частичка прекрасной страны, чего нам ещё надо,
Милый кобринский край, наша Белая Русь, отчий дом.

*Припев:*

Кобринщина - это милая сторонка.
Знает страна о тебе, о твоей красоте.
В сердце весна, пусть летит эта песенка звонко,
Кобринщина в моём сердце всегда и везде.

## СОЛДАТЫ КОБРИНА

*Слова и музыка Ю. Харевича*

На чужой земле сложили головы,
Долг перед Отчизной выполняя,
Офицеры и солдаты Кобрина,
Я пред вами голову склоняю.
Отдают вам воинские почести,
Боль на сердце вечно не остынет,
Только матери-старушке хочется
На пороге дома встретить сына.

*Припев:*

Кобринчане, кобринчане!
Давайте вспомним земляков
И с минутою молчания
Пусть несётся средь веков:
«Тишина и нет войны!
В списки части вы навек занесены,
Кобринчане, кобринчане».
Но не высохнет слеза,
Горько плакать не устанут
Материнские глаза.
Тишина и нет войны,

Не вернутся моей Родины сыны.
Обелиск стоит в немом безмолвье,

Как немая память во времена,
Чтоб потомки навсегда запомнили,
Сколько бед несёт с собой война,
Чтоб раскаты боя не нарушили
Мирной тишины.
Ради мира, ради жизни лучшей
Вы сложили головы свои

*Припев:*
Кобринчане, кобринчане!
Давайте вспомним земляков
И с минутою молчания
Пусть несётся средь веков:
«Тишина и нет войны!
В списки части вы навек занесены,
Кобринчане, кобринчане».
Но не высохнет слеза,
Горько плакать не устанут
Материнские глаза.
Тишина и нет войны,
«В списки части вы навек занесены».

## СВЯТЫЙ НАПОМЫН
*(пiсня)*

*Словы М. Кiрылюк*

Куды б ты ны йшов, у якую б ны йхав дорогу
З собою на память святый напомын возьмы:
Запах рiдного бору, молiтву до нэба
I жмэньку свэi зэмлi.

На гэтуй зэмлі народывся колыся твій прадід,
На гэтуй зэмлыцы народылыся ты і я.
Хай жэ будэ выкамы вона бэрэжона
Гэта наша рідна зэмля.

І в сэрцы твоїім жыты надія на тое,
Шчо зможэм колыся вырнутыся знов туды,
Дэ твоїі корэні, і батькы, і родына,
Дубравы, поля і сады.

Дэ в дэнь і в ночі там про тэбэ усі спомынають
І молять святых, шчоб всюды хранылы тэбэ,
Часто бачать у снах воны тую стэжынку,
Шчо додому тэбэ прывэдэ.

## ГОРОДОК

*Слова и музыка В. Лукашук*

Городок мой, городок, ты лишь краешек земли,
Где июльский закат мою жизнь благословил.
Сколько минуло лет? Лишь столетья храня,
Как ты ждёшь перемен, мой провинциальный брат.

*Припев:*
Ивы у воды, спящие сады,
Розы от мороза - скованная проза.
И лебяжий пух в берегах реки,
Словно снег, не тает, облаком витая.

Довелось мне побывать на чужой, на стороне,
Где красот не сосчитать, где вольготно так душе.
Только чем объяснить, чем тоску оправдать,
Что из всех миражей мне дороже мираж...

*Припев:*

Ивы у воды, спящие сады,
Розы от мороза - скованная проза.
И лебяжий пух в берегах реки,
Словно снег, не тает, облаком витая.

Городок мой, городок, пусть ты краешек земли,
Где июльский закат мою жизнь благословил.
Сколько лет здесь живу и дышу лишь тобой.
Ты и в счастье, и в горе оставайся такой.

*Припев:*

Ивы у воды, спящие сады,
Розы от мороза - скованная проза.
И лебяжий пух в берегах реки,
Словно снег, не тает, облаком витая.

Довелось мне побывать на чужой, на стороне,
Где красот не сосчитать, где вольготно так душе.
Только чем объяснить, чем тоску оправдать,
Что из всех миражей мне дороже мираж...

## ТАМ, ЗА ЯРАМ

*(Песня)*

*Словы Н. Момлік*

Там, за ярам, ярам туманлівым,
Поле рунню свежай зіхаціць,
А над вёскай вераснем шчымлівым
Песня несціханая ляціць.

Тут бярозы косы заплятаюць
І святочны ладзяць карагод,
Бо гасцей прыветна сустракаюць
У залескім Рэвені штогод.

Да бярозкі роднай прыгарнуся,
Нібы да матулінай шчакі,
Незабыўным пахам наталюся,
Дзе было дзяцінства гаманкім.

Тут, у яры, у засені барвовай,
Цёплых успамінаў не злічыць,
А над вёскай часам вераснёвым
Песня несціханая гучыць.

## ДЕРЕВНЯ ХИДРЫ – РОДИНА МОЯ

*Слова Н. Ярмошука*

Бывало всяко: шёл я, ехал, мчался,
Летел, бывало, в разные края,
Но каждый раз к тебе я возвращался
Деревня Хидры, родина моя!

*Припев:*
Хидры, Хидры - мой родной порог!
Хидры, Хидры – чудный уголок!
Хидры, Хидры - волшебство в тиши.
Хидры - рай для сердца и души.

Я навешал всегда с такой охотой
До боли мной любимые места.
Да разве мог я променять на что-то
Речушку Бону, прудик у моста?

*Припев:*
Хидры, Хидры - мой родной порог!
Хидры, Хидры – чудный уголок!
Хидры, Хидры - волшебство в тиши.
Хидры - рай для сердца и души.

Товарищи колхозники, сельчане,
Я говорю за труд спасибо вам.
Не зря к себе так красотою манит
Спортивный комплекс, плавбассейн и храм.

*Припев:*

Хидры, Хидры - мой родной порог!
Хидры, Хидры – чудный уголок!
Хидры, Хидры - волшебство в тиши.
Хидры - рай для сердца и души.

Я думаю, что жизнь еще, наверное,
Меня забросит в дальние края,
Но ты со мной навек, моя деревня.
Деревня Хидры - родина моя.

*Припев:*

Хидры, Хидры - мой родной порог!
Хидры, Хидры – чудный уголок!
Хидры, Хидры - волшебство в тиши.
Хидры - рай для сердца и души.

# V. КОРАТКА ПРА АЎТАРАЎ



## БАГДАНОВІЧ АЛА



Нарадзілася ў г. Кобрыне. Выпускніца СШ № 6 г. Кобрына. Закончыла Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт, факультэт замежных моў. Пасля ўніверсітэта тры гады працавала настаўнікам англійскай мовы ў СШ № 9 г. Кобрына, потым у гімназіі і Барысаўскай пачатковай школе. Зараз працуе ў гімназіі г. Гродна. Піша вершы на беларускай, рускай, англійскай мовах. Член народнага аматарскага аб'яднання «Белы бусел».

## БАЛАНОВІЧ ТАЦЦЯНА

Выпускніца СШ № 9 г. Кобрына. Верш «Мой горад» надрукаваны ў зборніку лепшых твораў кобрынскіх школьнікаў «Белыя ветразі крылаў», які выдадзены ўпраўленнем адукацыі Кобрынскага райвыканкама (2009).

## БАЛАХОЎСКАЯ ГАЛІНА



Працавала настаўніцай беларускай мовы і літаратуры. Паэзія зацікавіла яе яшчэ ў школьныя гады. Друкавалася ў газетах «Слуцкі край», «Настаўніцкая газета», «Мінская праўда», «Кобрынскі веснік», у чатырох паэтычных зборніках. Выдадзены зборнік «Прагне душа чысціні». На яе вершы напісана больш 30 песен. Член народнага аматарскага аб'яднання «Белы бусел».

## БАРЫСЮК АНТОН

Нарадзіўся ў в. Корчыцы. Верш «Мая вёска» надрукаваны ў зборніку лепшых твораў кобрынскіх школьнікаў «Белыя ветразі крылаў», які выдадзены ўпраўленнем адукацыі Кобрынскага райвыканкама (2009).

## БАРЫСЮК ВАСІЛІЙ



Нарадзіўся ў 1976 г. у в. Малыя Корчыцы Кобрынскага раёна. У 1998 г. закончыў філалагічны факультэт Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна. Працуе ў тэлерадыёкампаніі «Брэст», на радыё. Вершы друкаваліся ў абласных і рэспубліканскіх перыядычных выданнях, штотыднёвіку «Літаратура і мастацтва», часопісах «Першацвет», «Маладосць», «Дзеяслоў», а таксама ў шэрагу калектыўных выданняў: «Берасцейскія карані», «Дзядзінец», «Анталогія маладога верша», «Жырандоля» і інш.

## БЛАХІНА ЗОЯ

Працуе настаўнікам рускай мовы і літаратуры ДУА «Сярэдняя школа № 8 г. Кобрына».

## ВАЛАСЮК ЛЯВОН



Нарадзіўся ў 1955 г. у в. Песцянькі Кобрынскага раёна. У 1973 г. закончыў сярэднюю школу № 16 г. Брэста, у 1981 г. - архітэтурны факультэт Брэсцкага інжынерна-будаўнічага інстытута. Пасля школьных і інстытуцкіх «універсітэтаў» працаваў у розных месцах, але заўсёды яго занятак быў звязаны з маляваннем. Лявон Валасюк - прафесійны мастак-дызайнер. Вершы піша са школьных гадоў. У творчым багажы Л. Валасюка шмат паэтычных зборнікаў. Член грамадскай арганізацыі «Беларускі саюз мастакоў» (2000) і Саюза беларускіх пісьменнікаў (2007).

## ГАЛАВАНАВА НАТАЛЛЯ



Нарадзілася ў г. Новасібірску ў 1955 г. З дзяцінства марыла займацца жывапісам, а зараз малюе навакольны свет у вершах. Выдадзена больш дзесяці аўтарскіх зборнікаў вершаў. Тэматыка вершаў разнастайная. Член народнага аматарскага аб’яднання «Белы бусел».

## ГАЛАВАНАЎ ПЁТР



Нарадзіўся ў 1956 г. у Сібіры, у Томскай вобласці. Пасля службы ва Узброеных сілах вучыўся ў лётным вучылішчы грамадзянскай авіяцыі, доўгі час працаваў пілотам. Закончыў Новасібірскі інстытут народнай гаспадаркі, у далейшым служыў у органах унутраных спраў. Пенсіянер, падпалкоўнік міліцыі ў адстаўцы.

## ГАНЬКО ГЕНАДЗІЙ



Нарадзіўся ў 1959 г. у г. Смаленску ў сям’і ваеннаслужачага. Закончыў сярэднюю школу ў Кобрыне. Вучыўся ў Брэсцкім дзяржаўным універсітэце імя А. С. Пушкіна. Працаваў настаўнікам матэматыкі ў Камянецкай школе, начальнікам участку на Брэсцкім УП «Вертэкс-Брэст», ГА «БелТІЗ». Захапіўся паэзіяй з 2000 г.

## ГЛУШКО ЛЕАНІД



Нарадзіўся ў 1940 года ў в. Курыцічы Петрыкаўскага раёна Гомельскай вобласці. Пасля вайны апынуўся ў в. Дубай Столінскага раёна Брэсцкай вобласці, дзе закончыў дзесяцігодку. Вучыўся ў Краснадонскім шахцёрскім вучылішчы. Працаваў у шахце, адначасова займаўся ў завочным народным універсітэце мастацтваў у Маскве. Пасля вайсковай службы спрабаваў сябе ў журналістыцы, выкладаў урокі чарчэння і малявання, працаваў мастаком-афарміцелем. З 1969 г. жыве ў Кобрыне. Паэтам напісана больш за 1000 вершаў. У 2000 г. выйшаў зборнік вершаў Л. Глушко «А я веру».

## ДЗЕХЦЯРУК УЛАДЗІМІР



Дзеяч беларускай дыяспары ў Эстоніі. Нарадзіўся ў 1953 г. у в. Павіцце. Закончыў Брэсцкі чыгуначны тэхнікум, Беларускі інстытут інжынераў чыгуначнага транспарту. Працаваў у Эстоніі на вытворчым аб'яднанні «Эстонсланец». У 1989 г. стварыў у г. Кохтла-Ярве Беларуска-эстонскае згуртаванне. Доўгі час удзельнічаў у падрыхтоўцы радыёперадач на хвалях «Бацькаўшчыны» для беларусаў Эстоніі, быў дэлегатам З’езда беларусаў блізкага замежжа, арганізоўваў веласіпедныя вандроўкі з Эстоніі ў Беларусь. Аўтар зборніка вершаў і апавяданняў «Сярод белых эстонскіх начэй» (1995), кніг «Трылабітавы бераг» (1999), «Кроплі лёсу» (2000), «Повіць, абшары, людзі, час» (2005).

## ДРЫК НІНА



Нарадзілася ў 1962 г. у в. Балоты Кобрынскага раёна. Закончыла Балоцкую сярэднюю школу, філалагічны факультэт Брэсцкага педагагічнага іститута імя А. С. Пушкіна «па спецыяльнасці беларуская мова і літаратура». Сваю педагагічную дзейнасць пачала ў СШ № 5 г. Кобрына, потым - СШ № 1 г. Кобрына. Зараз намеснік загадчыка вучэбна-метадычнага кабінета аддзела адукацыі

адміністрацыі Маскоўскага раёна г. Брэста. Вершы друкаваліся ў газетах: «Кобрынскі веснік», «Заря», «Народная трыбуна», «Чырвоная змена», «Настаўніцкая газета»; у часопісах «Першацвет», «Гоман», «Маладосць». У 2016 г. выдадзены зборнік вершаў Н. Дрык «Хата з душою мамы».

## ЖАРЫН ВЕРА



Нарадзілася ў 1951 г. у в. Ляхчыцы Кобрынскага раёна. Закончыла Пружанскі саўгас-тэхнікум. Працавала брыгадзірам паляводчай брыгады ў калгасе імя Кутузава. За працу была ўзнагароджана Ганаровай граматай ЦК камсамола Беларусі. Цяпер ветэран працы, на заслужаным адпачынку. Член народнага аматарскага аб’яднання «Белы бусел».

## ЖУК ЛІДЗІЯ



Нарадзілася ў 1946 г. у в. Поланск Пружанскага раёна Брэсцкай вобласці. Закончыла гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўнівератэта імя У. І. Леніна. Працавала настаўніцай у школах Кобрынскага раёна, намеснікам дырэктара па вучэбна-выхаваўчай рабоце Кобрынскага дзяржаўнага прафесіянальнага ліцэя сферы абслугоўвання.

## ІГНАЦЮК МАРЫЯ



Нарадзілася ў 1957 г. у в. Верхалессе Кобрынскага раёна. Пасля заканчэння школы атрымала спецыяльнасць мастака-афарміцеля. Закончыла мастацкае вучылішча, затым - мастацка-графічны факультэт Віцебскага педагагічнага інстытута. З 1977 г. жыве ў Кобрыне. Працавала кіраўніком гурткоў у цэнтры дзіцячай творчасці. Член народнага аматарскага аб’яднання «Белы бусел». Яе вершы ўвайшлі у тры калектыўныя зборнікі гэтага аб’яднання.

## КАМІСАРУК СОФ’Я



Нарадзілася ў 1939 г. Усё жыццё пражыла ў в. Хабовічы, працавала загадчыкам комплекснага прыёмнага пункта. Пісаць вершы пачала ў 1988 г. Член народнага аматарскага аб’яднання «Белы бусел». Яе вершы ўвайшлі ў два калектыўныя зборнікі гэтага аб’яднання.

## КАНДРАШУК НАТАЛЛЯ



Нарадзілася ў 1973 г. у в. Камянюкі Камянецкага раёна Брэсцкай вобласці. У 1990 г. закончыла Камянюкскую сярэднюю школу, у 1997 г. - Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт. З 2003 г. змяніла педагагічную сферу на журналісцкую, з 2016 г. - выдавец. Вершы пачала пісаць у 11 гадоў, з 14 - публікуецца ў розных друкаваных выданнях раённага, абласнога і рэспубліканскага ўзроўню. Паэтычныя творы ўвайшлі ў восем калектыўных зборнікаў, празаічныя - у тры. У 2010 г. выйшла кніга вершаў на рускай мове «Зимний букет». Член Міжнароднага саюза пісьменнікаў «Новы сучаснік» з 2010 г.

## КІРЫЛЮК МАРЫЯ



Нарадзілася ў 1940 г. у в. Бельск Кобрынскага раёна. Жыве ў в. Камень, дзе стварыла фальклорную групу. Педагог, паэт. Пераняла ад маці ўменне выпякаць вясельныя караваі, ткаць, вышываць і складаць вершы, казкі і прыпеўкі. Выданне ў 2016 г. кнігі польска-беларускіх творцаў З. Майстровіч і М. Кірылюк «Вершы. Казкі. Запіскі» стала сапраўднай скарбонкай народнай мудрасці, бацькоўскай спадчыны і роднай мовы.

## КІРЫЛЮК НАТАЛІ



Нарадзілася ў 1990 годзе ў г. Кобрыне. Закончыла агульнаадукацыйную і музычную школу. Яе вершы ўвайшлі ў калектыўны зборнік «Вдохновение» аматарскага аб’яднання «Белы бусел».

## КЛАЧКОВІЧ ВАЛЯНЦІНА



Нарадзілася ў 1954 г. у в. Попіна Драгічынскага раёна Брэсцкай вобласці. У 1975 г. пераехала ў г. Кобрын, дзе звыш 30 гадоў працавала на Кобрынскай ткацкай фабрыцы. Член народнага аматарскага аб'яднання «Белы бусел». Яе вершы ўвайшлі ў чатыры калектыўныя зборнікі аматарскага аб'яднання «Белы бусел». Выдадзены аўтарскі зборнік вершаў «Ляці, мая песня».

## ЛАЗАРЧУК ВАСІЛІЙ



Нарадзіўся ў 1912 г. у в. Руховічы Кобрынскага павета. У сваёй вёсцы В. Лазарчук быў сябрам «Прасвіты». Пасля Навасёлкаўскага паўстання ў 1933 г. арыштаваны польскімі ўладамі. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, узнагароджаны ордэнам «Айчынная вайна». Вершы самабытнага паэта прасякнуты любоўю да сваёй вёскі, свайго народа, прыроды. Пісаў на мясцовым дыялекце. Памёр у 1997 г.

## ЛАЗЮК ЛЮДМІЛА



Нарадзілася ў 1948 г. у г. Кобрыне. Пасля заканчэння Брэсцкага педагагічнага інстытута імя А. С. Пушкіна пачала працоўную дзейнасць у СШ № 1 г. Кобрына на пасадзе настаўніка рускай мовы і літаратуры, затым намесніка дырэктара школы па вучэбна-выхаваўчай рабоце. Настаўнік вышэйшай катэгорыі. З 2010 г. – кіраўнік літаратурнага аб'яднання «Белы бусел», вядзе школу паэтычнага майстэрства, з'яўляецца складальнікам, рэдактарам і адным з аўтараў чатырох калектыўных зборнікаў вершаў і прозы. За час яе працы аб'яднанню прысвоена званне «народны». У 2016 г. матэрыял пра Лазюк Л. І. змешчаны ў энцыклапедычным выданні «Кто есть кто в Республике Беларусь».

## ЛІТОШЫК ВАЛЯНЦІНА



Нарадзілася ў 1947 г. у Днепрапятроўскай вобласці (Украіна). Закончыла Новасібірскі інстытут інжынераў чыгуначнага транспарту. Працавала начальнікам Кобрынскага гарадскога аддзела фонду сацыяльнай абароны насельніцтва. Вершы пачала пісаць пасля выхаду на пенсію. Кнігі «Чудесные друзья» і «Работящие кроты» прадстаўлялі Рэспубліку Беларусь на XX Міжнароднай кніжнай выставе. Член народнага аматарскага аб'яднання «Белы бусел». Яе вершы ўвайшлі ў чатыры калектыўныя зборнікі аматарскага аб’яднання «Белы бусел».

## ЛУКАШУК ВІКТОРЫЯ



Нарадзілася ў 1970 г. у г. Кобрыне. Вядома кабрынчанам як спявачка, аўтар-выканаўца песень, майстар лозапляцення. Закончыла Кобрынскі мастацкі прафесіянальна-тэхнічны каледж. Працуе ў гарадскім Дварцы культуры кіраўніком народнага аматарскага аб'яднання выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнага мастацтва «Галерэя «Бона Сфорца» і мастаком-пастаноўшчыкам узорнай тэатральнай студыі «Рытм». Вершы і песні ўвайшлі ў калектыўныя зборнікі «Белага бусла» і зборнік вершаў «И вдруг слова стихами закружились», выдадзены Брэсцкім абласным культурным цэнтрам.

## МОМЛІК НАДЗЕЯ



Нарадзілася ў в. Залессе Тэвельскага сельскага савета Кобрынскага раёна. Закончыла Рынкаўскую сярэднюю школу, Брэсцкі педагагічны інстытут імя А. С. Пушкіна. Першыя педагагічныя крокі рабіла ў Дзівінскай школе-інтэрнаце, працавала піянерважатай, выхавацелем, настаўніцай пачатковых класаў, намеснікам дырэктара па пачатковых класах Дзівінскай сярэдняй школы. Выдадзены яе паэтычныя зборнікі «Прызнанне» (2015), «Арабінавы смак» (2017), «Сцяжынай запаветнаю іду» (2018), «Тут дзяцінства жыло» (на мясцовым дыялекце, 2018).

## НАВАСАД ЗІНАІДА



Нарадзілася ў 1951 г. у в. Залессе Драгічынскага раёна Брэсцкай вобласці. Закончыла філалагічнае аддзяленне Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. З 1977 г. па 1997 г. служыла ў органах МУС, капітан міліцыі. Вершы пачала пісаць яшчэ ў школьныя гады. У 1995 г. у газеце МУС РБ «На страже» апублікаваны яе першыя вершы. У 2014 г. выдадзены зборнік паэзіі «Благослави…».

## НІЖНІК ІГАР



Нарадзіўся ў 1995 г. у Кобрыне. Выпускнік СШ № 7 г. Кобрына. Пасля заканчэння ў 2017 г. Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна працуе выкладчыкам матэматыкі і інфарматыкі ў Варанілавіцкім дзіцячым садзе - СШ Пружанскага раёна. Вершы пачаў пісаць у 11 гадоў. Яго творы публікаваліся ў раённых і абласных газетах, у зборніку лепшых твораў кобрынскіх школьнікаў «Белыя ветразі крылаў» (2009). «Берег надежды» (2012), выдадзеных упраўленнем адукацыі Кобрынскага райвыканкама, а таксама ўвайшлі ў літаратурны альманах «Лірычны настрой». Двойчы станавіўся прызёрам раённага паэтычнага конкурсу, а ў 2010 г. заняў І месца ў абласным конкурсе маладзёжнай паэзіі.

## НЯВЕСЦЕНКА ВАСІЛІЙ



Нарадзіўся ў 1947 г. у в. Старыя Пескі Бярозаўскага раёна Брэсцкай вобласці. У 1965 г. паступіў у Выбаргскае авіяцыйна-тэхнічнае вучылішча грамадзянскай авіяцыі. У 1968 г. накіраваны на працу авіяцыйным механікам у Дагестанскую АССР. Далей - ваенная кар'ера, шматлікія камандзіроўкі. Працаваў у Кобрынскім ваенкамаце галоўным спецыялістам. Мае шмат узнагарод. Падпалкоўнік запасу. Член народнага аматарскага аб'яднання «Белы бусел». Яго вершы ўвайшлі ў тры калектыўныя зборнікі аматарскага аб’яднання «Белы бусел». Выдадзены пяць аўтарскіх зборнікаў.

## ПІВАВАРАВА ЮЛІЯ



Нарадзілася ў 1974 г. у в. Дзівін Кобрынскага раёна. Закончыла ПТВ народных мастацкіх промыслаў № 105 г. Кобрына (спецыяльнасць «інкрустатар саломкай па дрэве»). Завочна вучылася ў Брэсцкім дзяржаўным педагагічным універсітэце імя А. С. Пушкіна. З’яуляецца членам Беларускага саюза майстроў народнай творчасці ў галіне саломапляцення, лаўрэатам шматлікіх конкурсаў. Першы верш быў надрукаваны ў раённай газеце ў 1992 г. Узнагароджана дыпломам як пераможца рэспубліканскага літаратурнага конкурса маладых талентаў «Дэбют». Акрамя вершаў, піша песні. Член народнага аматарскага аб'яднання «Белы бусел».

## ПУЧЫК НІНА



Нарадзілася ў 1952 г. у в. Ляскова Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці ў сялянскай сям'і. Вучылася ў Бярозаўскай васьмігодцы, СШ № 2 г. Кобрына. У 1975 г. закончыла філалагічны факультэт Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна па спецыянальсці «беларуская мова». Працавала ў Стрыгаўскай сярэдняй школе піянерважатай, настаўнікам беларускай мовы і літаратуры, намеснікам дырэктара па вучэбна-выхаваўчай рабоце. Вершы пачала пісаць яшчэ ў школьныя гады. Друкуецца ў газетах «Кобрынскі веснік», «Заря».

## САБЧУК ГАННА



Нарадзілася ў 1985 г. у г. Кобрыне. Вучылася ў музычнай школе. У 2007 г. закончыла філалагічны факультэт Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна. Працуе настаўніцай рускай мовы і літаратуры ў СШ № 1 г. Кобрына. Член народнага аматарскага аб’яднання «Белы бусел». Яе вершы ўвайшлі ў два калектыўныя зборнікі аматарскага аб’яднання «Белы бусел».

## САЦУК ТАЦЦЯНА



Нарадзілася ў 1970 г. у г. Кобрыне. Выпускніца СШ № 5 г. Кобрына. Закончыла Мінскі політэхнічны тэхнікум. З 1992 г. працавала зменным інжынерам у кінатэатры г. Кобрына, з 1999 г. працуе ў Брэстаблсаюздруку. Піша вершы, навелы, апавяданні на беларускай і рускай мовах. Член народнага аматарскага аб’яднання «Белы бусел».

## САЦУТА НАТАЛЛЯ



Нарадзілася ў 1976 г. у в. Гутава Драгічынскага раёна Брэсцкай вобласці. Дзіцячыя і юнацкія гады прайшлі ў в. Хабовічы Кобрынскага раёна. Атрымала вышэйшую адукацыю па спецыяльнасці «Настаўнік пачатковых класаў». Працавала настаўнікам, затым выхавальнікам дзіцячага яслі-сада № 13 г. Кобрына. Піша вершы як на рускай, так і на беларускай мовах. Тэматыка вершаў разнастайная: аб прыродзе, каханні, вершы для дзяцей, гумарыстычныя вершы. Член народнага аматарскага аб’яднання «Белы бусел». Друкуецца ў альманахах «Жырандоля», «Справа». Выдадзены два аўтарскія зборнікі вершаў.

## СІДАРУК АНЖАЛІКА

Выпускніца Батчынскай сярэдняй школы. Верш «В моём городе осень, туман, листопад» надрукаваны ў зборніку лепшых твораў кобрынскіх школьнікаў «Белыя ветразі крылаў», якія выдадзены ўпраўленнем адукацыі Кобрынскага райвыканкама (2009).

## СКРАШЧУК АЛЯКСАНДР



Нарадзіўся ў 1957 г. у в. Дзівін Кобрынскага раёна. Закончыў Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт. Пражывае ў г. Віцебску.

## СУШКО ЭМІЛІЯ



Нарадзілася ў 1969 г. у г. Кобрыне. Вучылася ў СШ № 7 г. Кобрына, музычнай школе. Закончыла Пінскае педагагічнае вучылішча імя А. С. Пушкіна. Працавала настаўніцай пачатковых класаў у СШ № 8 г. Кобрына. У 1993 г. закончыла Брэсцкі дзяржаўны педагагічны інстытут па спецыяльнасці «педагогіка і методыка пачатковага навучання», атрымала кваліфікацыю «Практычны псіхолаг ва ўстановах адукацыі». Працавала педагогам-псіхолагам ў СШ № 6 г. Кобрына. З'яўляецца лектарам таварыства «Веды». У 2007 г. закончыла аспірантуру РІВШ (г. Мінск). Яе вершы ўвайшлі ў калектыўны зборнік «Вдохновение» аматарскага аб'яднання «Белы бусел».

**ФАЛЬКОЎСКІ ДЗМІТРЫЙ** *(1898–1934)* (сапраўднае



прозвішча – Ляўчук). Нарадзіўся ў 1898 г. у в. Вялікія Лепясы Кобрынскага павета Гродзенскай губерніі. Пачатковую адукацыю атрымаў у Кобрынскім гарадскім вучылішчы, з 1912 г. вучыўся ў Брэст-Літоўскай гімназіі. У 1918 г. ён становіцца адным з кіраўнікоў падпольнай ячэйкі РКП(б), партызанскага атрада. З 1923 г. жыве ў Кіеве, у гэтым горадзе і адбылося станаўленне Фалькоўскага як паэта. Так склаўся лёс паэта, што ён мала жыў у родных мясцінах: паехаў з Лепясоў юнаком, жыў і пісаў на Украіне, на ўкраінскай мове. Але ў думках ён заўсёды быў з родным краем, перажываў расставанне з малой радзімай, што выказваў у сваіх вершах. Друкавацца пачаў з 1924 г., пісаў вершы на заходнепалескім дыялекце. Расстраляны ў 1934 г., рэабілітаваны ў 1957 г. Адна з вуліц в. Лепясы носіць імя Дзмітрыя Фалькоўскага. У 1998 г. на радзіме Фалькоўскага ўстаноўлены помнік паэту і мемарыяльны знак.

## ХАРЭВІЧ ЮРЫЙ



Нарадзіўся ў 1966 г. у г. Кобрыне. Вучыўся ў СШ № 5 г. Кобрына. Пасля заканчэння школы паступіў у Пермскае авіяцыйна-тэхнічнае вучылішча імя Ленінскага камсамола. Праходзіў службу на далёкаўсходніх рубяжах СССР. Падчас праходжання службы вучыўся ў педагагічным універсітэце ў г. Благавешчанску, а затым у г. Камсамольск-на-Амуры. У 1998 г. звольнены ў запас і вярнуўся ў родны горад Кобрын. У мінулым кадравы афіцэр, сёння - будаўнік-паэт. Піша вершы, песні. Член народнага аматарскага аб’яднання «Белы бусел». Яго вершы ўвайшлі ў два калектыўныя зборнікі аматарскага аб’яднання «Белы бусел».

**ЦЯЛІЧКА МІКАЛАЙ** *(1923-2014).* Нарадзіўся ў 1923 г. на



хутары Аляксееўшчына Казялецкага раёна Чарнігаўскай вобласці. У 1942 г. закончыў ваеннае вучылішча ў Краснадары, назначаны камандзірам узвода. Удзельнічаў у баях на многіх франтах, у т. л. на II і III Беларускіх. З 1947 г. жыў на Брэстчыне, настаўнічаў у Кобрыне. Завочна закончыў філалагічны факультэт Брэсцкага педагагічнага інстытута імя А. С. Пушкіна, працаваў загадчыкам раённага аддзела народнай адукацыі Кобрынскага раёна. У 1953-1966 гг. быў дырэктарам Кобрынскай школы-інтэрната для дзяцей з парушэннямі слыху, завочна атрымаў спецыяльнасць лагапеда ў Маскоўскім педагагічным інстытуце. Затым пераехаў у Брэст, працаваў лагапедам у СШ № 16 г. Брэста. Выдатнік народнай адукацыі БССР. Аўтар паэтычных кніг на рускай мове «Добрый ливень» (1963), «Дерево в бору» (1971), «Вещий свет» (1980), «Соль на касках» (1994), «Следы времён» (1994), «Рубежи сорок первого» (2002), «Стихи из полевой сумки» (2003), «Что написано пером» (2011), а таксама зборнікаў на ўкраінскай мове. У 2008 г. прыняты ў Саюз беларускіх пісьменнікаў. У 1990-я гады пераехаў да дачкі ў Кіеў. Памёр у 2014 г., пахаваны на Гарнізонных могілках г. Брэста.

## ЦЯРЭНЦЬЕВА НАТАЛЛЯ



Нарадзілася ў 1973 г. у г. Гродна. У 1994 г. закончыла СШ № 4 г. Кобрына, паступіла ў Пінскае медыцынскае вучылішча на акушэрскае аддзяленне. Пасля заканчэння вучылішча накіравана на працу ў Кобрынскі радзільны дом. Сёння працуе медыцынскай сястрой. Член народнага аматарскага аб'яднання «Белы бусел». Лаўрэат шматлікіх паэтычных конкурсаў. Яе вершы ўвайшлі ў чатыры калектыўныя зборнікі аматарскага аб'яднання «Белы бусел». Выдадзены аўтарскі зборнік вершаў «Открываю мыслями небо…».

## ЧАЙНІКАЎ МІХАІЛ



Нарадзіўся ў 1954 г. у г. Кобрыне. Сярэднюю адукацыю атрымаў у СШ № 5. Паступіў у Ленінградскі педыятрычны інстытут, скончыў 4 курса. Працаваў слесарам, грузчыкам, фельчарам. Пасля заканчэння Брэсцкага педагагічнага інстытута імя А. С. Пушкіна выкладаў рускую мову і літаратуру. Пісаць вершы пачаў падчас вайсковай службы. Друкаваўся ў шэрагу раённых і шматтыражных газет Брэсцкай вобласці. Некалькі вершаў пакладзены на музыку. Член народнага аматарскага аб'яднання «Белы бусел». Яго вершы ўвайшлі ў тры калектыўныя зборнікі аматарскага аб'яднання «Белы бусел». Выдадзены аўтарскія зборнікі вершаў.

## ШАФРАНСКАЯ КСЕНІЯ

Выпускніца СШ № 4 г. Кобрына. Верш «На прасторах зямлі беларускай» надрукаваны ў зборніку лепшых твораў кобрынскіх школьнікаў «Белыя ветразі крылаў», які выдадзены ўпраўленнем адукацыі Кобрынскага райвыканкама (2009).

## ЯРМАЛЮК ЛЮДМІЛА



Нарадзілася ў 1977 г. у в. Лелікава Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці. Закончыла Пінскае педагагічнае вучылішча і Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна. Працуе ў рэдакцыі газеты «Кобрынскі веснік». Вершы пачала пісаць у 11 гадоў. Друкавалася на старонках газет «Піянер Беларусі», «Кобрынскі веснік», «Заря», часопіса «Першацвет». У апошні час працуе над празаічнымі творамі малых формаў. Піша пераважна на беларускай мове. Член народнага аматарскага аб'яднання «Белы бусел». Яе вершы ўвайшлі ў тры калектыўныя зборнікі аматарскага аб'яднання «Белы бусел», у зборнік абласнога культурнага цэнтра «И вдруг слова стихами закружились».

## ЯРМАШУК МІКАЛАЙ



Ураджэнец в. Хідры Кобрынскага раёна. Закончыў Гродзенскі дзяржаўны каледж мастацтваў, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў. Працаваў акцёрам у Брэсцкім тэатры лялек, потым у Кобрынскім доме культуры кіраваў дзіцячай узорнай тэатральнай студыяй «Рейтинг 77». Праводзіў гарадскія канцэрты, арганізоўваў тэатралізаваныя прадстаўленні. Піша вершы, песні. Неаднаразова друкаваўся ў газетах «Вечерний Минск», «Заря», «Камуністычная праца» («Кобрынскі веснік»), у часопісу «Бярозка».

# ІМЯННЫ ПАКАЗАЛЬНІК


| | |
|---|---|
| Багдановіч Ала | 7, 205 |
| Балановіч Таццяна | 9, 205 |
| Балахоўская Галіна | 9, 206 |
| Барысюк Антон | 10, 206 |
| Барысюк Васілій | 10, 206 |
| Беразюк Нікіфар | 12 |
| Блахіна Зоя | 13, 206 |
| Валасюк Лявон | 14, 207 |
| Галаванава Наталля | 20, 207 |
| Галаванаў Пётр | 25, 207 |
| Ганько Генадзій | 26, 207 |
| Глушко Леанід | 27, 195-196, 208 |
| Давідзюк Канстанцін | 197-198 |
| Давідзюк Юрый | 5 |
| Дзехцярук Уладзімір | 39, 208 |
| Дрык Ніна | 41, 208 |
| Дубоўка Уладзімір | 118 |
| Дудзюк Зінаіда | 119 |
| Жарын Вера | 46, 209 |
| Жук Лідзія | 48, 209 |
| Ігнацюк Марыя | 50, 209 |
| Камісарук Соф’я | 52, 210 |
| Кандрашук Наталля | 54, 210 |
| Кірыеўскі Аляксей | 193,193-194,197-198 |
| Кірылюк Людміла | 5 |
| Кірылюк Марыя | 55, 200-201, 210 |
| Кірылюк Наталі | 58, 210 |
| Клачковіч Валянціна | 59, 211 |
| Лазарчук Васілій | 65, 211 |
| Лазюк Людміла | 66, 211 |
| Літошык Валянціна | 67, 212 |
| Лукашук Вікторыя | 70, 201-202, 212 |

| | |
|---|---|
| Люлькоўская Алена | 71 |
| Момлік Надзея | 73, 202,-203, 212 |
| Навасад Зінаіда | 92, 213 |
| Ніжнік Ігар | 96, 213 |
| Нявесценка Васілій | 97, 213 |
| Пазнякоў Міхаіл | 181 |
| Піваварава Юлія | 98, 214 |
| Пучык Ніна | 99, 214 |
| Сабчук Ганна | 102, 214 |
| Салей Іна | 104 |
| Сацук Алесь | 104 |
| Сацук Таццяна | 105, 215 |
| Сацута Наталля | 106, 215 |
| Сідарук Анжаліка | 107, 215 |
| Сікачова Вольга | 195-196 |
| Скрашчук Аляксандр | 107, 215 |
| Слабуха Аляксей | 108 |
| Сушко Эмілія | 110, 216 |
| Таболіч Адам | 182 |
| Таўлай Валянцін | 184 |
| Фалькоўскі Дзмітрый | 110, 216 |
| Харэвіч Юрый | 198-200, 217 |
| Цялічка Мікалай | 113, 206-207, 217 |
| Цярэнцьева Наталля | 113, 207, 218 |
| Чайнікаў Міхаіл | 115, 207-208, 218 |
| Чапураў Анатолій | 187 |
| Чэрнік Ігар | 189-190 |
| Шафранская Ксенія | 116, 218 |
| Шыбут Анатолій | 191-192 |
| Ярмалюк Людміла | 116, 208, 219 |
| Ярмашук Мікалай | 117, 191-192, 193-194, 203-204, 219 |

# СПІС КРЫНІЦ

**Валасюк, Л.** Знакі на валуне : выбранае. Новыя вершы / Лявон Валасюк. – Брэст : ААТ «Брэсцкая друкарня», 2010. – 120 с. .

**Вдохновение** : сборник прозы и лирики Кобринщины / сост. Т. Н. Садовничек — Брест : Альтернатива, 2010. — Вып. 1. - 336 с. – (Литературно-поэтическое объединение «Белый аист»).

**Глушко, Л.** А я веру… : вершы / Леанід Глушко. – Брэст, 2000. – 74 с.

**Голованова, Н.** Родные для сердца картины : сборник стихов / Н. Голованова. - Кобрин : ИП Волосюк, 2008. - 111с.

**Дрык, Н. С.** Хата з душою мамы : зборнік вершаў / Ніна Дрык. – Брэст : «Альтернатива, 2016. – 64 с.

**Зямля** бацькоў дае натхненне : вершы / Народнае аматарскае аб'яднанне «Белый аист». – Кобрын : Палац культуры, 2017. – 76 с.

**І будзе** слова землякоў гучаць над роднаю старонкай : тэматычны зборнік вершаў мясцовых паэтаў / Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка ; склад. Святлана Курчук, Таццяна Галавейка. – Кобрын, 2009. – 16 с.

**Лірычны** настрой : літаратурны альманах / уклад. Н. П. Ефціфеева. – Кобрын : Ефціфеева Н. П., 2017. – Вып. 1. – 80 с.

**Майстровіч, З.** Вершы. Казкі. Запіскі / Зоя Майстровіч, *Марыя Кірылюк*. – Музей малой Бацькаўшчыны ў Студзіводах, 2016. – 159 с.

**Момлік, Н.** Арабінавы смак : вершы / Надзея Момлік. – Кобрын : ИП Ефтифеева Н. П., 2017. – 176 с.

**Под крылом** «Белого аиста» : К 10-летию народного любительского объединения «Белый аист» : сборник стихов / сост. и редактор Л. И. Лазюк. – Кобрин, 2015. – 121 с.

**Свет** Великой Победы : стихи и песни поэтов народного любительского объединения «Белый аист» о Великой Отечественной войне. – Кобрин, 2015. – 44 с.

**Фальківський, Д**. Поезії / Дмитро Фальківський. – Київ : Рад. письменник, 1989. – 175 с. – (Б-ка поета).

# ЗМЕСТ


**Прадмова** 3

I. **Гімн Кобрынскага раёна** 5

II. **Малая радзіма – вялікая любоў:** вершы землякоў, прысвечаныя Кобрыншчыне 7

III. **Унікальны куток беларускай зямлі** 118

IV. **Кобрыншчыне роднай песні прысвячаем** 189

V. **Коратка аб аўтарах** 205

VI. **Імянны паказальнік** 220

**Спіс крыніц** 222

# Свой родны край
# у вершах славім

*Зборнік вершаў і песень*

***Складальнік:***
*Курачук С. Д.* - галоўны бібліёграф
аддзела абслугоўвання і інфармацыі
цэнтральнай раённай бібліятэкі
ДУК «Кобрынская раённая цэнтралізаваная
бібліятэчная сістэма»

225306 вул. Маршала Жукава, 12, г. Кобрын
Цэнтральная раённая бібліятэка
E-mail kobrinlib@gmail.com
www.krcls.by